Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Б Е Л А Р У С К А Я Г А З Е Т А

21 САКАВІКА 2007 г.
СЕРАДА

№ 53 (25918)

Кошт 400 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Твае правы

ПАРУШЫЎ — ЗНАЧЫЦЬ... НЕ ЗВОЛЬНІЎ

Далёка не самыя высокія заробкі, больш складаныя ўмовы працы, а таксама — меншыя магчымасці для ўладкавання ў іншых месцах. Не сакрэт, што падобныя «асаблівасці» першнаперш датычацца сельскай гаспадаркі. Таму невыпадкова, што па колькасці пытанняў наконт працоўнага заканадаўства менавіта вяскоўцы традыцыйна знаходзяцца ў «лідарах». Звальненні і перапрацоўкі, прызначэнні пенсіі і варыянты «адгулаў» па дамоўленасці з наймальнікам для работы на ўласным падворку — усё гэта сталася ці не асноўнай тэмай «выязной прыёмнай», што была праведзена днямі ў Смаргонскім раёне спецыялістамі Дэпартамента дзяржаўнай інспекцыі працы Міністэрства працы і сацыяльнай абароны.

Зважай на... працэдуру

Ці можа прыняць праўленне сельгаскааператыва рашэнне аб скарачэнні работніка, які знаходзіцца ў водпуску? З пункту гледжання працоўнага заканадаўства, адказ тут адназначны — не. Адпаведнае паведамленне выдаецца толькі пасля выхаду на работу. Аднак папярэджанне падчас працоўнага водпуску — толькі адно з «папулярных» у дадзеным выпадку парушэнняў. На жаль, ёсць і іншыя.

— Варта адразу падкрэсліць, што само па сабе рашэнне аб скарачэнні работніка з'яўляецца поўным правам наймальніка, — кажа намеснік дырэктара Дэпартамента дзяржаўнай інспекцыі працы Ірына Шыляева. — І разам з тым абавязак таго ж наймальніка — дакладна выканаць саму працэдуру. Так, па-першае, ён мусіць пісьмова паведаміць работніку аб будучым скарачэнні не пазней чым за два месяцы. А, па-другое, работніку павінны быць прапанаваныя ўсе вакансіі, якія ёсць у гэтай жа арганізацыі.

(Заканчэнне на 2-й стар.)



З апошняй крыгаю зіма сплывае

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

На Заходняй Дзвіне ў Полацку.

У Беларусі звужана кола асобаў, якія маюць права на атрыманне службовага жылля

У Беларусі ўводзіцца новы парадак прадастаўлення і выкарыстання службовых жылых памяшканняў дзяржаўнага жыллёвага фонду, а таксама значна звужаецца кола асобаў, якія надзяляюцца правам на атрыманне такога жылля. Адпаведны Указ № 128 «Аб некаторых пытаннях прадастаўлення і выкарыстання жылых памяшканняў дзяржаўнага жыллёвага фонду» кіраўнік дзяржавы падпісаў 19 сакавіка.

Службовыя жылыя памяшканні будуць прадастаўляцца толькі ў індывідуальным парадку Прэзідэнтам Беларусі, урадам і аблвыканкамамі і па вузкаму пераліку падстаў.

Устаноўлены вычарпальны пералік асобаў, якія маюць права на атрыманне службовага жылля без уліку падстаў. Гэта: суддзі і пракурорскія работнікі, ваеннаслужачыя, асобы радавога і начальніцкага складу органаў унутраных спраў, фінансавых расследаванняў, органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях, а таксама спецыялісты, якія забяспечваюцца жыллём, пабудаваным за кошт бюджэтных сродкаў, што накіроўваюцца на пераадоленне наступстваў чарнобыльскай катастрофы.

Урэгуляваны пытанні выкарыстання жыллёвага фонду, пабудаванага за кошт мэтавых сродкаў, якія штогод прадугледжваюцца ў бюджэце на пераадоленне наступстваў чарнобыльскай катастрофы: вызначаны катэгорыі грамадзян, якім будуць прадастаўляцца такія жылыя памяшканні, а таксама ўмовы і падставы іх прадастаўлення.

Незаселеныя жылыя памяшканні ў жылых дамах, пабудаваных за кошт названых сродкаў, размешчаных у населеных пунктах, выведзеных з забруджаных тэрыторый, дазволена выкарыстоўваць толькі ў якасці службовых. Прадугледжаны магчымасці вырашэння жыллёвых пытанняў некаторым катэгорыям асоб, што займаюць службовыя жылыя памяшканні, прадастаўленыя да ўступлення ў сілу ўказа Прэзідэнта ад 29 лістапада 2005 года № 565.

Так, суддзям і пракурорскім работнікам (якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў і якія працавалі 10 і больш гадоў на названых пасадах), ваеннаслужачым (якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў і маюць выслугу 10 і больш гадоў), грамадзянам, якія не падлягаюць высяленню са службовых жылых памяшканняў без прадастаўлення ім іншых жылых памяшканняў у выпадках, прадугледжаных заканадаўчымі актамі, прадастаўлены два спосабы набыцця ўласнага жылля.

Па-першае, ім дазволена прыватызаваць на выплатнай аснове да 1 студзеня 2008 года займаемыя службовыя жылыя памяшканні дзяржаўнага жыллёвага фонду. У выпадку смерці (гібелі, прызнання адсутным без вестак) наймальніка службовага жылога памяшкання з ліку вышэйпералічаных катэгорый асобаў, які не выкарыстаў права прыватызацыі ў тэрмін да 1 студзеня 2008 года, права прыватызацыі займаемага службовага жылля ў гэты ж тэрмін і на такіх жа ўмовах прадастаўляецца членам яго сям'і.

Па-другое, у выпадку калі наймальнік службовага жылога памяшкання не выкарыстае ў тэрмін да 1 студзеня 2008 года права на яго прыватызацыю, то за ім на тэрмін да 10 гадоў захоўваецца права карыстання гэтым жылым памяшканнем для вырашэння на працягу гэтага часу жыллёвага пытання шляхам будаўніцтва (рэканструкцыі) або набыцця жылога памяшкання з прыцягненнем ільготных крэдытаў або пазачарговае атрыманне жылля сацыяльнага карыстання.

Членам сем'яў загінулых суддзяў, пракурорскіх работнікаў, ваеннаслужачых у сувязі з выкананнем службовых абавязкаў прадастаўлена права на атрыманне займаемага службовага жылога памяшкання ў карыстанне па дагавору найму жылога памяшкання дзяржаўнага жыллёвага фонду або будаўніцтва (рэканструкцыю) або набыццё жылога памяшкання (на працягу шасці месяцаў з дня гібелі) з дзяржаўнай падтрымкай у выглядзе аднаразовай бязвыплатнай субсідыі.

Ветэранам баявых дзеянняў на тэрыторыі іншых дзяржаў, членам сем'яў ваеннаслужачых, загінуўшых у гады Вялікай Айчыннай вайны, і членам сем'яў загінуўшых ветэранаў баявых дзеянняў на тэрыторыі іншых дзяржаў прадастаўлена права на атрыманне жылля сацыяльнага карыстання.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

З 1 КРАСАВІКА Ў ПОЛЬШЧУ — ТОЛЬКІ ПА САПРАЎДНАМУ ПАШПАРТУ З ВІЗАЙ

Пагранічная служба Польшчы з 1 красавіка 2007 года будзе ажыццяўляць пропуск грамадзян Рэспублікі Беларусь праз дзяржаўную граніцу толькі па сапраўднаму пашпарту, у якім ёсць дзеючая польская віза. Аб гэтым БЕЛТА са спасылкай на польскі бок паведамілі ў прэс-службе МЗС Беларусі.

Тут удакладнілі, што грамадзяне, якія маюць два пашпарты, у тым ліку адзін несапраўдны (напрыклад, без чыстых старонак, неабходных для прастаўлення штампаў аб перасячэнні граніцы), але з дзеючай польскай візай, не будуць прапушчаны на польскую тэрыторыю. Да 1 красавіка дзейнічае пераходны перыяд, у час якога ўладальнікам двух пашпартоў будзе дазволена адзін раз уехаць на тэрыторыю Польшчы.

НЕ ПРАЦУЕ, А ГРОШЫ МАЕ. ФАЛЬШЫВЫЯ?

У адзін з філіялаў ААБ «Беларусбанк» жыхарка Баранавіч прад'явіла 1000 расійскіх рублёў для абмену. І тут высветлілася, што купюра фальшывая.

Жанчыну затрымалі і падчас вобыску ў яе знайшлі больш за 110 тысяч расійскіх рублёў. Грошы правяраюцца і застаецца толькі здзівіцца: «Адкуль у беспрацоўнай такая сума?»

Сімон СВІСТУНОВІЧ.

Сацыяльны рэпартаж

АДРАДЖЭННЕ ВЁСКІ — ГЭТА НАЙПЕРШ ПРАЦА І ЗАРОБАК

Так лічаць мясцовая ўлада і жыхары вёскі Ходасы Мсціслаўскага раёна

Сёлета Ходасам, што на Мсціслаўшчыне, спаўняецца 400 гадоў. Юбілей тут мяркуюць адзначыць увосень, калі скончацца палявыя работы, і да вялікага свята плануюць добра падрыхтавацца. Ходасаўцы хочуць, каб іх вёска стала ў будучым аграгарадком, і таму спадзяюцца на галоўны падарунак да «круглага» юбілею: каб Ходасы ўключылі ў адпаведны план па будаўніцтву аграгарадкоў. Адраджэнне вёскі мясцовыя жыхары звязваюць найперш з пашырэннем вытворчасці і стварэннем новых працоўных месцаў.

Веснавое прыбіранне

У Ходасах, якія за два дзесяткі кіламетраў ад раённага цэнтра, сёння жыве амаль дзве тысячы чалавек. Гэта вялікая вёска сярод іншых вылучаецца чыгуначнай станцыяй. Таму тут месцяцца розныя арганізацыі раённага маштабу, у тым ліку і камбікормавы завод.

У цэнтры Ходасаў каля амбулаторыі і сельвыканкама тоўпіцца народ. На дзвярах сельсавета да агульнай увагі — аб'ява з настойлівай просьбай навесці парадак на прыдворавых тэрыторыях, дзе шмат смецця пасля раставання снегу. Гэта на сёння асноўная задача мясцовай улады — прасачыць за веснавым прыбіраннем. Ходасаўскі сельсавет летась заняў першае месца ў раёне па ўсіх паказчыках, і тут маюць намер трымаць «марку».

Старшыня Ходасаўскага сельскага Савета Анатоль ШАВАНАЎ: «Адраджэнне вёскі — гэта развіццё вытворчасці».

У мясцовай школе, дзе вучыцца тры сотні школьнікаў, цяпер ідзе рамонт: усе дзверы і вокны мяняюцца на пластыкавыя шклопакеты, будынак уцяпляецца, фарбуюцца сцены, ідзе касметычны рамонт класаў. На ўсё гэта ўжо выдаткавана 400 мільёнаў рублёў.

Побач са школай — яшчэ адна будаўнічая пляцоўка. Гэта ўзводзіцца фізкультурна-спартыўны комплекс. Калісьці гэта будоўля была замарожаная, а летась была адноўленая. На суседніх вуліцах вядзецца пракладка каналізацыі: людзі радуюцца, што цяпер у іх будзе такая важная для жыцця выгода, але і хвалююцца — калі ж будзе адноўлена дарога, якая цяпер падобная на гразевую ванну. Мясцовыя ўлады пераконваюць, што ўсё будзе прыведзена ў парадак.

Упрыгажэнне цэнтральнай плошчы Ходасаў — Дом культуры. Гэта не новы будынак, і колькі гадоў ходасаўцы змагаліся з дахам, які пастаянна працякаў. У выніку дапамаглі дэпутат Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў Віктар Нерушкін і ўраджэнец Ходасаў Аляксандр Кулічкоў, кіраўнік спраў Прэзідэнта Беларусі. «Усе зацікаўленыя ў тым, каб захаваць, што маем, і стварыць новае», — з гордасцю гаворыць старшыня Ходасаўскага сельскага Савета Анатоль Шаванаў.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

Ходзяць чуткі, што...

Школьная праграма па беларускай літаратуры будзе кардынальна зменена?

У рэдакцыю паступае шмат усхваляваных тэлефанаванняў ад нашых чытачоў адносна магчымых зменаў у школьнай праграме па беларускай літаратуры.

Некаторыя СМІ паведамілі, што падрыхтаваны дакумент, згодна з якім творы шэрагу вядомых беларускіх паэтаў і пісьменнікаў будуць выкраслены з праграм і падручнікаў. Нібыта «непажаданай» для вывучэння зноў стане п'еса Янкі Купалы «Тутэйшыя» і г.д., і да т.п.

Як паведамілі ў Міністэрстве адукацыі Рэспублікі Беларусь, гэта неправераныя факты. Ніякіх афіцыйных дакументаў, звязаных са зменамі ў школьных праграмах па беларускай літаратуры, не паступала. У Міністэрстве адукацыі параілі не спяшацца ўспрымаць чуткі як «кіраўніцтва да дзеяння».

Таццяна ПАДАЛЯК.

Санаторно-курортное унитарное предприятие «Белагроздравница» БелАПС (Продавец) совместно с УП «Минский городской центр недвижимости» проводят открытый аукцион по продаже комплекса зданий, сооружений и оборудования филиала «Детский санаторий «Дружба» в районе поселка Городище Минского района (далее-объект). Продаже подлежат: административное здание (84,9 кв.м), лечебный корпус (304,9 кв.м), спальный корпус № 1 (207,9 кв.м), спальный корпус № 2 (409,0 кв.м), спальный корпус № 3 (214,1 кв.м), спальный корпус № 4 (143,0 кв.м), столовая (1956,2 кв.м), веранда 61,9, водолечебница (75,5 кв.м), склад (25,1 кв.м), котельная (500,9 кв.м), ангар (559,1 кв.м), гараж (312,2 кв.м), пристройка к гаражу (82,9 кв.м), артезианские скважины питьевой и минеральной воды, ограждения, емкости. Площадь земельного участка 10,73 га. Начальная цена 2 200 000 000 рублей включая НДС.

Размер задатка составляет 5% от начальной цены лота и перечисляется на расчетный счет № 3012024570010 в филиале ОАО «Белпромстройбанк» по Минской области, код 153001331 г. Минск, бульвар им. В. Мулявина, 6, УНП 190398583, УП «Минский городской центр недвижимости». Порядок проведения торгов оговорен в условиях проведения аукциона. Договор купли-продажи заключается в течение 10 рабочих дней с даты проведения аукциона. Закрепление земельного участка за новым собственником будет произведено местной землеустроительной и геодезической службой. Покупатель объекта обязан выполнить следующие условия:

- переоформить акт землепользования;
- соорудить забор по границе земельного участка между покупателем и общежитием филиала «Детский санаторий «Дружба»;
- обеспечить жильцов общежития филиала «Детский санаторий «Дружба» жизненно необходимыми условиями проживания (отоплением, электроэнергией, водоснабжением и канализацией) на условиях договора между покупателем и УП «Белагроздравница» БелАПС.

Оплата за объект производится в соответствии с договором купли-продажи. Аукцион состоится 19 апреля 2007 г. в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 18 апреля 2007 г. до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39.

КОНТАКТНЫЙ ТЕЛЕФОН: (8-017) 227-40-22.

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

НАПРЫКАНЦЫ САКАВІКА ЧАКАЮЦЦА НЕВЯЛІКІЯ ЗАМАРАЗКІ, А КРАСАВІК БУДЗЕ ЦЁПЛЫМ І ДАЖДЖЛІВЫМ

Як паведаміў карэспандэнту «Звязды» начальнік службы гідраметэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага гідраметцэнтра Дзмітрый Рабаў, на наступным тыдні на тэрыторыю краіны завітае больш халоднае паветра з боку поўначы Еўропы.

Таму ў апошні тыдзень сакавіка раніцай перад світаннем чакаюцца невялікія замаразкі ад 0 да мінус 3 градусаў, удзень — 1—7 цяпла, а па паўднёвай частцы краіны — да плюс 10 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў сіноптыкаў, у першай дэкадзе красавіка ў зоне павышанага ціску будуць рухацца малаактыўныя атмасферныя франты, якія прынясуць невялікія дажджы. Разам з тым дзённая тэмпература паветра павысіцца ад плюс 5 градусаў на паўночным усходзе да 10—14 цяпла на паўднёвым захадзе краіны. Ужо ў другой дэкадзе красавіка чакаецца істотнае змяненне сінаптычных працэсаў. Разам з вільготным атлантычным паветрам адбудзецца далейшае павышэнне тэмпературнага рэжыму. Чакаецца, што сярэднядзённая тэмпература паветра ў другой палове красавіка будзе ў межах 8—13 градусаў цяпла, а ў асобныя дні па поўдні краіны — нават да плюс 15—20 градусаў. Аднак у апошнія дні другога месяца вясны чакаецца традыцыйнае перадмайскае пахаладанне. На фоне антыцыклянальнага надвор'я ўначы і раніцай чакаюцца нават замаразкі да мінус 1—2 градусаў. Сіноптыкі разлічваюць, што па тэмпературы і ападках надвор'е ў красавіку будзе адпавядаць кліматычнай норме. Сярэднямесячная тэмпература паветра складзе ад плюс 4 градусаў у паўночнай частцы рэспублікі да 7 цяпла на паўднёвым захадзе. Месячная колькасць ападкаў прагназуецца ад 40 да 51 мм. Спецыялісты лічаць, што ў красавіку будзе не менш як 10—14 дажджлівых дзён.

Сяргей КУРКАЧ.

У МЕТРО — НАДЗВЫЧАЙНАЕ ЗДАРЭННЕ

Учора карэспандэнт «Звязды» стаў міжвольным сведкам здарэння, што адбылося на станцыі Мінскага метрапалітэна каля а паловы дзесятай раніцы: як падалося відавочцам, пад колы поезда кінулася жанчына.

Калі поезд выязджаў на станцыю «Плошча Леніна» з тунеля, і адбылося непрадбачанае: усе, хто знаходзіўся на пероне, пачулі гучны грукат — цела няшчаснай ударылася аб кабіну вадзіцеля. Удар быў такой моцы, што шкло ў кабіне вадзіцеля з боку перона разляцелася, а цела жанчыны апынулася паміж першым і другім вагонамі.

Як паведамілі карэспандэнту газеты ў Мінскім гарадскім упраўленні МНС, ахвяра здарэння атрымала смяротныя траўмы і сканала яшчэ да прыезду ўрачоў «хуткай дапамогі». Ужо вядома, што загінулая — ураджэнка вёскі Кошалева Навагрудскага раёна 1982 года нараджэння. Адказы на ўсе пытанні дасць расследаванне, якое праводзіцца пасля інцыдэнту. Затрымка ў руху паяздоў у выніку надзвычайнага здарэння на першай лініі метрапалітэна склала 22 хвіліны.

Ігар ГРЫШЫН.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

НА «УЛЬЯНАЎСКАЙ» ЗАГІНУЛІ ШАХЦЁРЫ, КІРАЎНІЦТВА ШАХТЫ І БРЫТАНЕЦ

Па апошняй інфармацыі, у выніку выбуху на шахце «Ульянаўская» ў Кемераўскай вобласці загінулі 104 чалавекі. Лёс яшчэ шасці работнікаў вуглездабываючага прадпрыемства застаецца невядомым.

На паверхню падняты целы 38 загінулых. 93 чалавекі выратаваны. Усяго ў момант выбуху пад зямлёй знаходзіліся 203 чалавекі. Выратавальная аперацыя на аварыйнай шахце працягвалася і ўчора.

Акрамя шахцёраў першай рабочай змены пад зямлёй загінула амаль усё кіраўніцтва шахты — каля 20 кіруючых работнікаў. «Перад выбухам у шахту спусцілася яе кіраўніцтва — галоўны інжынер, намеснік дырэктара па вытворчасці, начальнік участка і галоўны механік. Яны дэманстравалі прадстаўнікам замежнай фірмы, як дзейнічае апаратура сістэмы выяўлення газу. На жаль, ніхто з іх на паверхню не падняўся», — паведаміў начальнік упраўлення па сувязях з грамадскасцю адміністрацыі Кемераўскай вобласці Сяргей Чэрменаў. Губернатар Аман Тулееў пацвердзіў, што ў шахце загінуў грамадзянін Вялікабрытаніі. Цела брытанца знойдзена і паднята на паверхню.

НА ПАСАДУ ПРЭЗІДЭНТА ФРАНЦЫІ ПРЭТЭНДУЮЦЬ 8 МУЖЧЫН І 4 ЖАНЧЫНЫ

Канстытуцыйны савет Францыі афіцыйна паведаміў выбаршчыкам, што кандыдатамі на пасаду прэзідэнта краіны, выбары якога адбудуцца 22 красавіка, зарэгістраваны 12 чалавек.

У лік кандыдатаў увайшлі Франсуа Байру **(на фота)** (Цэнтрысцкі саюз за французскую дэмакратыю), Аліўе Безансэн (Лявацкая ліга камуністаў-рэвалюцыянераў), Жазэ Бавэ (Альтэрглабалісцкі рух), Мары-Жорж-Бюффэ (Французская камуністычная партыя), Арлет Лагійе (Працоўная барацьба), Жан-Мары Ле Пэн (Крайне правы Нацыянальны фронт), Фрэдэрык Ніу (Асацыяцыя паляўнічых і рыбаловаў), Сегален Руаяль (Французская сацыялістычная партыя), Нікаля Сарказі (Правячы саюз у падтрымку народнага руху), Жэрар Шывардзі (Працоўная партыя), Філіп Вілье (Рух за Францыю), Дамінік Вуанэ («зялёныя»).

Вынікі апытання грамадскай думкі паказваюць, што першы тур выбараў не вызначыць новага прэзідэнта Францыі. Між тым фаварытамі цяперашняй прэзідэнцкай гонкі лічацца «правы» Нікаля Сарказі, «левая» Сегален Руаяль і «цэнтрыст» Француса Байру.

У ПАЖАРЫ Ў ДОМЕ САСТАРЭЛЫХ НА КУБАНІ 62 ЧАЛАВЕКІ ЗАГІНУЛІ, 34 ПАЦЯРПЕЛІ

Буйны пажар адбыўся ў ноч на аўторак у доме састарэлых у горадзе Ейску на Кубані. Як паведамляецца, ахвярамі стыхіі стаў 61 пенсіянер і медсястра. Яшчэ 34 чалавекі шпіталізаваны.

Многія загінулыя задыхнуліся ад дыму. З гэтым жа дыягназам у бальніцы знаходзяцца і пацярпелыя. Толькі ў некалькіх чалавек маюцца сур'ёзныя апёкі. У МНС патлумачылі, што ў 2006 годзе памяшканне гэтага дома састарэлых двойчы правяралася інспекцыяй па пажарнаму нагляду. Больш чым з 30 выяўленых парушэнняў 6 засталіся нявыпраўленымі. У снежні кіраўніцтва аб'екта было аштрафавана і прыцягнута да адміністрацыйнай адказнасці.

На мой погляд

ГЭТА «НОВАЕ» СЛОВА «ЛІМІТ»

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ

Калі першага красавіка вам паведамяць (датычыцца мінчан і гасцей горада), што з гэтага моманту вам патрэбна лічыць колькасць сваіх паездак у метро, калі вы набываеце поўны шматразовы праязны білет (дэкадны ці на месяц), не ўспрымайце гэта як жарт на дзень смеху. З 1 красавіка мінскі метрапалітэн сапраўды ўводзіць ліміт паездак — 120 разоў для ўладальніка месячнага праязнога і 42 — для дэкаднага. Фактычна пасажыр аплачвае па поўнаму тарыфу 44 і 15 паездак. Як жыхары сталіцы ставяцца да новаўвядзення, мы і паспрабавалі высветліць напярэдадні 1 красавіка.

Сяргей КОЗЕЛ, настаўнік гісторыі мінскай школы № 219, выступіў «супраць»:

— Да ўвядзення ліміту паездак я стаўлюся адмоўна, бо чалавек набудзе праязны на месяц і калі яму давядзецца шмат карыстацца метро, будзе вымушаны набываць новы праязны да тэрміну яго заканчэння, напрыклад, за дзесяць дзён да канца месяца. Асабіста я часцей езджу на аўтобусе, таму хутчэй за ўсё не стану набываць праязны на наступны месяц.

Кірыл КЛІШЭВІЧ, адзін з салістаў гурта «Тяни-толкай», разумее прычыну новаўвядзення:

— Я дзесьці чытаў, што мінскае метро не акупляецца, таму ўвядзенне такога ліміту, пэўна, — крок да таго, каб крыху акупіць расходы метро. Лепш ліміт, чым павышэнне кошту жэтона, ці не так?

Ірына Пятроўна, служачая:

— Я нічога не маю супраць упарадкавання сістэмы аплаты за праезд, але ў любым выпадку гэта павінна быць лагічным і вытлумачальным. У дадзеным жа выпадку мяне не задавальняе некарэктнасць пастаноўкі пытання. Дайце магчымасць купіць або праязны на месяц і карыстацца ім як мне заўгодна, або прадайце картку на 120 паездак. Але няхай гэта будзе менавіта картка на 120 паездак, колькі б гэта не займала ў часе. Сёння я купляю праязны на месяц і езджу толькі па буднях на працу (44 паездкі ў месяц, з працы і на працу, — гэта значыць, ліміт не выбіраю і на палову). Лічу, што найперш трэба разабрацца з тэхнічным бокам пытання, а потым прыцягваць да фінансавання пасажыра. Дарэчы, гэта ж датычыць і наземных відаў транспарту. Я жыву ў трох прыпынках ад метро і купляю гэткі ж праязны на аўтобус, як і той, хто едзе, напрыклад, з Сухарава ва Уручча.

Уладзімір НАВІЦКІ, спартыўны тэлекаментатар, малады вадзіцель і карыстальнік метро са стажам:

— Да лістапада 2006 года метро было маім асноўным відам транспарту, пакуль не набыў свой першы аўтамабіль. Пяць месяцаў я ўжо не карыстаюся метро і жонку стараюся заўжды «падкінуць» да патрэбнага ёй месца. Майму сыну зручней ехаць на працу на маршрутцы. Калі б ліміт паездак на метро ўвялі да таго, як я стаў вадзіцелем, то, мяркую (задумваецца, бо робіць падлікі), мне б гэтага ліміту хапіла. Я звычайна набываў праязны на дэкаду і пры маім графіку працы ездзіў у сярэднім па чатыры разы на дзень. Канешне, камусьці з карыстальнікаў метрапалітэна можа не спадабацца такое своеасаблівае абмежаванне ў паездках, калі ў іх больш актыўны характар працы і ёсць пэўныя сямейныя абставіны. І ўсё ж я ўпэўнены, што для большасці прадастаўленая колькасць паездак — разумная лічба.

Марына, студэнтка БДУ, якая штодня карыстаецца метро і хутчэй за ўсё мае матэматычны склад розуму (прозвішча не назвала):

— Падлічым: 120 паездак сёння абыдзецца ў 60 тысяч рублёў, калі ездзіць па жэтонах, а поўны праязны зараз каштуе крыху больш за 20 тысяч, што прыкладна ў тры разы менш. Значыць, гэта выгадна, але ж праязны можа падаражэць. Пры сваёй актыўнасці я карыстаюся метро 4—5 разоў у залежнасці ад дня тыдня. Чаму так шмат? Мае сябры жывуць ў розных частках Мінска, таму езджу да іх на метро. Зімой вельмі зручна сустракацца на платформе, ісці праз метро, каб было цяплей. Іншым разам пазычаю свой праязны сястры, каб яна не тратыла грошы на жэтон. Аднак зараз давядзецца падлічваць, ці магу я ездзіць столькі ж разоў, як раней, каб укласціся ў ліміт. 120 паездак быццам мне дастаткова, але адчуваю сябе абмежаванай у перамяшчэннях па гораду. Праўда, зараз набліжаецца цёплае надвор'е і можна некалькі прыпынкаў прайсці.

Ілона УСОВІЧ, лёгкаатлетка, якая аддае перавагу пешым прагулкам:

— На маё шыццё такое новаўвядзенне ніяк не паўплывае. Мне столькі паездак нават мнагавата, бо я бываю ў Мінску толькі чатыры месяцы ў год, ды і езджу ў метро не кожны дзень і толькі па жэтонах. На трэніроўку магу дабрацца пешшу, бо жыву ў пятнаццаці хвілінах хады.

Андрэй НОВІКАЎ, які часта ездзіць па рабоце ў Маскву:

— Акрамя абмежавання паездак на праязны, нам варта ўвесці кароткатэрміновыя праязныя, як у Маскве, дзе пры вялікіх пробках на дарогах метро — ледзь не адзінае выйсце. У Маскве цудоўна вырашаецца праблема чэргаў у метро, бо там няма жэтонаў, а толькі праязныя білеты на 1, 2, 10, 20 паездак ці поўны праязны, на які таксама існуе ліміт. Пры такім раскладзе, зразумела, ніхто, ні у нас, не звяртаецца ў акенца за адным жэтончыкам, ад чаго вырастае чарга, асабліва на станцыі побач з вакзалам. Калі спяшаешся, гэта вельмі выводзіць з сябе.

Рыгор КАНДРАЦЕНЯ, начальнік аддзела аўтаматызаваных сістэм упраўлення і новых тэхналогій мінскага метрапалітэна:

— Людзі павінны разумець, што за аказанне якаснай паслугі (у дадзеным выпадку наш тавар — перавозкі пасажыраў) трэба плаціць грошы. Мінскі метрапалітэн, аказваючы транспартныя паслугі, нясе затраты. Частку іх пакрываюць пасажыры, частку кампенсуе дзяржаўны бюджэт. На ўвядзенне ліміту мы ідзём вымушана, бо ведаем затраты, разумеем, што сабекошт адной паездкі — прыкладна 900 рублёў. Звычайна мы рэалізуем 80 тысяч поўных праязных.

Набываючы іх, раней людзі ездзілі, колькі хацелі, а навошта нам губляць грошы і вазіць за свой кошт, калі патрэбна пакрываць расходы? У Маскве існуе ліміт 70 паездак і праязны прадаецца за поўны кошт, а не так, як у нас. Раней мы не маглі ўвесці ліміт паездак, бо ў нас не было тэхнічных магчымасцяў. Дарэчы, асобы, якія карыстаюцца льготамі, ездзяць не з электроннымі карткамі, а са звычайнымі пластыкавымі білетамі, і могуць свабодна ездзіць без уліку паездак. Калі б мы мелі магчымасць, то і для іх увялі б ліміт.

Распытвала Ірына ПРЫМАК.

ISSN 1990-763X

9 771990 763015

КУРСЫ ВАЛЮТ

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 21.03.2007 г. (для б/н разлікаў)

1 долар ЗША	2 143,00
1 еўра	2 848,05
1 латвійскі лат	4014,61
1 літоўскі літ	824,48
1 чэшская крона	102,41
1 польскі злоты	734,76
1 расійскі рубель	82,29
1 украінская грыўня	426,17

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрабанк РФ

USD	26,0414
10 UAH	51,4398
1000 BYR	12,1221
EUR	34,6429

Курс у гандлёвых кампаніях (на 20.03.2007 г.)

USD	2140 / 2210

Падпісацца на часопіс «Главный бухгалтер. ГБ» на 2007 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

У Беларусі ўдасканалены ўмовы для экспарту прадукцыі

У Беларусі ўдасканалены ўмовы для ажыццяўлення экспартных паставак айчыннай прадукцыі. Адпаведныя нормы змешчаны ва Указе Прэзідэнта № 129 ад 19 сакавіка 2007 года «Аб стымуляванні экспартных паставак».

Дакументам, у прыватнасці, прадугледжаны меры па стымуляванню айчынных вытворцаў і перавозчыкаў, якія ажыццяўляюць пастаўкі ў порт або краіну прызначэння знешнегандлёвай прадукцыі Рэспублікі Беларусь на ўмовах CIF і CFR. Зроблена гэта ў мэтах забеспячэння рэалізацыі беларускай знешнегандлёвай прадукцыі на сусветных рынках без удзелу пасрэднікаў, нарошчвання аб'ёмаў марскіх і аўтамабільных перавозак з удзелам рэзідэнтаў Рэспублікі Беларусь.

Акрамя таго, дакумент змяшчае меры па далейшаму развіццю перавозак знешнегандлёвых грузаў рэзідэнтамі Рэспублікі Беларусь, фарміраванню ўмоў для стварэння айчыннага марскога гандлёвага флоту і абнаўлення парку аўтатранспартных сродкаў для ажыццяўлення міжнародных аўтамабільных перавозак грузаў.

Рэалізацыя нормаў указа дасць магчымасць прыцягнуць інвестыцыі ў стварэнне і развіццё беларускага марскога гандлёвага флоту, павысіць міжнародны аўтарытэт краіны, стварыць дадатковыя рабочыя месцы для маракоў — грамадзян Рэспублікі Беларусь і забяспечыць дадатковыя паступленні ў бюджэт краіны сродкаў ад падатковых пералічэнняў.

У прыватнасці, пры экспарце рэзідэнтамі Рэспублікі Беларусь прадукцыі на ўмовах CIF і CFR падатковая база для вылічэння і выплаты збору ў рэспубліканскі фонд падтрымкі вытворцаў сельскагаспадарчай прадукцыі, прадуктаў харчавання і аграрнай навукі, падатку з карыстальнікаў аўтамабільных дарог змяншаецца на суму затрат на набыццё работ і паслуг, звязаных з марской перавозкай гэтай прадукцыі.

Акрамя таго, у мэтах павышэння канкурэнтаздольнасці міжнародных аўтаперавозчыкаў прапаноўваецца стварыць умовы, якія дадуць магчымасць пашырыць магчымасці такіх перавозчыкаў па абнаўленню парку аўтамабіляў, перш за ўсё за кошт асобных змяненняў парадку афармлення транспартных сродкаў у мытным рэжыме часовага ўвозу. Выкарыстанне такога рэжыму дасць магчымасць пры заключэнні дагавора лізінгу на транспартны сродак і ўнясенні перадаплаты ў памеры 10—15 працэнтаў ад кошту атрымаць новы аўтамабіль, у кароткія тэрміны пачаць яго эксплуатацыю і зарабляць сродкі на выплату лізінгавых плацяжоў і належных да выплаты мытных плацяжоў.

Указам прадугледжана стварыць часовыя (тэрмінам на тры гады) умовы для паскоранага абнаўлення парку міжнародных перавозчыкаў за кошт афармлення новых аўтамабіляў узроўню Еўра-3 і вышэй замежнай вытворчасці ў рэжыме часовага ўвозу без выплаты мытных плацяжоў пры ўмове абавязковага набыцця такой жа колькасці новых айчынных аўтамабіляў. Пасля завяршэння тэрміну часовага ўвозу (34 месяцы) і заявы рэжыму выпуску для свабоднага абарачэння па гэтых аўтамабілях належныя мытныя плацяжы будуць выплачаны.

У мэтах захавання канкурэнтаздольнасці беларускіх транспартных арганізацый, што выконваюць міжнародныя перавозкі, прадугледжана аднаўленне прымянення стаўкі падатку на дабаўленую вартасць у памеры 0 працэнтаў адносна абаротаў па рэалізацыі транспартных паслуг за межамі Рэспублікі Беларусь.

Такім чынам, рэалізацыя ўказа ў цэлым дасць магчымасць павысіць канкурэнтаздольнасць беларускіх перавозчыкаў на міжнародным рынку транспартных паслуг, стымуляваць экспартныя пастаўкі беларускай знешнегандлёвай прадукцыі на ўмовах CIF і CFR і пераключыць транспартны складальнік такіх паставак на рэзідэнтаў Рэспублікі Беларусь.

Указ уступае ў сілу праз 10 дзён пасля яго афіцыйнага апублікавання.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

АДРАДЖЭННЕ ВЁСКІ — ГЭТА НАЙПЕРШ ПРАЦА І ЗАРОБАК

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Самае галоўнае — праца

Асноўны працадаўца ходасаўцаў — гэта Райаграпрамтэхзабеспячэнне, да якога далучылі дзве сельскія гаспадаркі. СВК «Усполле» ўжо злілося з арганізацыяй, а саўгас імя Тэльмана — яшчэ ў працэсе. Гаспадаркі — эканамічна слабыя. І надоі, і ўраджаі збожжавых тут малыя. Напрыклад, у саўгасе імя Тэльмана дойны статак складаецца толькі з трох соцень галоў. Прычым, як кажуць, гэта ўжо не каровы, а, лічы, козы. Яны даюць малака менш, чым сабраныя сельсаветам у прыватнікаў лішкі.

Так што Райаграпрамтэхзабеспячэнню давядзецца прыкласці нямала намаганняў, каб адрадзіць вытворчасць малака і збожжа. Аднак ужо летась арганізацыя практычна сеяла і збірала ўраджай у гаспадарках, і вал збожжа быў удвая большы. Значыць, можна дасягнуць вынікаў. На новыя добрыя вынікі павінны працаваць тэхніка і людзі.

Сяляне звязваюць свае надзеі на лепшае з гэтым аб'яднаннем і найперш спадзяюцца, што не будзе скарачэнняў. На мясцовым камбікормавым заводзе такія скарачэнні, на жаль, раней адбыліся: там працавала каля сотні чалавек, а цяпер — напалову меней. Усё ж працоўных месцаў для жыхароў Ходасаў не хапае.

— Адраджэнне вёскі — гэта ў першую чаргу вытворчасць, — упэўнены кіраўнік Ходасаўскай улады. — Людзям трэба даць працу, каб яны зараблялі нармальныя грошы, а потым думаць пра культурны адпачынак.

Анатоль Шаванаў лічыць, што сёння, каб нармальна жыць, сельскі жыхар павінен зарабляць тысяч 500 рублёў. Некаторыя такія грошы ўжо атрымліваюць: у першую чаргу, размова тут пра бюджэтнікаў — медыкаў, настаўнікаў. А вось работнікі сельскагаспадарчай вытворчасці столькі яшчэ не зарабляюць.

Ці ёсць іншыя магчымасці для адраджэння сельскіх гаспадарак, акрамя як перадачы іх у рукі Райаграпрамтэхзабеспячэнню? Напэўна, пакуль няма, адказваюць у сельвыканкаме. Пра перадачу зямель у прыватныя рукі сёння размовы няма. Наадварот, людзі цяпер прыходзяць да ўлады з заявамі аб адмове ад сваіх зямельных надзелаў: альбо няма сіл па старасці апрацоўваць зямлю, альбо стаміліся ад дадатковых клопатаў. У гэтых мясцінах сем'і звычайна маюць у сярэднім гектар зямлі, дзе вырошчваюць збожжа і бульбу. А вось смелых прыватнікаў, якія б узялі паболей зямлі і сталі сапраўднымі фермерамі, пакуль няма.

Рух за аграгарадок

Акрамя чыгункі, Ходасы знаходзяцца на шашы, якая вядзе да Мсціслава і потым на мяжу з Расіяй. Тут ёсць і заправачная станцыя — відавочная прыкмета цывілізацыі. Аднак нягледзячы на ўсё гэта, Ходасы дасюль маюць статус вёскі і нават стаць аграгарадком няма перспектывы, калі нічога не зменіцца.

— Калі складаўся спіс аграгарадкоў, мне ў раёне сказалі, што Ходасы па сутнасці даўно аграгарадок і, маўляў, трэба іншых падняць да гэтага ўзроўню, — тлумачыць Анатоль Шаванаў. — Аднак мы тут з такой пазіцыяй не згодныя. Наколькі мне вядома, цяпер Мсціслаўскі раён звярнуўся з хадайніцтвам, каб Ходасы ўсё ж сталі ў будучым аграгарадком. Аднак тут размова ідзе пра вялікія грашовыя выдаткі, і рашэння на гэты конт яшчэ няма.

Канешне, прызнаюць ходасаўцы, у іх і так нядрэнна, але, з іншага боку, дасканаласці няма межаў. І ёсць праблемы ў Ходасах, якія можна было б вырашыць за кошт сродкаў, выдаткоўваемых на добраўпарадкаванне будучага аграгарадка. У «лісце чакання» — падсыпка дарог, правядзенне водаправода ў некаторых месцах, рамонт і ўсталяванне ў цэнтры бетонных агароджаў.

Усяго ў Ходасаўскім сельсавеце — 13 вёсак. Аднак, акрамя буйных Ходасаў, іншыя вёскі, на жаль, наўрад ці маюць шанцы на будучае. Верагодна, што ў будучым невялікія вёскі знікнуць з карты Ходасаўскага сельсавета — ужо цяпер там эканамічна нявыгадна ўкладаць грошы ў дарогі і ўтрымліваць школы. У малых паселішчах жывуць у асноўным пенсіянеры, якія хочуць, натуральна, не працоўных месцаў, а якаснага сацыяльнага абслугоўвання.

Цэнтральная плошча Ходасаў: Дом культуры, будынак амбулаторыі і сельскага Савета.

Анатоль Шаванаў лічыць, што праз некалькі дзесяткаў гадоў гаспадарка з цэнтрам у Ходасах будзе мець развітую эканоміку. Тут будуць не толькі вырабляць прадукцыю, але і перапрацоўваць яе. У перспектыве вытворчая і сацыяльная сферы сканцэнтруюцца ў цэнтры, і жыццё ходасаўцаў стане больш камфортным.

— Калі мы прыязджаем у Магілёў, то бачым, што там для людзей зроблена значна больш, — разважае старшыня сельвыканкама. — Гэта не значыць, што мы хочам жыць у горадзе. Мы хочам, каб і для нас, сялян, было больш выгод для звычайнага жыцця.

Заробак, бальніца, маладзёжнае кафэ

Сёння няма ніякай розніцы паміж харчовымі крамамі, напрыклад, у Магілёве і ў Ходасах. І асартымент амаль такі ж, і цэны не скачуць. Толькі прыходзь і набывай!

— А каб людзі маглі набыць, трэба даць ім добрую працу, каб яны маглі дастойна зарабіць, — зноў вяртаецца да сваёй асноўнай думкі Анатоль Шаванаў. — Таму адраджэнне вёскі — гэта, у першую чаргу, развіццё вытворчасці.

Ходасаўцы згодныя са сваім старшынёй, што для іх важней за ўсё адраджэнне сельскіх гаспадарак, якія апошнія гады былі ў заняпадзе.

— У маім разуменні адраджэнне — гэта каб нашым людзям было дзе працаваць і жыць, — лічыць сакратар Ходасаўскага сельскага Савета Людміла Сурава. — Неабходны сацкультбыт маем, а вось праца — гэта галоўнае. Будзе праца — будуць прыязджаць маладыя семі, будзе нешта рабіцца, вёска будзе расці і развівацца.

— У нас у Ходасах ёсць амбулаторыя, але для нармальнага жыцця, я лічу, патрэбны і стацыянар, дзе можна было б людзям, асабліва сталага ўзросту, падлячыцца, — гаворыць пенсіянерка Галіна Палеева. — Магазінаў хапае, усё ў нас ёсць, вось толькі здароўя нестае. Таму хочацца, каб у нас была свая бальніца.

— Трэба стварыць умовы жыцця для моладзі, каб яна ў нас заставалася, — мае сваё меркаванне начальнік Ходасаўскай чыгуначнай станцыі Аляксандр Бебекаў. — Нам патрэбныя добрыя спартыўныя пабудовы і месцы адпачынку. Трэба і кафэ, і паркі, і ўсё іншае, дзе моладзь будзе бавіць свой вольны час. І адраджэнне таксама — паляпшэнне стану дарог і вуліц. Трэба стварыць умовы для лепшага жыцця. Мы ж ідзём наперад!

Адраджэнне вёскі — справа кожнага

— Ну канешне, мы вітаем усё, што мае дачыненне да адраджэння вёскі! — усміхаецца Анатоль Шаванаў. — Мы ж самі вяскоўцы! Гэта добра, што дзяржава клапоціцца пра тое, каб вяскоўцы заможна жылі і культурна адпачывалі.

Аднак улады нагадваюць, што адраджэнне вёскі датычыцца не толькі дзяржавы і начальнікаў. Яно датычыцца кожнага чалавека, які ў гэтай вёсцы жыве.

— Многія з разуменнем ставяцца і самі імкнуцца, каб у іх было ўсё добра і прыгожа, — падкрэслівае старшыня Ходасаўскага сельскага Савета. — А вось іншых трэба штурхаць. І ў некаторых з'явіўся такі прынцып утрыманства: яны хочуць, каб за іх усё зрабіла дзяржава і за дзяржаўныя грошы. Маўляў, абавязаны нам і давай! Не разумеюць, што гэта яны самі павінны для сябе зрабіць. І трэба тлумачыць, што без іх удзелу нічога мы не адродзім.

Ілона ІВАНОВА,
Мсціслаўскі раён.

Ва ўрадзе

Калі маргарын стане канкурэнтаздольным?..

Перспектывы развіцця алейна-тлушчавай галіны рэспублікі на гэты і наступныя тры гады абмяркоўваліся на пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў у аўторак.

Прэм'ер-міністр Сяргей Сідорскі, пад старшынствам якога і разглядаўся праект праграмы развіцця алейна-тлушчавай галіны на 2007—2010 гады, прывёў паражальную лічбу наконт стану спраў у галіне: за апошнія два гады экспарт беларускай алейна-тлушчавай прадукцыі знізіўся ў 32 разы. Асобная гутарка — канкурэнтаздольнасць гэтай прадукцыі. «На сёння наша прадукцыя, напрыклад, маргарын каштуе 2100—2200 рублёў, а аналагічны расійскі — 1560—1650 рублёў. Вось вам, калі ласка, і ўся канкурэнцыя», — зазначыў Сяргей Сідорскі. А таму неабходна, запатрабаваў кіраўнік урада, прыняць меры па павышэнню канкурэнтаздольнасці гэтай прадукцыі. Акрамя таго, трэба больш дэталёва разгледзець пытанні тэхнічнага пераўзбраення беларускіх прадпрыемстваў па перапрацоўцы алею, увязкі іх працы са знешнімі рынкамі дадзенай прадукцыі, пытанні навуковага забеспячэння ў частцы распрацоўкі новых рэцэптур алейна-тлушчавай прадукцыі.

Старшыня канцэрна «Белдзяржхарчпрам» Іван Данчанка, які прадстаўляў праект праграмы, падкрэсліў, што яе рэалізацыя дазволіць павялічыць аб'ёмы вытворчасці алейна-тлушчавай галіны да канца 2010 года ў параўнанні з мінулым у 3 разы. Асноўнымі мэтамі дакумента ён назваў максімальнае забеспячэнне краіны алеем, а камбікормавай прамысловасці — другаснай сыравінай беларускай вытворчасці, павышэнне канкурэнтаздольнасці прадукцыі айчынных прадпрыемстваў па вытворчасці алею. У прыватнасці, для скарачэння імпарту алею плануецца павялічыць магутнасці па вытворчасці гэтага прадукту ў рэспубліцы. За чатыры гады, згодна з праектам праграмы, у Беларусі прадугледжваецца ў 2,5 раза павялічыць аб'ёмы вытворчасці рапсу (да 479 тысяч тон у 2010 годзе), што дазволіць у 2010 годзе вырабіць 145—150 тысяч тон рапсавага алею і задаволіць патрэбы краіны ў ім. Павялічацца аб'ёмы вытворчасці і бутыляванага алею з сённяшніх 5,3 тысячы тон да 76 тысяч тон у 2010 годзе. У час, што адведзены на рэалізацыю праграмы, мяркуецца рэканструяваць і тэхнічна пераўзброіць 10 алейна-тлушчавых прадпрыемстваў, што дзейнічаюць, а таксама пабудаваць два новыя. Паводле слоў Івана Данчанкі, на тэхнічнае пераўзбраенне і рэканструкцыю галіны плануецца зрасходаваць у 2007—2010 гадах да 74,5 мільёна долараў ЗША.

Ігар ШЧУЧЭНКА

Жылыя дамы ў Ходасах.

Мсціслаўшчына.

Аляксандр Лукашэнка выказаў спачуванні прэзідэнту Расіі

Вестка аб пажары ў доме састарэлых у станіцы Камышавацкая Краснадарскага края, які прывёў да шматлікіх чалавечых ахвяраў, з болем успрынята ў Рэспубліцы Беларусь. Аб гэтым гаворыцца ў спачуванні Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі прэзідэнту Расійскай Федэрацыі Уладзіміру Пуціну. Ад імя беларускага народа і сябе асабіста Аляксандр Лукашэнка выказаў глыбокія спачуванні Уладзіміру Пуціну, родным і блізкім загінулых.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

МЗС Беларусі: «Узвядзенне «платоў» павінна застацца ў мінулым»

«Абмежавальная палітыка Еўрапейскага саюза ў адносінах да Беларусі вычарпала сябе: узвядзенне «платоў» павінна застацца ў мінулым», — заявіў учора, 20 сакавіка, прэс-сакратар МЗС нашай краіны Андрэй Папоў, каментуючы рашэнне Савета ЕС падоўжыць на год візавыя і фінансавыя абмежаванні, якія датычаць высокапастаўленых беларускіх афіцыйных асобаў.

«Платамі» адзіную Еўропу не пабудаваць. Без кантактаў не дасягнуць узаемаразумення», — дадаў Андрэй Папоў. Пры гэтым ён падкрэсліў, што зараз неабходны новы этап ва ўзаемаадносінах Беларусі і ЕС, калі ўзаемаадносіны будуць будавацца на аснове прагматызму і ўзаемнай павагі. «Нам трэба шукаць шляхі партнёрскага ўзаемадзеяння па напрамках, якія адпавядаюць практычным інтарэсам бакоў».

Сяргей КУЗНЯЦОЎ.

Кіраўнік беларускай дзяржавы павіншаваў прэзідэнта Туніса

Кіраўнік беларускай дзяржавы Аляксандр Лукашэнка павіншаваў прэзідэнта Туніса Зіна аль-Абідзіна бен Алі з Днём незалежнасці.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Твае правы

ПАРУШЫЎ — ЗНАЧЫЦЬ... НЕ ЗВОЛЬНІЎ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Калі своечасовага пісьмовага папярэджання аб скарачэнні не было ці работніку не прапанавалі вакансіі, з'яўляецца падстава для звароту ў суд. Прычым, як правіла, суды прымаюць рашэнні аб аднаўленні на ранейшым месцы. А таксама абавязваюць наймальнікаў выплаціць работніку яго сярэдні заробак за кожны дзень «вымушанага прагулу».

Дарэчы, таксама істотны момант падчас скарачэння ці звальнення — час выдачы працоўнай кніжкі. Яе работнік мусіць атрымаць «на рукі» ў апошні дзень знаходжання на сваім працоўным месцы. І ў выпадку, калі наймальнік своечасова не паслаў пісьмовае заказное паведамленне аб необходнасці забраць працоўную кніжку, работнік мае права спагнаць свой сярэдні заробак за ўвесь перыяд зноў-такі «вымушанага прагулу». Прычым датай звальнення тут становіцца дзень выдачы працоўнай кніжкі.

Скарачэнне з паўгадавым «мараторыем»

Як вядома, адносіны кіраўніка і падначаленага могуць быць абсалютна рознымі, і ў тым ліку — далёка не ідэальнымі. Таму разпораз можа ўзнікнуць такая сітуацыя: па «асабістых» матывах работніка звальняюць па скарачэнню, да прыкладу, з пасады дыспетчара. А неўзабаве «скарочаная» пасада дыспетчара з'яўляецца ў гаспадарцы зноў. Аднак, зразумела, што працуе на ёй ужо зусім іншы чалавек...

— Калі наймальнік хоча «пакараць» такім чынам канкрэтнага работніка, ён павінен памятаць аб магчымых наступствах падобнага кроку, — адзначае Ірына Шыляева. — Вядома, што без таго ж дыспетчара немагчымая работа ніводнай гаспадаркі. І ў той жа час наша заканадаўства вызначае: вяртаць «скарочаную» пасаду на працягу 6 месяцаў нельга.

120 гадзін. І не больш

Сезонны характар работ плюс дэфіцыт кадраў. Час ад часу гэтыя акалічнасці становяцца прычынамі выхаду вяскоўцаў на работу па выхадных ці святочных днях. З пункту гледжання заканадаўства, такі варыянт магчымы. Аднак толькі пры ўмове выканання пэўных правілаў. Скажам, абавязковай у дадзеным выпадку ўмовай з'яўляецца згода самога работніка ў пісьмовай форме або ў выглядзе подпісу пад адпаведным загадам. Да таго ж нельга забывацца: паводле артыкула 69 Працоўнага кодэкса, работа ў выхадныя ці святочныя дні аплачваецца ў двайным памеры або «кампенсуецца» прадастаўленнем дадатковага дня водпуску.

І яшчэ. Варта памятаць, што максімальная працягласць работы ў выхадныя і святы не можа перавышаць 120 гадзін у год. Таму адвольнае павелічэнне гэтай нормы з'яўляецца бяспрэчным парушэннем працоўнага заканадаўства. І, адпаведна, вядзе да санкцый у адносінах да наймальніка.

Для агародаў лепш заява

Амаль кожны вясковец трымае сваю гаспадарку. Таму адпрасіцца на некалькі дзён для таго, каб пасеяць агарод ці аднавіць плот — просьба нярэдкая і цалкам зразумелая. Праўда, тут таксама ўзнікнуць пэўныя праблемы з наймальнікам. І больш таго: нават у выпадку папярэдняй дамоўленасці на словах справа можа закончыцца звальненнем... за «прагул».

— Калі работнік цалкам даврае кіраўніку, а ў сваю чаргу кіраўнік — работніку, «адпрасіцца» для апрацоўкі прысядзібнага ўчастка ці наведвання паліклінікі можна і ў вуснай форме, — зазначае Ірына Шыляева. — Аднак калі паразумення няма, то лепш за ўсё напісаць заяву, дачакацца, калі яе падпіша кіраўнік, і, ў рэшце рэшт, занесці гэты дакумент у кадравую службу для афармлення загада. І, апроч таго, у выпадку відавочнага канфлікту таксама нялішне — зняць копію загада.

Пры гэтым у выпадку толькі вуснай дамоўленасці скасаванне працоўных адносінаў не выключаецца. Аднак яно можа адбыцца выключна па закону. У прыватнасці, «прагул» павінен быць адлюстраваны ў табелі ўліку працоўнага часу, неабходна мець службовую запіску, высветліць ступень «уважлівасці» прычыны, запатрабаваць ад работніка пісьмовую тлумачальную, а калі работнік адмовіўся яе даваць, — скласці ў прысутнасці не менш чым 3 чалавек адпаведны акт. Нарэшце, непасрэдна з загадам аб звальненні работніка абавязаны азнаёміць на працягу пяці дзён «пад роспіс».

Сапраўды, адсутнасць адной з пералічаных умоў не з'яўляецца падставай для не выдання загада аб звальненні. Аднак у выпадку парушэння працэдуры работнік можа звярнуцца ў суд. Адно, што трэба заўважыць: тэрмін звароту сюды абмежаваны месяцам.

Ці пацвердзяць стаж даяркі?

Зноў-такі няпростая сітуацыя. Жанчына амаль 30 гадоў працуе даяркай. І ў той жа час даволі працяглы перыяд яна была аформлена... паляводам. Між тым, варта ўзгадаць: даяркі, якія выконвалі нормы догляду жывёлы, па заканадаўству маюць права датэрмінова выйсці на пенсію. Такім чынам, ці магчыма скарыстацца гэтым правам з улікам няправільнага запісу ў дакументах?

— Безумоўна, сітуацыя складаная, і тым не менш тут магчыма адшукаць выйсце, — адзначае Ірына Шыляева. — У прыватнасці, перш-наперш трэба вызначыць, які запіс быў зроблены ў працоўнай кніжцы, і ў якасці каго ўсё ж атрымлівала жанчына зарплату «па ведамасці» — палявода ці жывёлавода. Бо калі высветліцца, што налічэнні сапраўды рабіліся як жывёлаводу, ёсць усе падставы для звароту ў раённае ўпраўленне па працы, занятасці і сацыяльнай абароне з заявай аб прызнанні права на датэрміновую пенсію. Прычым нагадаю, што тэрмін захоўвання дакументаў па асабістаму саставу ў любой арганізацыі складае 75 гадоў. І паклапаціцца аб гэтым — прамы абавязак кожнага наймальніка. Таму, калі ж дакументы па той ці іншай прычыне ўсё ж зніклі, работнік можа падаваць заяву ў суд.

Сяргей ГРЫБ.
Мінск—Смаргонь.

Здарэнні

ДЗЕЦІ ЗАХВАРЭЛІ НА МЕНІНГІТ

Два выпадкі захворвання на менінгіт зарэгістраваныя на мінулым тыдні ў Пінску і адзін — у Пінскім раёне. У горадзе інфекцыя паразіла навучэнцаў ПТВ, у вёсцы Пінкавічы — школьніцу. Спецыялісты сцвярджаюць, што размова пра эпідэмію не можа ісці, бо хворыя наведвалі розныя навучальныя ўстановы, але папярэджваюць, што менінгакокавая інфекцыя найбольш актывізуецца ў перыяд эпідэміі грыпу і іншых вірусных захворванняў.

Яна СВЕТАВА.

ЗАГУБІЎ СЯМ'Ю...

У выніку гэтага дарожна-транспартнага здарэння загінулі блізкія вадзіцеля аўтамабіля.

Паблізу вёскі Карма Уздзенскага раёна каля пяці гадзін дня менеджар аднаго з мінскіх таварыстваў, кіруючы «Рэно», ударыўся ў металічную агароджу, пасля чаго машына перакулілася. Вадзіцель змешчаны ў бальніцу, а вось яго жонка, намеснік дырэктара аднаго з ЗАТ, і пяцігадовы сын загінулі.

Аляксей ЦІТОЎ.

Фота Мікалая ПЯТРОВА, БЕЛТА.

У Беларускім рэспубліканскім тэатры юнага гледача ў рамках акцыі «Засвяціся і стань больш прыкметным!» днямі прайшла творчая акцыя «Флікер у падарунак». Валанцёры — мінскія школьнікі і навучэнцы на ўласным прыкладзе прадэманстравалі, што насіць флікер і клапаціцца аб сваёй бяспецы — гэта модна і неабходна. Гледачы атрымалі ў падарунак флікеры, святлоадбівальныя бранзалеты і павязкі, інфармацыйныя флаеры, каляндарыкі. Праект рэалізуецца ў мэтах папярэджання дзіцячага і падлеткавага траўматызму на дарогах у цёмны час сутак, пашырэння ведаў школьнікаў аб правілах дарожнага руху.

На здымку: лейтэнант міліцыі Марыя Юркевіч раздае дзецям флікеры.

ЧАС — УПЕРАД!

У Беларусі 25 сакавіка 2007 года будзе ажыццёўлены пераход на «летні» час у адпаведнасці з парадкам вылічэння часу, вызначаным пастановай урада Беларусі ад 13 мая 1996 года № 317.

У сувязі з гэтым 25 сакавіка 2007 года ў 2 гадзіны стрэлкі гадзіннікаў пераводзяцца на адну гадзіну наперад.

БЕЛТА.

Калі вы падпісаліся на газету **«Звязда» на II квартал або 6 месяцаў 2007 года** — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце яе ў рэдакцыю па адрасу **220013 Мінск, вул.Б. Хмяльніцкага, 10А**.

Падпісчык можа выйграць у якасці прыза гадзіннікі, майкі, бейсболкі, печ СВЧ, тэлевізар «Віцязь» і суперпрыз — халадзільнік «Атлант». Карткі, наклееныя на паперу ці плёнку, або дасланыя **пасля 30 сакавіка 2007 года** па паштоваму штэмпелю атрымання да ўдзелу ў гульні не прымаюцца. Розыгрыш прызоў праводзіцца **3 красавіка 2007 г.**, вынікі публікуюцца ў газеце «Звязда» **да 13 красавіка**.

Атрымаць прыз можна ў рэдакцыі **да 20 чэрвеня 2007 г.** пры прад'яўленні квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на II кв. або 6 мес. 2007 года і пашпарта. Дастаўку печы СВЧ, тэлевізара і халадзільніка ажыццяўляе рэдакцыя. **Пасля 20 чэрвеня** выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца.

Больш падрабязна правілы гульні «Падпішыся на «Звязду» чытайце ў нумары газеты за 10 сакавіка 2007 года. Удачы ў гульні!

2 Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на II квартал або 6 месяцаў 2007 года

Прозвішча, імя, імя па бацьку _____

Падпіска аформлена і аплачана ў _____ (аддзяленне сувязі)

_____ **на II кв. або 6 мес. 2007 года**

Хатні адрас і тэлефон _____ (індэкс) _____

Удачы ў розыгрышы!

Ф.СП-1 Міністэрства сувязі Рэспублікі Беларусь

АБАНЕМЕНТ на газету **ЗВЯЗДА** з бясплатнымі ўкладкамі: «ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

(індэкс выдання) _____ Колькасць камплектаў _____

на 2007 год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Куды _____ (паштовы індэкс) _____ (адрас)

Каму _____ (прозвішча, ініцыялы)

ДАСТАВАЧНАЯ КАРТКА на газету **ЗВЯЗДА** з бясплатнымі ўкладкамі: (індэкс выдання) _____

«ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

ПВ _____ месца _____ літар _____

Кошт: падпіскі _____ руб. Колькасць камплектаў _____

пераадрасоўкі _____ руб.

на 2007 год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Куды _____ (паштовы індэкс) _____ (адрас)

Каму _____ (прозвішча, ініцыялы)

Крымінал

1,7 МЛРД ЗАРОБЛЕНЫ НЕЗАКОННА...

Трое дзялкоў добра папрацавалі на Віцебшчыне, за адзін год атрымаўшы істотны даход — 1,7 мільярда рублёў. Ды вось загвоздка — грошы імі зароблены незаконна.

Як паведамілі карэспандэнту «Звязды» ў прэс-службе Камітэта дзяржкантролю, «бізнэсмен» з Гарадоцкага раёна, аб'яднаўшыся яшчэ з двума прадпрымальнымі асобамі, набывалі ў Расіі нехарчовыя спіртазмяшчальныя растворы, а рэалізоўвалі іх у Віцебскай вобласці. Функцыянавала гэта «лавачка» з лістапада 2004 года па лістапад пазамінулага. Цяпер жа ў адносінах да «мільярдэраў» упраўленнем Дэпартамента фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржкантролю па Віцебскай вобласці ўзбуджна крымінальная справа.

А вось упраўленнем Дэпартамента фінансавых расследаванняў КДК па Брэсцкай вобласці ўзбуджана крымінальная справа ў адносінах да дырэктара таварыства «Еўрашкло». Падазраецца кіраўнік у тым, што не маючы спецыяльнага дазволу (ліцэнзіі), ён у сакавіку — верасні мінулага года арганізаваў дзейнасць прадпрыемства па вытворчасці шкляной трубкі з выкарыстаннем шклаварнай печы, у выніку чаго прадпрыемствам атрыманы даход у 1,7 мільярда рублёў.

Ігар ГРЫШЫН.

МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

21 сакавіка 2007 г. № 12 (66)

КАМАНДЗІРОЎКА ПА ПІСЬМУ

«НЕПАПУЛЯРНЫЯ» МЕРЫ

Часта падставай для скаргаў вяскоўцаў становяцца менавіта яны

З пісьмамі-скаргамі, якія прыходзяць у газету без подпісу, рэдакцыя мае права працаваць па свайму меркаванню — скажам, прыняць да ведама і... адправіць у архіў. Але зварот, падпісаны «жыхарамі вёскі Цеплень» (без прозвішчаў), прымусіў не толькі азнаёміцца з выкладзенымі на паперы прэтэнзіямі, але і тэрмінова выехаць у камандзіроўку.

«Да вас звяртаюцца жыхары вуліцы Кастрычніцкая, што ў в. Цеплень Уздзенскага раёна Мінскай вобласці.

Мы вельмі радаваліся, калі было адноўлена вулічнае асвятленне. Гэта шмат значыць для састарэлых людзей у сельскай мясцовасці. Але старшыня нашага сельскага Савета Эва Станіслававўна Ключэня выклікала з раёна службу электрасетак і дала ім распараджэнне зняць ліхтары з нашай вуліцы, дзе жывуць адны пенсіянеры, пакінуўшы толькі два — у сярэдзіне і ў канцы вуліцы. Мы звярнуліся да старшыні сельскага Савета з пытаннем: чаму менавіта на нашай вуліцы знялі ліхтары, а не там, дзе жыве яна сама ці маладыя сем'і. Яна адказала, што на асвятленне не хапае грошай, якія неабходны ёй на іншыя патрэбы (пытанне толькі, на якія). Мы разумеем, што дзяржава наша не вельмі багатая, трэба эканоміць. Але не за наш кошт вырашаць гэтыя пытанні.

Крыўдна, што мы ўсё жыццё і здароўе аддалі калгасу, узнімалі яго пасля вайны, недасыпалі, недаядалі, а цяпер назіраем такія адносіны... Ці гэта помста некаму з нас?

Мы хоць і старыя людзі, але газеты чытаем, тэлевізар глядзім і слухаем радыё. Вельмі часта там гавораць пра адраджэнне вёскі, выкананне сацыяльных стандартаў. А якое гэта адраджэнне, калі лазня не працуе ўжо некалькі гадоў (у новых дамах ёсць і вада, і каналізацыя, а нам і памыцца няма дзе), вуліцы ад снегу не расчышчаюцца, ды яшчэ і святло адключылі...

Наша гаспадарка змянілася ў лепшы бок пасля таго, як яе прыняло ЗАТ «Вітэкс». І вялікае дзякуй яго кіраўніку за тое, што ні ў чым не адмаўляе пенсіянерам... А старшыня сельскага Савета нічога не робіць, яе працы не бачна зусім... На ўсе просьбы ў яе адзін адказ: «Няма грошай!» Людзі баяцца ісці да яе, баяцца адкрыта сказаць пра яе работу, бо не будзе ім потым жыцця... Няўжо кіраўніцтва раёна нічога не бачыць?..»

У цэнтры сталічнай вобласці — вёска без святла, без лазні, зімой занесеная снегам?.. Ды яшчэ — са старшынёй Савета, да якога страшна падысці? Нічога сабе, заяўкі. Каменны век.

На ўсякі выпадак пацікавілася па тэлефону ў Эвы Ключэні (старшыні Савета, аб якой ішла размова ў пісьме), ці ходзіць да Цеплені аўтобус. А то, можа, як у тым анекдоце: тры дні на аленях?

«Ну што вы, у нас добрыя транспартныя зносіны са сталіцай. І дарога цудоўная, і прыпыначныя пункты ўсе пазначаны, і ўказальнікі на месцы — так што не заблудзіцеся», — сказала яна.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

ІДУЦЬ ЛЮДЗІ ДА АНЮШКІ

Ганна Сінкевіч, жыхарка вёскі Мінакі Карэліцкага раёна Гродзенскай вобласці, даўно на пенсіі. Але не той характар мае, каб сядзець склаўшы рукі. Бо рукі гэтыя звыклыя да працы амаль з маленства. Ужо ў чатырнаццаць гадоў пачала працаваць у калгасе. Гэта былі нялёгкія часіны. Даводзілася амаль задарма з дня ў дзень цягнуць лямку сялянскай працы.

Але ж перажылося тое ліхалецце, і ваеннае таксама. Нарадзіла і выгадавала чацвярых дзяцей. Цяпер яны дарослыя. Маюць свае сем'і і сваіх дзетак. Восем унукаў з радасцю наведваюць сваю мілую, такую маладую душой бабулю. Да Ганны Васільеўны цягнуцца душой і аднавяскоўцы. Ведаюць і паважаюць яе людзі нават з навакольных вёсак. Таму, натуральна, як толькі стаў прыжывацца ў нас інстытут вясковых старастаў, жыхары родных Мінакоў і суседніх Раманоў выбралі яе. Цэняць і шануюць людзі Ганну Васільеўну за шчырасць, мудрасць, уменне слухаць і чуць іншага. А яшчэ Ганна Сінкевіч з'яўляецца загадчыцай вясковага Дому сацыяльных паслуг. Невялічкае, утульнае, цёпла натопленае памяшканне стала, дзякуючы гэтай абаяльнай, заўсёды з усмешкай і аптымізмам жанчыне своеасаблівым цэнтрам прыцягнення. Ідуць людзі «да Анюшкі», так ласкава называюць яе вяскоўцы, хто — купіць таблеткі ці іншыя лекі, хто — узяць пачытаць кнігу (ёсць тут невялікая бібліятэка), а хто і проста пагаварыць, падзяліцца свае-імі праблемамі, горам і радасцю з уважлівым і чулым чалавекам. Ганна Васільеўна і крывяны ціск зможа памераць, і мудрую параду дасць наконт лячэння народнымі сродкамі.

А калі спатрэбіцца дапамога мясцовай гаспадарцы, брыгадзір у першую чаргу звяртаецца да старасты. Яна ж — да сваіх бабулек-пенсіянерак: «Бабачкі мае, любачкі, трэба дапамагчы бульбу перабраць». І ёй нікто не адмовіць.

Марыя ЖЫЛІНСКАЯ, Фота аўтара.

БОЛЬШ МАГЧЫМАСЦЯЎ — БОЛЬШ АДКАЗНАСЦІ

У Віцебскай вобласці падчас мінулых выбараў у мясцовыя Саветы дэпутатаў чарговага склікання былі створаны 215 органаў так званага «пярвічнага ўзроўню» ўлады. Якія праблемы на сёння хвалююць іх кіраўнікоў? Ці складзены рабочыя планы на перспектыву? Што павінна вырашацца ў першую чаргу? Аб гэтым наш карэспандэнт пагутарыў са старшынямі сельскіх Саветаў Віцебшчыны.

Марыя АЛЯХНОВІЧ, старшыня Карабкоўскага сельскага Савета дэпутатаў Глыбоцкага раёна:

— Згодна са словамі старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцоваму самакіраванню Анатоля Малафеева, які сказаў, што «прыйшоў час прызнаць, што мы — улада, таму неабходна патрабаваць дапамогі на розных узроўнях, не баяцца нічога, калі робіцца гэта не для сабе, а для справы».

На тэрыторыі нашага сельсавета знаходзяцца 36 населеных пунктаў і жывуць больш за 4 тысячы чалавек. Больш за палову з 15 дэпутатаў у сельскім Савеце працуюць не першы раз, маюць добры вопыт у вырашэнні праблем выбаршчыкаў. Дзякуючы стабільнаму фінансаванню адпаведнай праграмы, дамы, дзе ніхто даўно не жыве, разбураем, наводзім парадак у цэлым. Але ж грошай усё роўна не хапае. Таму арганізуем санітарныя дні, суботнікі, месячнікі.

Валянціна СНАПКОВА, старшыня Слаўнаўскага сельскага Савета дэпутатаў Талачынскага раёна:

— Вялікую ўвагу надаём падтрымцы падсобных гаспадарак. На жаль, у апошні час у вёсцы гэты занятак не такі прыцягальны, як калісьці. Зараз у сельскіх магазінах шырокі выбар як малочных, так і мясных прадуктаў. Маладыя сем'і не спяшаюцца заводзіць скаціну. Каб зацікавіць іх, мы арганізавалі конкурс на лепшы маладзёжны падворак; па ўмовах конкурсу наяўнасць падсобнай гаспадаркі — абавязковая. Гэта акцыя будзе працягвацца.

Каб стымуляваць прыватных гаспадароў, шмат зрабілі для забеспячэння бесперабойнага закупу малака: калі ў 2001 годзе ў разліку на адну карову закупілі трохі больш за 600 літраў, то летась — больш за 1940, і тлустасць малака павысілася. За здадзенае малако людзі атрымліваюць грошы літаральна на даму. Дрэнна, што няма льгот на закуп малака. А быў час, калі калгасам плацілі надбаўкі за такую справу. Чаму б не аднавіць такі механізм?

Што датычыцца дапамогі па вядзенню спраў у прыватных падсобных гаспадарках, стварэнню камунальных прадпрыемстваў — няма ў нас навяснога абсталявання, таму пакуль што аказваем толькі транспартныя паслугі. Маем патрэбу і ў тэхніцы для работы на сметніках: неабходны бульдозер і пагрузчык.

Алена УРБАН, старшыня Сар'янскага сельскага Савета дэпутатаў Верхнядзвінскага раёна:

— Сярод 19 населеных пунктаў нашага сельсавета, дзе жывуць усяго 1,5 тысячы чалавек, кожны трэці — пенсіянер. 15 вёсак — аддаленыя!

Каб такія «далёкія» людзі не былі пазбаўлены ўвагі прадстаўнічай улады, спецыяльна прыязджаем і ходзім па дварах... Абавязкова падчас такіх нашых «рэйдаў» да вяскоўцаў ідуць страхавы агент, участковы, загадчык ФАПа. Яны цікавяцца праблемамі, адразу высвятляюць, чым могуць дапамагчы.

Аляксандр АПАНАСЁНАК, старшыня Альшанскага сельскага Савета дэпутатаў Чашніцкага раёна:

— Мы добра разумеем, што будучыня вёскі — моладзь, таму практыкуем замацоўванне маладых рабочых і спецыялістаў за больш вопытнымі супрацоўнікамі, якія ва ўсім ім дапамагаюць.

Пры гэтым не забываем на старых. У нас 20 ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, 8 інвалідаў, 9 членаў сем'яў удзельнікаў вайны, дзве сотні адзінокіх і адзінока пражываючых пенсіянераў. Стараемся зрабіць многае, каб кожны з іх адчуваў клопат.

Людміла ЯБЛОНСКАЯ, старшыня Гарбачэўскага сельскага Савета дэпутатаў Расонскага раёна:

— Я ўжо чацвёрты год працую. І ні адной скаргі «наверх» на дзейнасць Савета за гэты час не было. Канешне, можна шмат гаварыць аб тым, як мы клапоцімся аб вырашэнні праблем выбаршчыкаў. Але ж адсутнасць незадаволеных — галоўны паказчык.

Мы паставілі работу наступным чынам. Штомесяц падводзім вынікі нашай работы, якой дае ацэнку раённы Савет. Усё неабходнае, што трэба зрабіць для паляпшэння жыцця людзей, «здаём на прыёмку» спецыялістам райвыканкама, кожны з якіх адказвае за канкрэтны накірунак. Камісію ўзначальвае асабіста старшыня райвыканкама.

Дарэчы, на ўзроўні раённай улады створана «гарачая лінія», на якую са сваімі праблемамі можа звярнуцца кожны жыхар. І калі будзе скарга з боку нашых выбаршчыкаў — гэта ўжо «мінус» у рабоце Савета. Значыць, мы недапрацавалі, забыліся на просьбу канкрэтнага чалавека.

* * *

Нядаўна прызначаны на пасаду памочніка Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь — галоўнага інспектара па Віцебскай вобласці Леанід Крупец, звяртаючыся да кіраўнікоў структур мясцовай улады, шчыра адзначыў, што такі перадавы вопыт Расоншчыны трэба распаўсюджваць па ўсёй краіне. Паводле яго слоў, у іншых рэгіёнах пакуль што недапрацоўваюць у рабоце са зваротамі людзей. Летась у цэлым колькасць скаргаў з раёна на адрас вышэйшых структур улады рэспублікі павялічылася прыкладна на 17,5 працэнта. Многія пытанні маглі б быць вырашаны ў абласцях, дзе жывуць грамадзяне, незадаволеныя бяздзеяннем мясцовых кіраўнікоў.

Старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў Аляксандр Ацясаў лічыць, што ў апошнія некалькі гадоў дзякуючы адпаведным указам Прэзідэнта праблем у кіраўнікоў Саветаў становіцца менеш. У прыватнасці, вырашаюцца многія пытанні: на баланс дарожных арганізацый перадаюцца дарогі ў сельскіх населеных пунктах, калі раней водаправод і шчыліны былі «безгаспадарчымі», цяпер яны пераходзяць пад адказнасць адпаведных арганізацый, паступова вырашаюцца праблемы з асвятленнем і іншыя. На думку Аляксандра Ацясава, магчымасці ў гэтым плане дае Указ Прэзідэнта № 21 «Аб павышэнні ролі органаў мясцовага кіравання і самакіравання ў вырашэнні пытанняў жыццезабеспячэння насельніцтва», які быў зацверджаны ў сярэдзіне студзеня гэтага года.

Ад імя выбаршчыкаў хочацца дадаць: галоўнае, каб прадстаўнікі органаў улады, якім мы аказалі свой давер падчас мінулых выбараў, не забылі на свае абяцанні і пастараліся адпрацаваць на «ўсе 100».

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ШАНЦ ДЛЯ ВЯРТАННЯ... «ГАСТАРБАЙТЭРА»

Сёння афіцыйны ўзровень беспрацоўя па Чавускаму раёну — ніжэй, чым па вобласці ці па краіне ў цэлым. Разам з тым сама па сабе сітуацыя на мясцовым рынку працы не падаецца такой адназначнай. Сельгасвытворчасць, бюджэтныя арганізацыі, лясгас і чатыры невялікія прамысловыя прадпрыемствы — вось, напэўна, і ўсе тэарэтычныя варыянты працаўладкавання...

Адлегласць ад Чавусаў да Магілёва складае ўсяго чатыры дзесяткі кіламетраў. Прычым менавіта гэтая акалічнасць аказалася шмат у чым вырашальнай. Абласны цэнтр традыцыйна лічыўся больш перспектыўнай «пляцоўкай» для буйных інвестыцый і стварэння новых вытворчасцяў. І з улікам гэтага ў раёне перакананы — ці не адзінай надзеяй для мясцовай эканомікі становяцца прыватныя ўкладанні.

Зараз ужо вызначана дзесяць канкрэтных праектаў па развіццю малога і сярэдняга бізнэсу. Праектаў самых розных. Ад адкрыцця крамаў і прыдарожнага кафэ да арганізацыі базы адпачынку і пітомніка па вырошчванню саджанцаў. Але ці не галоўнае тое, што тут існуюць планы па стварэнню новых прадпрыемстваў, якія, як чакаецца, зоймуцца вытворчасцю паліўнага брыкету, нестандартнага абсталявання па вытворчасці другаснай сыравіны, а таксама ПЭТ-бутэлек пад напоі. Прычым цікава: укласці грошы ў мясцовую эканоміку выказалі жаданне не толькі жыхары Чавускага раёна. Апроч іх, зрабіць гэта гатовыя магіляўчане, маладзечанцы, лепельцы.

— Чым буйнейшы населены пункт, тым большая насычанасць рынку тавараў і паслуг, — кажа начальнік аддзела эканомікі Чавускага райвыканкама Ірына Лосева. — Першымі гэта зразумелі прадпрымальнікі-мінчане, якія ў свой час «пайшлі» ў навакольныя раёны. А потым іх прыкладам пачалі ўсё больш актыўна карыстацца прадстаўнікі бізнэсу з іншых гарадоў. Бо зноў-такі: у невялікіх раёнах значна меншая канкурэнцыя, а значыць, тут нашмат прасцей заняць сваю «нішу».

«Свае» прадпрымальнікі ёсць у раёне і зараз. Прыватныя цырульні, майстэрні па рамонту абутку і нават таксоўкі — усё гэта сталася рэаліямі. Аднак нельга не адзначыць, што практычна тры чвэрці цяперашніх прыватнікаў працуюць строга ў адным напрамку — гандлі. У той жа час сфера вытворчасці засталася практычна па-за ўвагай. І адна з па-сапраўднаму важкіх прычын тут — рэальныя магчымасці саміх «індывідуалаў».

— Зразумела, што разлічваць на стварэнне новых вытворчасцяў нельга без дапамогі непасрэдна прадпрымальнікам, — адзначае Ірына Лосева. — Так, згодна з рашэннем Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў, «індывідуалам» могуць прадастаўляцца пазыкі, адтэрміноўка ці растэрміноўка па выплаце падаткаў і збораў. А яшчэ не выключаецца верагоднасць таго, што гарантам па вяртанню банкаўскіх крэдытаў для юрыдычных асобаў і індывідуальных прадпрымальнікаў стане райвыканкам. Той жа райвыканкам бярэ на сябе абавязак вырашыць усе пытанні з выдзяленнем зямлі. Нарэшце, не будзем забывацца, што пры адкрыцці «сваёй справы», як правіла, гаворка ідзе аб стварэнні новых працоўных месцаў. Прычым сёлета на кожнае такое месца са сродкаў садзейнічання занятасці насельніцтва плануецца выдаткаваць беспрацэнтную пазыку на суму ў 9,3 млн рублёў. І да таго ж служба занятасці можа рэальна і цалкам бясплатна дапамагчы з прафесійнай падрыхтоўкай персаналу.

Па сутнасці для атрымання падтрымкі ёсць толькі адна ўмова — рэгістрацыя новай вытворчасці на тэрыторыі раёна. Гэта можа прынесці дадатковыя паступленні ў мясцовы бюджэт. Пашырэнне прыватнага бізнэсу павінна даць і іншыя перавагі. Да прыкладу, затрымаць моладзь. Першы крок тут ужо зроблены. У параўнанні з тымі ж магіляўчанамі чавусцы могуць карыстацца больш выгаднымі крэдытамі на будаўніцтва — пад 3 працэнты гадавых. Такім чынам, для многіх шанцы на ўласнае жыллё сталі рэальнымі. Аднак для спынення «міграцыі» ў абласны цэнтр не менш важная акалічнасць — добрая і высокааплатная работа. І ў тым ліку ў прыватнай сферы.

Між тым «прэстыжная работа» дазволіць вырашыць яшчэ адну па-сапраўднаму няпростую праблему — вяртання значнай часткі «гастарбайтэраў». Сёння ў раёне занята каля 9 тысяч чалавек. Аднак ў той жа час каля тысячы мясцовых жыхароў маюць сталы заробак у Расіі. У сваю чаргу гэта, адзначае Ірына Лосева, адчувальна б'е па эканоміцы ў цэлым, а таксама вядзе да разбурэння... значнай колькасці сем'яў.

Сяргей ГРЫБ.

Чавускі раён.

ЗЯМЛЯ І ЛЮДЗІ МІНШЧЫНЫ

ХТО КАЗАЎ, ШТО БУДЗЕ ЛЁГКА?

Інвестар дае «дабро»

Уладзіміру Філіповічу 24 гады. Пасля заканчэння каледжа хлопец уладкаваўся ў Мінску на завод Вавілава. Працаваў аператарам, аднак сталічнае жыццё не надта склалася — нявырашаныя жыллёвыя праблемы (без усялякіх перспектыў) ды і заробак так сабе, не надта высокі.

Калі з'явілася вартая прапанова аб новым месцы працы, то Уладзімір амаль без роздуму «памяняў» завод на сельгаспрадпрыемства. «Сталіца мне не асабліва падабаецца, — кажа Філіповіч, — у вёсцы ўсё ж лепш жыць — неяк нават утульней, ды і родныя побач». Зараз хлопец працуе токарам у філіяле «Слаўнафта-Агра», зарабляе някепска, ды і жыллё хутка пабяцалі выдзеліць...

Старшыня гаспадаркі Сяргей КУЛАГІН.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Старшыня ў трэцім пакаленні

У Мінскім раёне былі рэфармаваны пяць стратных гаспадарак. Адно з такіх сельгаспрадпрыемстваў — саўгас «Савецкі». Ён быў утвораны ў 1966 годзе на базе саўгаса «Рогаўскі». У свой час «Савецкі» быў адметнай гаспадаркай — спецыялізаваўся на вытворчасці ялавічыны, малака, бульбы і збожжавых культур. Гэта было даволі вялікае аграпрамысловае прадпрыемства, аднак напрыканцы 1990-х гадоў справы тут не заладзіліся. Факт застаецца фактам — былы саўгас-мільянер апынуўся на мяжы банкруцтва і ператварыўся ў «аўтсайдара». Як узгадваюць мясцовыя жыхары, кіраўнікі ў гаспадарцы мяняліся адзін за адным, раслі даўгі, «згортваліся» аб'ёмы вытворчасці... Карацей кажучы, здавалася, што перспектыў няма ніякіх і на «Савецкім» можна паставіць «крыж». У адраджэнне гаспадаркі ўжо мала хто верыў. Аднак змены да лепшага, на шчасце, усё ж адбыліся — летам 2004 года маёмасны комплекс саўгаса набыло сумеснае прадпрыемства ЗАТ «Слаўнафта-Старт». Тады ж быў утвораны адпаведны філіял «Слаўнафта-Агра». За няпоўныя тры гады гаспадарка не толькі выйшла з заняпаду, а і стала адным з сапраўдных лідараў сельгасвытворчасці ў раёне і на абласным узроўні.

На тэрыторыі філіяла «Слаўнафта-Агра» размешчаны тры дзесяткі вёсак, цэнтральная сядзіба — у Шаршунах. Яна знаходзіцца дзесьці за сорак кіламетраў ад Мінска, на такой жа адлегласці адсюль і некалькі райцэнтраў — Маладзечна, Лагойск. Атрымліваецца, што тутэйшыя мясціны быццам «схаваліся», сюды рэдка хто і даязджаў. Цяперашні кіраўнік гаспадаркі Сяргей Кулагін, хоць і працаваў дагэтуль у Мінскім раёне, але ўпершыню патрапіў у Шаршуны толькі падчас рэфармавання гаспадаркі. Пачынаць было вельмі цяжка, аднак, у рэшце рэшт, удалося зрабіць заўважны крок наперад.

— Я старшыня ў трэцім пакаленні, — кажа Кулагін, — яшчэ дзед займаўся сельскай гаспадаркай. Мне прыйшлося ў 27 гадоў узначаліць гаспадарку ў Мсціслаўскім раёне, там спасцігаў свае «ўніверсітэты». Шэсць гадоў адпрацаваў у вядомым агракамбінаце «Ждановічы». Так што вопыт вядзення сельскагаспадарчай вытворчасці маю нядрэнны, прыйшоў сюды з жаданнем усё давесці да ладу. Сітуацыя тут была складаная, але не безвыходная, на зямлі можна і трэба працаваць. Неабходна прыкласці намаганні і ўкласці сродкі. У нашым выпадку гэтыя ўмовы былі выкананы, таму і вынікі не прымусілі сябе чакаць.

Рызыкоўны бізнэс

Адразу пасля выкупу быў распрацаваны падрабязны бізнэс-план, дзе пралічаны магчымыя перспектывы развіцця філіяла. Усе грошы, якія выдаткоўваюцца, павінны прыносіць аддачу — у гэтым увесь сэнс дзеянняў новых гаспадароў. Мяркуючы па тых кроках, якія былі зроблены дзеля «рэанімацыі» стратнага сельгаспрадпрыемства, можна з упэўненасцю казаць аб тым, што інвестар прыйшоў усур'ёз і надоўга. Праграма рэфармавання прадумана да дробязяў і паступальна ўвасабляецца ў жыццё.

Усяго на развіццё філіяла выдаткаваны значныя сродкі — каля 28 мільярдаў рублёў. Такія інвестыцыі дазволілі вывесці вытворчасць на сучасны ўзровень, многія паказчыкі ўзраслі ў некалькі разоў. Гэта даказвае адно: грошы былі ўкладзены з розумам, па-гаспадарску.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

ДОБРЫЯ СПРАВЫ — У ПАДАРУНАК МАГІЛЁВУ

У Магілёве разгарнуўся агульнагарадскі рух «740 добрых спраў», прымеркаваны да юбілею горада. Менавіта столькі гадоў сёлета спаўняецца абласному цэнтру, які вядзе сваю гісторыю з 1267 года.

Рашэнне аб такой акцыі прыняў прэзідыум Магілёўскага гарадскога Савета дэпутатаў.

— Канешне, яно мае характар рэкамендацыі, — пракаментаваў старшыня гарсавета Валерый Свістуноў. — Аднак чаму б гараджанам і не зрабіць добрыя справы для роднага і любімага горада, які святкуе юбілей? Мы спадзяёмся, што ў акцыі прымуць актыўны ўдзел органы самакіравання: дамавыя і вулічныя камітэты, саветы гарадскіх мікразон.

— Канешне, мяркуецца, што большасць добрых спраў — гэта суботнікі і іншыя мерапрыемствы па добраўпарадкаванню горада, — падкрэсліў намеснік начальніка аддзела па ідэалагічнай рабоце гарвыканкама Уладзімір Цярэшчанка. — У руху «740 добрых спраў» бяруць удзел усе: ад дзяцей да пенсіянераў. Нехта напіша верш альбо намалюе карціну, іншы прывядзе двор у парадак ці дапаможа інвалідам... Усё, што заўгодна!

Гарадскія ўлады вырашылі не весці ўлік, бо гэта не конкурс. Ну як спаборнічаць у добрых справах? Ініцыятары гэтага руху ўпэўнены, што магіляўчане насамрэч зробяць добрых спраў болей, чым 740. Тым больш радасным будзе святкаванне юбілею, якое пройдзе 28 чэрвеня — у дзень вызвалення Магілёва ад фашысцкіх захопнікаў.

Алена КАЗЛОВА.

ВЯЛІКАЯ БУДУЧЫНЯ МАЛЫХ ГАРАДОЎ

На Віцебшчыне 40 пасёлкаў і гарадоў з колькасцю насельніцтва меней за 50 тысяч чалавек пачынаюць ствараць новыя рабочыя месцы, развіваць турызм. Паводле слоў старшыні Віцебскага аблвыканкама Уладзіміра Андрэйчанкі, на працягу пяцігодкі менавіта стварэнне і ўзмацненне вытворчасці павінна быць галоўным пры рэалізацыі праграмы адраджэння такіх населеных пунктаў.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Вось, напрыклад, пасёлак Бігосава ў Верхнядзвінскім раёне з насельніцтвам каля 2 тысяч чалавек. Амаль кожны трэці працаздольны працуе на прадпрыемстве «Інвет». Яно адкрылася больш за 45 гадоў таму і ў савецкія гады спецыялізавалася на вырабе інструментаў і прыстасаванняў для ветэрынарыі і зоаінжынерыі. Вядома, былі такія не толькі ў СССР. Цяпер тут прыблізна 200 найменняў «тавараў»: вырабы з пластмасы, вёдры і нават паркаль. З апошніх навінак — боксы, дзе ўтрымліваюцца цяляты. Улічваючы высокія тэмпы развіцця жывёлагадоўлі, яны вельмі неабходны і гаспадаркам, і фермерам, але ж патэнцыйным пакупнікам не вельмі падабаецца высокая цана гэтых канструкцый. Гэта праблема, безумоўна, павінна вырашацца, і прадпрыемству паабяцалі дзяржаўны заказ на недарагія, але якасныя боксы.

У развіцці такіх прадпрыемстваў вельмі зацікаўлены мясцовыя ўлады, бо большасць падаткаў, згодна з дзяржаўнымі прэферэнцыямі, застанецца ў гарадах і пасёлках, дзе яны пабудаваны.

У Барані, што пад Оршай, да 2010 года запланавалі адкрыць філіял віцебскага прыватнага прадпрыемства па вырабу фірменнай блізны, а яшчэ мадэрнізаваць знакамітае прадпрыемства «Лёс», што спецыялізуецца на радыёэлектроніцы. Менавіта ў Барані ствараюцца ўчасткі па вырабу кабін для колавых цягачоў, што робяць у Мінску.

У райцэнтры Бешанковічы павінна адкрыцца прадпрыемства па вырабу металізаванай паперы, будуць павялічаны і магутнасці прадпрыемства «Белкатламаш». У Ветрыне створаць завод па вырабу сучаснага будаўнічага матэрыялу — палісіролу. У Лепелі «Віцебскхлебпрам» на плошчах свайго філіяла, якія сёння не выкарыстоўваюцца, пачне перапрацоўку пладоў і ягад.

Сярод малых пасёлкаў і гарадоў нямала і такіх, што могуць ператварыцца ў турыстычныя цэнтры. На іх тэрыторыі шмат унікальных месцаў для адпачынку, помнікаў даўніны. Апошнія ўжо аднаўляюцца, а для турыстаў будуць пабудаваны гатэлі, кемпінгі і г.д. Дарэчы, турыстычная галіна ў апошні час вельмі прыцягальная і для замежных інвестараў. У прыватнасці, шведы не толькі падрабязна вывучаюць існуючыя турыстычныя маршруты і дапамагаюць ствараць новыя — міжнародныя, а і ўкладаюць сродкі (ужо 100 тысяч еўра) у стварэнне турыстычнай інфраструктуры ў Глыбоцкім раёне. Вельмі зацікавіла іх возера Шо, што некаторыя даследчыкі лічаць цэнтрам Еўропы.

Да 2010 года ў малых гарадах і пасёлках Віцебскай вобласці запланавана стварыць каля 16 тысяч новых рабочых месцаў, а ўсяго — 82 тысячы. Афіцыйны ўзровень беспрацоўя будзе зніжаны да 1 працэнта. Кіраўніцтва вобласці ўпэўнена, што нашы грамадзяне, якія працуюць далёка за межамі рэгіёна — у асноўным у Расіі, павінны быць задзейнічаны на месцы. Калі будзе ў родным альбо суседнім пасёлку праца, за якую плацяць дастойна, навошта кудысьці ехаць? Дадайце сюды новае жыллё з усімі выгодамі ды развітую сацыяльную інфраструктуру. Жыццё «ў правінцыі» можа быць не горшым, чым у вялікіх гарадах, дзе і іншых праблем шмат, а сродкаў і магчымасцяў для іх вырашэння часта не хапае.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

«НЕПАПУЛЯРНЫЯ» МЕРЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

...І сапраўды — у Цеплень прыехала па заасфальтаванай дарозе, з якой ужо амаль сышоў снег. Пільна ўглядаючыся ў навакольле, спрабавала выхапіць вокам сляды запусцення ці нядбайнасці. Але позірк упарта спыняўся то на прыгожа пафарбаваных пабудовах, то на акуратна спілаваных дрэвах, то на чыстых падворках...

Эва Станіславаўна Ключэня разам са старшынёй Уздзенскага раённага Савета дэпутатаў Міхаілам Міхайлавічам Лапоткам чакала ў кабінеце. «Пытайцеся пра ўсё, што вас цікавіць. Толькі, калі можна, хутчэй, — папрасіла яна. — Вельмі многа работы».

Са зместам пісьма старшыня, як аказалася, знаёмая — аналагічныя пасланні атрымалі рэдакцыі і іншых выданняў. Сам факт звароту людзей у газету Эву Станіславаўну не здзівіў.

— Ведаеце, псіхалогія некаторых вяскоўцаў практычна не змянілася з тых, савецкіх, часоў. Ім хочацца, каб каля кожнага дома гарэў ліхтар, каб гаспадарка ці сельскі Савет аказвалі ім бясплатныя сельскагаспадарчыя паслугі, каб ледзь ці не ў кожнай вёсцы былі свая школа і свой дзіцячы садок... Мы і так пастараліся захаваць сацыяльную сферу наколькі гэта магчыма, дзякуючы ў першую чаргу ЗАТ «Вітэкс», якое далучыла да сябе былую гаспадарку — СВК «Цеплень». Прывялі ў парадак кантору, сталовую, Дом культуры, магазін, комплекснапрыёмны пункт... І хіба мне не хочацца, каб вуліцы Цеплені былі асветлены, як у горадзе? Але не ўсё ў маіх сілах... Існуюць адзіныя дзяржаўныя сацыяльныя стандарты — мінімальныя гарантыі, якія дзяржава павінна прадаставіць насельніцтву. Для горада яны — адны, для раённага цэнтра — другія, для вёскі — трэція. Акрамя гэтага, мы атрымалі рэкамендацыі Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, дзе ў мэтах эканоміі прапануецца больш ашчадна падысці да расходавання электраэнергіі, скараціць колькасць ліхтароў, — гаворыць Эва Ключэня.

У сувязі з атрыманымі рэкамендацыямі Цеплень (як і іншыя вёскі раёна) будзе асвятляцца наступным чынам: ліхтары застануцца ў пачатку і канцы вуліцы, а таксама на перакрыжаваннях вуліц, ля адміністрацыйных будынкаў, магазіна, клуба... Цэнтральную вуліцу плануецца асвятляць крыху лепш — гэта «твар» вёскі, ды і рух транспарту па ёй больш актыўны. Схемы асвятлення распрацаваны разам з раённымі электрасеткамі літаральна для кожнага населенага пункта — адпаведна са стандартамі і новымі патрабаваннямі ў плане эканоміі.

— Сёлета нашаму сельсавету выдзелілі на добраўпарадкаванне ўсяго 5700 тысяч рублёў, куды ўвайшлі і затраты на асвятленне. На гэту суму, як вы разумееце, не разгонішся, — гаворыць Эва Ключэня. — Ды нам не прывыкаць, былі і горшыя часы. Але я старалася настройваць людзей аптымістычна: выйсце з сітуацыі заўсёды знойдзецца.

Як размеркаваць «вялікія» грошы, вызначалі на сесіі. Паглядзелі, колькі ў мінулым годзе пайшло на асвятленне — 7 млн рублёў. Вывад напрошваўся сам: многа! Трэба эканоміць, каб яшчэ і на добраўпарадкаванне засталося, і на спілоўванне аварыйных дрэў...

— Выдзеленыя грошы можна «спаліць» за 2—3 месяцы, а потым паставіць пытанне перад райвыканкамам: маўляў, дапамажыце, сродкаў няма. І восенню, калі рана вечарэе, сядзець у цемры, — гаворыць Міхаіл Лапотка. — Але сесія сельскага Савета вырашыла інакш: часова, да восені, увогуле адключыць вулічнае святло. А зэканомленыя грошы накіраваць на ўстаноўку спецыяльнага рэле часу, якое можна будзе запраграмаваць на той ці іншы «графік» работы вулічнага асвятлення. Дарэчы, рашэнне аб неабходнасці ўстаноўкі рэле часу было прынята на ўзроўні вобласці — яны з'явяцца на падстанцыях у тых населеных пунктах, дзе налічваецца не менш за 50 двароў. Гэта правільнае рашэнне, дзякуючы яго рэалізацыі мы спынім расходаванне лішняй электраэнергіі.

Праблемы ў сувязі з адключэннем святла, лічыць Міхаіл Міхайлавіч, калі і ўзнікнуць, то невялікія і не надоўга. Напрыклад, тых жа даярак з сельскагаспадарчага кааператыва ЗАТ «Вітэкс», у якіх спецыфічны графік

> Старшыні Савета часта даводзіцца патрабаваць. А гэта не кожнаму падабаецца

работы, на ферму заўсёды падвозяць, чаго няма ні ў адной іншай гаспадарцы раёна.

Цепленьскі сельсавет невялікі нават у сваім, сельсавецкім, вымярэнні. Магчыма, за сваёй маланаселенасці вёску не ўключылі ў план будаўніцтва аграгарадкоў. Але наперакор афіцыйным планам Эва Ключэня вырашыла, што аграгарадок у Цеплені будзе. Нямала не зусім такі, як паказваюць па тэлебачанню, і ўсё ж лепшы, прыгажэйшы за звычайную вёску.

— А грошы? — задаю ўжо класічнае для такіх выпадкаў пытанне.

Грошы, запэўніла яна, будуць. Адкуль? Пасля рэфармавання СВК «Цеплень» і далучэння яго да ЗАТ «Вітэкс» прайшло 2,5 года. А па закону, на працягу трох гадоў «Вітэкс» павінен выплаціць грошы за набытыя ім сродкі вытворчасці былога СВК. Мінскі аблвыканкам прыняў рашэнне накіраваць гэтыя сродкі ў Цепленьскі сельсавет.

— З генеральным дырэктарам ЗАТ «Вітэкс» Віктарам Аляксеевічам Цярэшчанкам мы неаднойчы гаварылі аб тым, як добраўпарадкаваць Цеплень, як зрабіць так, каб людзям тут падабалася жыць... Рэфармаваная гаспадарка развіваецца, з'явіліся працоўныя месцы, а разам з імі і перспектывы. Вёска ажыла, і цяпер наша задача — зрабіць яе прыгожай і ўтульнай, — расказвае Эва Станіславаўна.

Пад будучыя грошы ўжо запрошаны архітэктар, які зробіць перапланіроўку цэнтра сельсавета: тут з'явяцца клумбы, новыя агароджы, альпійскія горкі, тратуарная плітка... На якія яшчэ патрэбы неабходна патраціць грошы (а сума не «завоблачная», усяго 80 мільёнаў), будзе вырашаць агульны сход. Але ўжо сёння відавочна, што пайсці яны павінны на добраўпарадкаванне, а таксама давядзенне да ладу водаачышчальных збудаванняў, якія яшчэ не перададзены на баланс жыллёва-камунальнай гаспадаркі раёна.

— Перадаць — не праблема, — лічыць Эва Ключэня, — але няхай лепш сістэма водазабеспячэння і водаачышчэння знаходзіцца ў нармальным стане. Бо ў ЖКГ сёння таксама лішніх грошай няма. Вырашым праблему з ачысткай вады — і будзем жыць спакойна.

А што з лазняй, якая на сёння сапраўды не працуе? Гэта праблема ўзнімалася ў пісьме як адна з галоўных.

Міхаіл Лапотка адказаў на пытанне дастаткова катэгарычна:

— Давайце падлічым: сёлета Цепленьскаму сельсавету выдзелілі 5700 тысяч рублёў — з улікам, як мы ўжо гаварылі, аплаты за асвятленне. Ну, давайце адключым святло, забудзем на рэле часу, на аварыйныя дрэвы, на добраўпарадкаванне вуліц, і кінем усе сродкі на лазню — ёй жа не толькі рамонт патрэбны, але і штатная адзінка, і дровы... Але ж мы знайшлі выйсце са становішча.

Генеральны дырэктар ЗАТ «Вітэкс» Віктар Цярэшчанка сам прапанаваў мясцовай уладзе «вывучыць праблему» і вызначыць, колькі чалавек мае патрэбу ў паслугах лазні. Аказалася, усяго... 8. Усе астатнія маюць або ўласныя лазні, або ванныя. Рамантаваць грамадскую лазню пры такім раскладзе эканамічна немэтазгодна — затраты ніколі не акупяцца.

Тым больш, як аказалася, і патрэбы такой няма. На тэрыторыі майстэрняў сельскагаспадарчага кааператыва ЗАТ «Вітэкс» (а гэта практычна ў Цеплені) ёсць свая лазня — і вельмі прыстойная, ёй могуць пазайздросціць нават гарадскія жыхары. Гендырэктар «Вітэкса» даў асабісты дазвол на наведванне лазні жыхарамі Цеплені, і ніякіх праблем тут узнікнуць не павінна. А Міхаіл Лапотка даручыў старшыні сельскага Савета прасачыць, каб каля ўваходу ў лазню з'явілася шыльдачка з раскладам работы для цепленьцаў і коштам паслуг.

Разам з Эвай Ключэняй і Міхаілам Лапоткам праехалі па Цеплені, зазірнулі ва ўсе «куткі» — на ферму, у сельскагаспадарчыя майстэрні, у адрамантаваную сталовую, у пашывачны цэх (там мясцовыя дзяўчаты шыюць прыгожыя фірменныя сумачкі для касметыкі «Вітэкс»), у новую кацельню... Са старой кацельняй, дарэчы, была «эпапея» — бясконцыя прарывы вады і затапленні, вечныя пагрозы выхаду катла са строю... А ў колішняй гаспадаркі, якая сама ледзь зводзіла канцы з канцамі, нават інжынера не было... Колькі разоў даводзілася Эве Станіславаўне ўзнімаць сярод ночы на ногі раённае начальства, шукаць спецыялістаў, каб ліквідаваць прарыў, захаваць ваду і цяпло... Стаяла сама над трубамі, пакуль іх заварвалі, над катламі, пакуль іх запускалі... Год таму памяшканні старой школы вырашылі прадаць «Вітэксу», які за гэта пабудаваў новую кацельню. А дзяцей перавялі ў новую школу, што ў Дзешчанцы...

Сёння кацельня працуе без збояў, дзяцей арганізавана падвозяць на заняткі ў Дзешчанку, а ў старым будынку школы поўным ходам ідзе рамонт — тут пачалі працаваць швейныя майстэрні «Вітэкса».

Хоць, канешне, і гэта рашэнне старшыні Савета камусьці падаецца «непапулярным» — маўляў, старая школа хоць і напаўразваленая была, і пажарная служба ўвесь час на яе наракала, ды ўсё ж размяшчалася яна пад бокам...

Ёй часта даводзіцца патрабаваць, асабліва ў апошні час: ад арганізацый, ад вышэйстаячых інстанцый, ад людзей... У першую чаргу — ад людзей. Каб наводзілі парадак, не ленаваліся працаваць, не пілі, не брыдкасловілі, выхоўвалі дзяцей... А гэта не кожнаму падабаецца — могуць кінуць услед: «Табе плацяць, ты і наводзь парадак!» Некаторыя, не дабіўшыся хуткага вырашэння праблемы, зрываюцца на крык: «Нічога не робіш, месца праседжваеш!».

Старшыня Цепленьскага сельскага Савета ў «крытычнай» сітуацыі стараецца паводзіць сябе спакойна і стрымана — за 12 гадоў «старшынёўскай» працы прызвычаілася да ўсяго. Але не страціла веру ў тое, што з любой сітуацыі заўсёды знойдзецца выйсце. Галоўнае, не баяцца прымаць рашэнні, нават «непапулярныя».

Наталля КАРПЕНКА.

Уздзенскі р-н.

ХТО КАЗАЎ, ШТО БУДЗЕ ЛЁГКА?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

— Змены, якія адбыліся ў гэтым сельгаспрадпрыемстве пасля рэфармавання, сапраўды ўражваюць, — адзначае першы намеснік начальніка ўпраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання Мінскага райвыканкама Сяргей Серы. — Я сам працаваў кіраўніком гаспадаркі і ведаю, што дасягнуць такога ўзроўню даволі не проста. Інвестары паводзяць сябе як сапраўдныя гаспадары на зямлі — гэта вельмі важна. Сельская гаспадарка — не тая галіна, дзе можна хутка вярнуць грошы і зарабіць «дывідэнды», гэта даволі рызыкоўны бізнэс. У такой сітуацыі вельмі важна, калі інвестар разумее гэтую акалічнасць і не імкнецца нейкім чынам «зэканоміць» ва ўрон справе.

Тутэйшая глеба не надта ўрадлівая, таму асноўная стаўка робіцца на развіццё жывёлагадоўлі, «магістральны» накірунак — вытворчасць свініны. Гэтае мяса найбольш запатрабаванае на рынку, таму, як лічыць Сяргей Кулагін, праблем з яго рэалізацыяй не ўзнікне, прынамсі, у бліжэйшай перспектыве. Зроблена грунтоўная рэканструкцыя свінакомплексу, многія памяшканні давялося адбудоўваць наноў. Праведзены рамонт і на жывёлагадоўчых фермах, установлена сучаснае абсталяванне. Увогуле, як адзначыў Сяргей Кулагін, няма ніводнага вытворчага памяшкання, дзе б не прыйшлося нешта аднаўляць.

У гаспадарцы імкнуцца да таго, каб увасабляўся замкнёны цыкл «вытворчасць—перапрацоўка—рэалізацыя». Як апраўдана лічаць тут, толькі ў такім выпадку магчыма атрымаць максімальны эканамічны эфект. Зараз малочны цэх філіяла перапрацоўвае за змену тры тоны малака. Абсталяванне найноўшае, тэхналагічны працэс поўнасцю аўтаматызаваны. Кантроль за якасцю наладжаны жорстка: працуюць хімічная і мікрабіялагічная лабараторыі. Прычым апошняя з'явілася адносна нядаўна, паколькі ў саўгасе яе ўвогуле не было. У цэху выпускаецца пастэрызаванае малако, масла і смятана. Усё робіцца на натуральнай аснове, што, дарэчы, ацанілі і спажыўцы — прадукцыя ад «Слаўнафты-Агра» пастаўляецца ў сталічныя крамы. Праўда, пашыраць асартымент выпуску (спачатку планавалі рабіць тварог і нават ёгурты) пакуль праблематычна, паколькі ўзнікаюць пытанні наконт рэалізацыі, бо рынак літаральна перапоўнены адпаведнай прадукцыяй і «прабіцца» даволі цяжка.

Кадры вырашаюць усё?

Моладзі ў гаспадарку прыйшло дастаткова, увогуле калектыў у большасці складаецца з прыезджых. Тутэйшых засталося не так ужо і шмат. Дарэчы, што цікава, штат работнікаў значна павялічыўся: калі раней працавала 132 чалавекі, то зараз — каля 300. Такім чынам, не толькі павялічыліся аб'ёмы вытворчасці, а і з'явіліся новыя працоўныя месцы. Для вёскі такая прапанова сапраўды вельмі заманлівая. Мяркуйце самі: за мінулы год сярэдні заробак у філіяле склаў 576 тысяч рублёў.

Андрэй Дзеравінскі працуе ў гаспадарцы з 1976 года, таму можа параўноўваць. Раней, кажа, і па паўгода заробак не аддавалі, нават не ведаў чалавек, за які месяц атрымлівае. А зараз — ніякіх праблем, затрымак з выплатамі ніколі не было. Змяніліся і ўмовы працы: на мехдвары ёсць гардэроб, душ, пабудавалі цудоўную сталовую. Паўсюль наведзены проста ідэальны парадак, які пастаянна падтрымліваецца. Дысцыпліна тут — сапраўды норма жыцця, кожны адказвае за свой участак работы. Галоўныя спецыялісты з'яўляюцца своеасаблівымі генеральнымі дырэктарамі адпаведных вытворчых накірункаў, прычым кожны з іх нясе ў тым ліку і матэрыяльную адказнасць за вынікі працы. Патрабаванні вельмі жорсткія, але справядлівыя. Шмат хто не вытрымаў такіх умоў і пайшоў у пошуках «лепшага хлеба».

— А хто казаў, што лёгка і проста будзе? — кажа Сяргей Кулагін. — На зямлі працаваць трэба, здараецца, што і ад цямна да цямна. Але ж у людзей і выхадныя ёсць, і водпуск па графіку — ніхто не пакрыўджаны. Жыллё будуем і набываем для работнікаў, праўда, засяляем пасля пэўнага выпрабавальнага тэрміну. Вырашэнню сацыяльных пытанняў надаём вялікую ўвагу, бо ўсе ўкладанні ў чалавека заўсёды апраўданыя.

Мікалай ЛІТВІНАЎ.

Мінскі раён.

СПРАВЫ СЕЛЬСАВЕЦКІЯ

ШТО «ТАК» І ШТО «НЕ ТАК»

Я прыехаў у Шарпілаўку, што ў Гомельскім раёне, раніцай, калі яшчэ не было васьмі гадзін. Віктар Горленка, старшыня Савета, ужо знаходзіўся ў сваім рабочым кабінеце — разбіраў паперы. Толькі пачалі гутарыць, як у дзверы пастукаў першы наведвальнік, пенсіянер Міхаіл Холупаў. Жыве мужчына адзін у сваёй хаце, куды часта прыязджае яго далёкі родзіч Ягор Міхайлаў. Міхайлаў летам ездзіць у Расію на заробкі, а на зіму вяртаецца ў сваю вёску і... налягае на спіртное.

Калі яно заканчваецца, ідзе да суседзяў і патрабуе, каб яго кармілі і паілі. Міхаіл Ільіч як чалавек спагадлівы адносіўся да Ягора, як кажуць, з разуменнем, дапамагаў як мог. А што ў адказ? Лаянка ды пагрозы. А нядаўна той запатрабаваў у Міхаіла Ільіча грошы. А калі пенсіянер адмовіў, Ягор разбіў шкло ў акне. Вось і прыйшоў Холупаў даведацца ў старшыні сельскага Савета, што рабіць далей.

— І многа ў вас такіх, як Міхайлаў? — запытаўся я.

— Ды некалькі чалавек. Маюцца таксама і сем'і, дзе няма парадку, дзе бацькі дрэнны прыклад сваім дзецям паказваюць. Праводзім з такімі прафілактычную работу. Зрухі ёсць, але напарадзе яшчэ шмат работы — паспрабуй, напрыклад, выправіць таго ж Ігара Заіку, які за крадзеж тройчы пазбаўляўся волі.

...Яўген Калоша з пасёлка Міхайлаўск прыйшоў на прыём да старшыні Савета з іншай праблемай. Пакуль ён быў на заробках у Маскоўскай вобласці, згарэў дом яго маці і ў агні загінуў брат. У попел ператварылася шмат рэчаў, у тым ліку і некаторыя дакументы Яўгена. Зараз ён рыхтуецца ехаць у Буда-Кашалёўскі раён на пастаянную работу, вось і зайшоў у сельскі Савет, каб параіцца, як хутчэй аднавіць тыя дакументы.

Да Віктара Іванавіча ў той дзень людзі звярталіся па самых розных пытаннях (адных цікавіла адводка зямельных участкаў у палях севазвароту, другіх — знос пустуючых хат, трэціх — ці будзе сёлета працаваць пастаянны пастух для кароў вяскоўцаў і г.д.). І кожнаму старшыня даваў канкрэтны адказ, што цалкам заканамерна. Бо ён — мясцовая ўлада, якая бліжэй да людзей за ўсе іншыя інстанцыі.

> Пры разумным карыстанні ўладай можна і сёння многага дасягнуць.

Шарпілаўскі сельскі Савет — гэта сем населеных пунктаў, у якіх прапісана 820 чалавек, ды чалавек трыста яшчэ ездзяць сюды на работу. Ёсць тут сярэдняя школа, пошта, Дом культуры, дзіцячы санаторый «Верасок», лясніцтва, магазін, аддзяленне КСУ-Па «Міжрэчча». І ўсюды старшыні трэба пабываць, каб быць у курсе спраў. Раней з гэтым было цяжэй, бо да таго ж пасёлка Войціна — 27 кіламетраў. Зараз стала непараўнальна лягчэй, бо Шарпілаўскаму Савету выдзелілі легкавушку. Ды і афармленне дакументаў значна спрасцілася, бо ў выканкаме з'явіўся камп'ютар. Толькі працуй...

Увогуле, пры разумным карыстанні ўладай можна і сёння многага дасягнуць. У магазіне ў Шарпілаўцы не было добрага падсобнага памяшкання, даводзілася трымаць там і гаспадарчыя тавары, і харчовыя побач. Некалькі разоў Віктар Іванавіч ставіў гэта пытанне перад раённым спажывецкім таварыствам, наведваўся да старшыні райвыканкама Уладзіміра Маёрава, і дабіўся свайго: да магазіна зрабілі прыбудову.

Або яшчэ. Іншым разам у вясновую паводку ў Шарпілаўцы падтоплівала восем дамаўладанняў. Людзям — куды? Да Горленкі. А той — у райвыканкам, які ўрэшце выдзеліў сто мільёнаў рублёў для выканання работ па водапаніжэнню і арганізацыі паверхневага сцёку вод. Праектна-каштарысную дакументацыю, вядома ж, заказваў сельскі Савет.

Клопатаў Віктару Іванавічу хапіла і тады, калі ў вёсцы праводзілі прыродны газ, будавалі школу, калі ўзяліся за навядзенне парадку і г.д. Шарпілаўка — вялікі населены пункт. Вуліца Савецкая, напрыклад, расцягнулася на тры кіламетры, і хто-нікто выкідваў (такая ўжо завядзёнка была) смецце і розныя бытавыя адходы куды давядзецца. Работнікам сельсавета давялося «ваяваць» з такімі. І адначасова дабівацца таго, каб каля дамоў на вуліцах не складзіравалі дровы, сена і г.д.

А як атрымалася з фельчарска-акушэрскім пунктам? Памяшканне яго было малое, а людзі настойвалі на тым, каб адкрыць у ім фізіятэрапеўтычны кабінет. Дык давайце рабіць справу разам, сказаў ім на сходзе Віктар Іванавіч, метадам народнай будоўлі, талакой. Вось так за паўтара года і з'явіўся трохсценак 6х5,5 метра. А шыфер і цэглу купілі за кошт сельсавета.

Прыгадваючы гэты факт, Віктар Іванавіч уздыхае, бо зараз няма ў ФАПе медработніка. Прышлюць сюды маладога спецыяліста, а той праз два гады ходу назад. Крыўдна, што жыллё для яго маецца — катэдж з усімі камунальнымі выгодамі, а вось ва ўпраўленні аховы здароўя ніяк не падбяруць чалавека, які б асеў у вёсцы. Таму Горленка кожны тыдзень і тэлефануе ў раён. І, мяркую, даб'ецца свайго.

Віктару Іванавічу хацелася б яшчэ, каб пры Савеце было створана малое ўнітарнае прадпрыемства. Неабходнасць у ім ёсць таму што КСУП «Міжрэчча» — гаспадарка слабая і незаўсёды ў стане дапамагчы насельніцтву прывезці дровы, апрацаваць прысядзібныя ўчасткі, нарыхтаваць кармы і г.д. Да таго ж, у вёсцы няма і комплекснага пункта бытавых паслуг...

За два месяцы сельвыканкам атрымаў ажно 32 паперы з указаннем зрабіць тое ці гэта, даць справаздачу і г.д.

— Разумею, што яны патрэбны. Але іншым разам здзіўляешся залішнім патрабаванням «інстанцый». Напрыклад, вось папера па стварэнню органаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання. Дык там патрабуюць для іх рэгістрацыі скласці спіс удзельнікаў сходу з указаннем прозвішча, імя і імя па бацьку, года нараджэння. А навошта гэта? І колькі часу і паперы трэба патраціць сельвыканкаму, каб зрабіць такую справаздачу? Вось і прыходзіш да высновы, што тут нешта не так...

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

ЯК ЗРАБІЦЬ СНЯДАНАК ТАННЫМ?

Усё працоўнае жыццё Марыі Міхайлаўны Белавежа было звязана з сельскай гаспадаркай. Каб хто ёй сказаў яшчэ гадоў дзесяць таму, што вылучаць яе старшынёй сельскага Савета, не паверыла б. Зараз Марыя Міхайлаўна ўпэўнена, што гэта яе месца. І людзі так лічаць. Адзін са старэйшых жыхароў сельсавета 82-гадовы Рыгор Максімавіч Бондзіч сказаў мне па сакрэту: «Такога старшыні ў нас яшчэ не было».

Сама яна лічыць гэту ацэнку перабольшанай. Кажа, проста выбар быў невялікі. Вось і прыехаў да яе тагачасны старшыня Пінскага райвыканкама Вячаслаў Сашко з прапановай. І амаль з парога спытаў, ці ёсць правы на кіраванне машынай. Адказала, што мае... толькі на трактар. «Дык хіба табе бульдозер даць?» — змрочна пажартаваў кіраўнік раёна. Але яна запэўніла ў тым, што праз колькі месяцаў вадзіцельскае пасведчанне будзе ў кішэні.

Без машыны тут проста як без рук. У сельсавеце 11 вёсак. Каб і вельмі хацеў, за тыдзень нават не абыдзеш. А трэба ж не проста абысці — з людзьмі пагаварыць, высветліць, каму чым дапамагчы, якія праблемы вырашыць.

Зараз ва ўсіх населеных пунктах сельсавета жыве 27 адзіноких састарэлых людзей. Тыя, у каго няма дзяцей і родных, патрабуюць асаблівай увагі. Нядаўна ў Марыі Фёдараўны Ярамчук прыйшла ў непрыгоднасць печка. Яе нават распальваць стала небяспечна. Давялося неадкладна рамантаваць... Падобных прыкладаў набярэцца нямала. У аднаго праводку трэба паднавіць, другому калодзеж пачысціць. З пачатку года склалі спіс усіх просьбаў, пажаданняў і разгледзелі яго на першым пасяджэнні сельскага выканкама. Членам выканкама з'яўляецца старшыня СВК «Ахова» Васіль Багатка. Параіліся і прыйшлі да высновы, што ўсе заяўкі адзінокіх людзей да канца года трэба задаволіць.

Не толькі пажылыя людзі, але і самае маладое пакаленне — клопат старшыні Ахоўскага сельскага Савета. Справа ў тым, што абодва дзіцячыя садкі ў Ахове і Кашавічах знаходзяцца на яго балансе. Зараз існуе тэндэнцыя перадаваць такія ўстановы аддзелам адукацыі, амаль паўсюдна так і зроблена. А вось у Ахове пакуль садкі застаюцца мясцовымі. У адным з іх выхоўваецца 30 дзяцей, у другім — 32. Арганізаваць харчаванне дзяцей, рамонт, добраўпарадкаванне тэрыторыі дзіцячых устаноў — усё гэта справа мясцовай улады. Грошы на харчаванне выхаванцаў дашкольных устаноў закладваюцца ў бюджэт. Але, як паказала практыка, сродкаў на год не хапае. Даводзіцца шукаць спосабы, як зрабіць сняданкі, абеды і вячэры для малых больш таннымі. Адзін з такіх шляхоў — нарыхтоўка бульбы і агародніны. Летась работнікі садкоў і сельсавета працавалі на ўборцы бульбы ў сваім СВК і атрымалі столькі, што хопіць на цэлы год. Гэтак жа было і з агародніной. Раз-пораз на харчаванне пералічваюцца грошы з эканоміі, са свабодных сродкаў сельсавета. Таму і спяшалася Марыя Міхайлаўна падчас нашай сустрэчы паспець у казначэйства — зрабіць неабходныя плацяжы.

У яе такі стыль работы — усё рабіць хутка, дакладна. Нават у кабінеце старшыні ніякіх лішніх рэчаў няма, толькі тое, што неабходна для работы. А ў кабінеце яна і не заседжваецца. На балансе сельсавета яшчэ два Дамы культуры, Дом народнай творчасці. Марыя Міхайлаўна гаворыць, што іх мясцовасць — край народных умельцаў. Вёска Ганчары так называецца, бо ў ёй здаўна выраблялі гліняны посуд. А ў Кашавічах што ні жыхарка, то майстар вышыўкі. З-пад іголкі Ганны Оец выходзяць сапраўдныя шэдэўры. Не раз яе вышыванкі бралі на розныя выставы і на падарункі гасцям Піншчыны. Міхаіл Баравік робіць скрынкі-камоды, падобных да якіх няма нідзе ва ўсёй акрузе. Дом народнай творчасці, дзе ладзяцца выставы майстроў, дзе праводзяцца розныя мерапрыемствы, патрабуе ацяплення, рамонту, догляду. І пра гэта галава баліць найперш у старшыні Савета. Марыя Белавежа лічыць, калі ўжо ёсць у вёсцы «ачаг» культуры, то павінен ён быць узорам культуры. Недапушчальна, каб ля такіх устаноў быў непарадак.

Як і ў вёсках у цэлым, у Ахоўскім сельсавеце жыхары не выносяць смецце да машын жыллёва-камунальнай службы. Тут праблему вырашылі інакш. Устанавілі стацыянарныя кантэйнеры. Пляцоўкі для металічных скрынь з накрыўкамі агароджаны і заасфальтаваны. Усё разам з кантэйнерам пафарбавана ў адзін колер, таму агульнага выгляду гэтыя збудаванні ніяк не псуюць. А машыны прыходзяць у зручны для камунальнікаў час і забіраюць бытавыя адходы. Летась, паводле слоў старшыні сельскага Савета, ім пашанцавала. — Ахова было выбрана месцам правядзення раённага семінара па добраўпарадкаванню. Пад гэта мерапрыемства крыху грошай выдзелілі. Таму многае ўдалося зрабіць у цэнтры вёскі: і абеліск загінулым аднавіць, і Дом культуры да ладу давесці, і цэнтральную плошчу заасфальтаваць...

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Пінскі раён.

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:

САВЕТ РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ,

ПАЛАТА ПРАДСТАЎНІКОЎ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ,

УСТАНОВА «РЭДАКЦЫЯ ГАЗЕТЫ «ЗВЯЗДА»

ГРАМАДСКІ САВЕТ:

МАЛАФЕЕЎ А. А., старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцоваму самакіраванню;

САСОНКА М. П., старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўнаму будаўніцтву, мясцоваму самакіраванню і рэгламенту;

СЯЛІЦКІ В. С., старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў;

СІВАКОЎ В. А., старшыня Аршанскага гарадскога Савета дэпутатаў;

ЯРКОВІЧ В. І., старшыня Круглянскага сельскага Савета Магілёўскай вобласці.

АДКАЗНАЯ ЗА ВЫПУСК: Наталля КАРПЕНКА.

Кантактны тэлефон 292-21-03.

КУПІ ЛЕПШАЕ!

ТАВАРЫ ПАСЛУГІ ЦЭНЫ

Выпуск № 3 (15)

ВЫБРАЎ ТАВАР — ПРАСАЧЫ НА КАСЕ, ЗА ШТО І КОЛЬКІ ПЛАЦІШ...

Летась у Беларускае таварыства абароны спажыўцоў і яго арганізацыйныя структуры звярнуліся па дапамогу больш за 30 тысяч чалавек, у тым ліку 6674 спажыўцы патэлефанавалі на яго «гарачую» лінію. З дапамогай спецыялістаў таварыства на карысць спажыўцоў было спагнана матэрыяльнай шкоды больш за 935 мільёнаў рублёў (не ўключаючы кошту тавару) і маральнай шкоды — больш за 21 мільён рублёў. Штрафы ў даход дзяржавы перавысілі летась 98 мільёнаў рублёў.

— На жаль, я вымушаны канстатаваць, што за 18 гадоў сваёй дзейнасці наша невялікая арганізацыя (105 работнікаў у 48 аддзяленнях па краіне) так і не змагла фінансава ўстаць на ногі, — дзеліцца набалелым намеснік старшыні Беларускага таварыства абароны спажыўцоў Тамара БЕЛЬСКАЯ. — І мы не можам сёння разгарнуць у поўнай меры работу па многіх важных напрамках. Напрыклад, у Беларусі дастаткова праблематычна правесці многія віды экспертыз. Нягледзячы на вялікую колькасць камерцыйных арганізацый, якія атрымлівалі адпаведныя ліцэнзіі, практычна нельга знайсці спецыялістаў па мабільных тэлефонах і лічбавай тэхніцы, якія маглі даць кваліфікаванае заключэнне. Акрамя таго, у нас даволі праблематычна правесці экспертызу імпартных аўтамабіляў у тых выпадках, калі выходзіць са строю адна з самых дарагіх дэталяў — рухавік. Нават Інстытут судовых экспертыз не валодае для гэтага неабходнай матэрыяльна-тэхнічнай базай і тэхнічнай дакументацыяй на імпартныя рухавікі. І нам нічога не застаецца як звяртацца да дылераў, пасля чаго мы вельмі часта атрымліваем заключэнне з фармулёўкай «вызначыць прычыну не ўяўляецца магчымым».

У апошнія гады беларускія спажыўцы ўсё часцей сталі трапляць у новыя «пасткі». Адна з іх — гэта Інтэрнэт-магазіны. Мы неаднойчы сутыкаліся з праблемай пошуку прадаўцоў. Вельмі часта пакупнік, які набывае тавары праз Інтэрнэт, атрымлівае на рукі так званы гарантыйны талон з пячаткай «гарантыйнае абслугоўванне» ці «для дакументаў». Але там не пазначана, хто гэты тавар прадаў. Толькі ўказаныя нумары мабільных тэлефонаў. Нумары і сапраўды адпавядаюць тым, што змяшчаюцца на Інтэрнэт-сайце магазіна. Спрабуем з дапамогай міліцыі ўстанавіць, хто з'яўляецца іх уладальнікам. Высвятляецца, што тэлефон зарэгістраваны на нейкага Іванова, Пятрова, Сідарава, які ніколі не рэгістраваўся ў якасці індывідуальнага прадпрымальніка. Або дадзены нумар існуе, але той, за кім ён зарэгістраваны, даўным-даўно ім не карыстаўся.

Яшчэ адно праблемнае поле для тых, хто займаецца абаронай спажыўцоў — гэта рэалізацыя на тэрыторыі Беларусі аўтамабіляў вялікамерных замежных марак. Пакрыўджаны спажывец прыходзіць на прыём да юрыстаў таварыства абароны спажыўцоў і прыносіць з сабой дагавор, з якога вынікае, што прадаўцом з'яўляецца, для прыкладу, прадстаўнік карпарацыі N... па ўсходняму рэгіёну. Пакупка здзяйсняецца на тэрыторыі Беларусі, але грошы пакупніка аўтаматычна пераводзяцца ў Швецыю, Францыю, Германію і г.д.

— Але ні са Швецыяй, ні з Францыяй, ні з Германіяй у Беларусі не заключаны дагаворы аб прававой дапамозе па грамадзянскіх, сямейных і крымінальных справах, што робіць беларускіх спажыўцоў абсалютна неабароненымі, — тлумачыць Тамара Бельская. — Спажывец, безумоўна, можа звярнуцца з прэтэнзіяй ці рашэннем суда ў аўтасалон, які займаецца рэалізацыяй імпартных аўтамабіляў. Але замежная фірма можа праігнараваць рашэнне беларускага суда, яно не з'яўляецца для замежнікаў абавязковым для выканання. Такім чынам, заяўляючы ў інтарэсах спажыўца прэтэнзію, нам застаецца спадзявацца толькі на добрую волю нашага апанента. У Еўропе, дарэчы, арганізацыі па абароне спажыўцоў карыстаюцца сур'ёзным аўтарытэтам і павагай. І мы вымушаны чакаць — пойдуць нам насустрач ці ўвогуле нас не заўважаць. А звяртацца самастойна з іскам у суд на тэрыторыі замежнай дзяржавы фінансавыя абставіны беларускім спажыўцам не дазволяць.

Тамара Бельская абураецца тым, што нашы спажыўцы вельмі рэдка цікавяцца дакументамі, пад якімі ставяць свой подпіс, і прыводзіць у якасці прыкладу выпадак з жанчынай, якая заказала кухню, але выкананы заказ яе катэгарычна не задаволіў. Кухню прывезлі, «але не тую», што чакала заказчыца. Вельмі доўга высвятлялі, а што, уласна кажучы, яна чакала, але жанчына не магла нічога толкам патлумачыць. У лаканічным дагаворы з выканаўцам былі пазначаны толькі кухня і яе цана, і больш ніякай карыснай інфармацыі. Між іншым, кухня была зусім нятанная. І ўсё ж такі ўдалося ўстанавіць, што кліентка заказала кухонны гарнітур з дарагімі фасадамі, а ёй прывезлі танны гарнітур — звычайнае спрасаванае пілавінне.

Каб не патрапіць у такія непрыемныя сітуацыі, Тамара Бельская настойліва раіць: перш чым уступіць у здзелку, уважліва прачытайце дакумент, і ў тым выпадку, калі дакумент падаецца не зусім зразумелым, ні ў якім разе яго не падпісвайце.

— Маё асабістае перакананне заключаецца ў тым, што нават празмерная колькасць кантралюючых органаў і арганізацый, якія займаюцца абаронай спажыўцоў, не ў стане змяніць кардынальным чынам абстаноўку на рынку тавараў і паслуг, пакуль спажыўцы не пачнуць самастойна клапаціцца пра свае эканамічныя інтарэсы, — тлумачыць яна сваю пазіцыю. — Калі спажывец не бярэ ў прадаўца чэк, а потым спрабуе яго знайсці па прынцыпу «купіў у таго, за тым вуглом», то ніякі кантралёр і ніякі адвакат не змогуць абараніць правы спажыўца пры такіх умовах. Сапраўды, не ў кожнага прадаўца можа быць касавы апарат. Але «бярыце чэк» — гэта, так бы мовіць, агульная фраза. Калі вы возьмеце ў прадаўца візітку, на якой будзе пазначана, скажам, «5 лютага 2007 года. Павільён «Свет моды-2». Гандлёвае месца № 49. Кажух. Кошт 1 млн 200 тыс. рублёў», гэтага будзе дастаткова для таго, каб абараніць вашы інтарэсы ў тым выпадку, калі пакупка акажацца няякаснай. Не палянуйцеся занатаваць прозвішча індывідуальнага прадпрымальніка — копія пасведчання аб рэгістрацыі ёсць на кожным гандлёвым месцы. Увогуле згодна з Законам «Аб абароне правоў спажыўцоў» для пацвярджэння факта куплі тавару могуць выкарыстоўвацца элементы ўпаковачнага матэрыялу ці тары, на якіх маюцца адзнакі, якія пацвярджаюць, што купля тавару ажыццяўлялася ў гэтага прадаўца, ці паказанні сведак.

З развіццём у краіне сеткі гіпермаркетаў і супермаркетаў акрэслілася новая праблема, якая пачынае гучаць усё больш настойліва — пакупнікоў уводзяць у зман, прадастаўляючы ім непраўдзівую інфармацыю аб кошце рэалізуемага тавару. Стаўка робіцца на тое, што ў гіпермаркеты пакупнік прыходзіць за мноствам пакупак, і ён не ў стане ўтрымаць у памяці ўсе цэннікі на тавары. А падчас разлікаў на касе тавары нечакана «даражэюць». Умоўна кажучы, на цэнніку быў указаны кошт 2 тысячы рублёў за адзінку, а на касе прабіваюць 3—4 тысячы рублёў.

Тамара Бельская падзялілася ўласным вопытам:

— У адным са сталічных універсамаў я купляла таматы па цане 6800 рублёў за кілаграм. Прадавец пачынае ўзважваць тавар па цане...11 тысяч рублёў. Я ўказваю яму на памылку. Уводзіцца іншы штрых-код і высвечваецца новая цана — 9 тысяч рублёў за кілаграм. У рэшце рэшт, я прашу ўвесці ўручную тую цану, што была заяўлена на цэнніку. Але вярнуўшыся праз паўгадзіны ў той жа магазін, я ўбачыла новы кошт — 7800 рублёў за кілаграм. Цікава, як на працягу ўсяго 30 хвілін тавар, які быў прадстаўлены для продажу ў гандлёвай зале, павысіўся ў цане? Пытанне з разраду рытарычных...

Ёсць яшчэ два прабелы ў заканадаўчых дакументах, якія не дазваляюць адстойваць інтарэсы беларускіх спажыўцоў. Напрыклад, калі кліент здае нейкую рэч у хімчыстку, у яго няма ніякай гарантыі якаснага выканання заказу. Дагавор з хімчысткай на аказанне паслугі дапускае, што плямы, якія хоча выдаліць кліент, могуць застацца. Але ў такім разе незразумела, за што плаціць кліент? Да таго ж дапускаецца ўсадка верхняга адзення аж да 8 працэнтаў! Такі стандарт спажыўца зусім не абараняе.

Пасля прыняцця летась Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 396, нарэшце, людзі, якія будуюць за ўласныя сродкі жыллё, аказаліся пад абаронай спажывецкага заканадаўства. Але адказнасць арганізацыі-выканаўцы, якая складае ўсяго адну тысячную працэнта за кожны дзень пратэрміноўкі, яўна мізэрная. Нават калі будаўніцтва зацягваецца на цэлы год, за гэты год «накапае» толькі 0,3 працэнта ад агульнага кошту жылля. Для выканаўцы гэта проста смешная сума...

Надзея НІКАЛАЕВА.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА

ПРЫЧОСКІ ДЛЯ АШМЯНСКІХ МОДНІЦ

Цырульнік чацвёртага разраду Кацярына Судніковіч шэсць гадоў працуе ў сферы абслугоўвання. Яна майстар-універсал. Вячэрнія, вясельныя, звычайныя стрыжкі і ўкладкі — любую прычоску Кацярына стварае з творчым падыходам, з добрым настроем.

НА ЗДЫМКУ: цырульнік Кацярына СУДНІКОВІЧ з пастаяннай кліенткай Вольгай КАВАЛЁНАК.

Знак бяспекі

Зусім верагодна, што сёлета будзе павялічаны пералік тавараў, якія ў абавязковым парадку падлягаюць маркіроўцы.

Пра гэта паведаміў падчас сустрэчы з журналістамі начальнік галоўнага ўпраўлення арганізацыі кантрольнай дзейнасці Міністэрства па падатках і зборах Беларусі Сяргей Каморны. Паводле яго слоў, галоўная мэта маркіроўкі тавараў — абарона бяспекі як асобных грамадзян, так і ўсёй дзяржавы. Бо не сакрэт, што сярод «шэрага імпарту» нярэдка трапляюць не проста нізкаякасныя, але і шкодныя для здароўя тавары і прадукты харчавання. Да таго ж, немалыя страты нясе і бюджэт краіны, паколькі «ценевікі» не плацяць падаткі. У прыватнасці, пасля ўкаранення маркіроўкі ў другім паўгоддзі мінулага года аб'ём паставак масла маторнага ўзрос у параўнанні з аналагічным перыядам 2005 года амаль на 23 працэнты, алею — на 41,5 працэнта, рыбных кансерваў — на 45,1 працэнта. Іншымі словамі, вялізная колькасць тавараў і прадуктаў харчавання фактычна была выведзена з нелегальнага абарачэння. Увогуле, паводле слоў Сяргея Каморнага, за кошт увядзення маркіроўкі толькі летась дадатковыя паступленні ў бюджэт у выглядзе падатковых плацяжоў склалі 2,9 мільярда рублёў. Таму практыка «маркіравання», хутчэй за ўсё, будзе прадоўжана.

Аднак якія канкрэтна тавары трапяць пад маркіроўку, прадстаўнік падаткавага ведамства не паведаміў. Сяргей Каморны толькі адзначыў на гэты конт, што крытэрый адбору застанецца ранейшым: абарона інтарэсаў грамадзян і бяспекі краіны.

Мікола ДЗЯБЁЛА.

Кватэрнае пытанне

НЕ БЫЛО Б ШЧАСЦЯ...

Наша сям'я жыве ў прыватызаванай двухпакаёвай кватэры. Зараз свякроў хоча падарыць мужу аднапакаёўку, якая ў сваю чаргу дасталася ёй у спадчыну ад бацькоў. Ці давядзецца нам плаціць якія-небудзь падаткі за другую кватэру?

Яніна Л., г. Мінск.

Як патлумачыў член праўлення грамадскага аб'яднання «Веды» В.В. Савіцкі, у адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь «Аб падатку на нерухомасць», калі ў грамадзяніна маецца ва ўласнасці дзве і больш кватэры, ён вызваляецца ад выплаты падатку толькі за адну. Пры гэтым, якое жылое памяшканне не будзе абкладацца падаткам, уладальнік жылля выбірае сам.

Падатак на нерухомасць спаганяецца ў памеры 0,1 працэнта ацэначнага кошту аб'екта нерухомасці. Канкрэтная велічыня падатку вызначаецца падатковым органам на падставе інфармацыі тэрытарыяльнай арганізацыі па дзяржаўнай рэгістрацыі нерухомай маёмасці і правоў на яе аб кошце жылога памяшкання. Падлік указанага падатку ажыццяўляецца падатковым органам па месцы знаходжання жылога памяшкання, якое абкладаецца падаткам.

Аб сумах падаткаў, якія падлягаюць выплаце ў бюджэт, падатковыя органы паведамляюць плацельшчыкам шляхам накіравання ім падатковых паведамленняў па ўстаноўленай форме.

Адзнака аб вызваленні ад платы падатку на нерухомасць па аднаму з прыналежных грамадзяніну жылых памяшканняў пазначаецца ў кнізе падатковага ўліку на падставе заявы адвольнай формы, якое падаецца грамадзянінам у падатковы орган. У такой заяве ўказваюцца звесткі аб месцазнаходжанні ўсіх жылых памяшканняў (кватэр, пакояў), якія належаць грамадзяніну на праве ўласнасці ў шматкватэрных дамах.

Падатак на нерухомасць падлягае выплаце ў тэрмін не пазней чым 15 лістапада (калі мясцовым Саветам дэпутатаў не ўстаноўлены іншы тэрмін платы). Неабходна таксама ўлічваць, што калі ў другой кватэры ніхто не будзе прапісаны або колькасць метраў будзе перавышаць устаноўленую норму агульнай плошчы, то плата за тэхнічнае абслугоўванне дома, ацяпленне і адлічэнні на капітальны рамонт дома будуць збірацца не па зацверджаных стаўках і тарыфах, а па нарматыўным сабекошце (гэта значыць, у значна большых памерах).

Як нас дураць

А шчасце было так блізка...

У кішэні аднаго гамяльчаніна-махляра апынулася адразу 28 тысяч «зялёных» і 1,6 тысячы еўра, чаму ён, вядома ж, узрадаваўся. І тут жа — шок, бо перад ім паўсталі супрацоўнікі Упраўлення камітэта дзяржбяспекі Рэспублікі Беларусь па Гомельскай вобласці: вы, шаноўны, атрымалі хабар.

Адмаўляцца не было як, бо махляр звёў у зман аднаго мясцовага прадпрымальніка, запэўніўшы яго ў тым, што ён будзе мець у горадзе зямельны ўчастак. На самай справе махляр не меў да таго ўчастка ніякага дачынення. У час вобыску ў кватэры затрыманага знойдзена 20 тысяч долараў і падробленае вадзіцельскае пасведчанне.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

Анонс

На кірмаш па сямейныя каштоўнасці

Сёлета 5-я перадвелікодная праваслаўная выстава-кірмаш супадае са школьнымі канікуламі і гэта добра, бо вялікая частка яе духоўна-асветніцкай праграмы («Сям'я — яднаннем і любоўю выратуемся») прысвечана дзецям, падлеткам і маладым людзям. Акрамя таго — бацькам, педагогам, людзям сямейным і тым, хто толькі збіраецца сям'ю стварыць.

Арганізатары пастараліся прадумаць работу выставы так, каб наведвальнікам было зручна арыентавацца і трапляць на тыя мерапрыемствы, якія іх цікавяць. Так, кожны дзень духоўна-асветніцкай праграмы падзелены на тры часткі.

З 12 да 14 гадзін у канферэнц-зале будуць дэманстравацца фільмы-прызёры трох Усесаюзных кінафестываляў кароткаметражных фільмаў «Сям'я Расіі». На адкрыцці паказу, у суботу 24 сакавіка а 13-й гадзіне, прэзідэнт кінафестывалю Галіна Аляксеева раскажа, як праз папулярызацыю традыцыйных сямейных каштоўнасцяў можна прадухіляць няшчасце ў сям'і.

У будныя дні а трэцяй гадзіне — час лекторыяў для моладзі. На сустрэчы прыйдуць святары (у панядзелак — яшчэ пісьменнік і кіраўнік літаратурнага аб'яднання «Духоўнае слова» Барыс Ганага), а заяўленыя тэмы цікавыя не толькі маладым: пра веру, сяброўства і любоў, жанчыну, шлюб і сям'ю, пра пераадоленне нарказалежнасці, моду і творчасць.

Вячэрнія гадзіны будуць пачынацца выступленнем калектыву-удзельніка‎ў І гарадскога фестывалю сучаснай хрысціянскай музыкі «Благавест». Потым — сустрэчы з цікавымі людзьмі, гутаркі, прэзентацыі і канцэрты. У пятніцу, 30 сакавіка, а 18-й гадзіне адбудзецца аўтарскі канцэрт паэтэсы і спявачкі Вольгі Патрый. У апошні дзень работы выставы, 31 сакавіка, а 16-й гадзіне кампазітар Вячаслаў Баб‎коў, дырэктар фестывалю «Благавест», прадставіць музычны дыск-эсе «Шчасце ў доме».

25 сакавіка а 14-й гадзіне выставу наведаюць ганаровыя госці: пасол Сербіі ў Рэспубліцы Беларусь Срэчка Джукіч і прафесар Іван Чарота. З іх удзелам пройдзе прэзентацыя першага рускамоўнага выдання кнігі прападобнага Іусціна (Попавіча) «Філасофія і рэлігія Ф.М. Дастаеўскага».

— Аўтар кнігі — сусветна вядомы сербскі багаслоў і філосаф, — расказаў «Звяздзе» перакладчык Іван Чарота. — У 90-х гадах, калі ўзяліся за ягоную спадчыну, абвясцілі 25-томны збор твораў. Але ў працэсе высветлілася, што трэба выдаць 40 тамоў. «Філасофія і рэлігія» была напісана ў 1918 годзе ў Кембрыджскім універсітэце — гэта адна з першых доктарскіх дысертацый па Дастаеўскаму, але з-за пазіцый, якія там былі выказаны ў адносінах да Захаду, яна не была прынята да абароны. Кніга ўбачыла свет ў 20-х гадах, але ніколі на рускую мову не перакладалася. Твор, безумоўна, будзе цікавы для філолагаў, багасловаў, і, думаю, для любога інтэлектуала.

Усё гэта — асаблівасці «Вербнага кірмашу-2007», разам з тым, як заўсёды, тут можна будзе набыць абразы, царкоўнае начынне, падарункі, сувеніры, кнігі, аўдыё- і відэапрадукцыю, паглядзець фотавыставу і паўдзельнічаць у майстар-класах па абрэзкаваму шыццю, пляценню з лазы, роспісу фарфору, разьбе па дрэву.

Штодня на выставе-кірмашы будзе працаваць «Дзіцячая гасцінная», на якой дзеці пад кіраўніцтвам вопытных педагогаў змогуць пагуляць, паглядзець фільмы, памаляваць, зрабіць велікодны падарунак для мамы і таты.

«Вербны кірмаш» адкрые дзверы з 24 па 31 сакавіка з 10 да 20 гадзін у Палацы мастацтваў па вул. Казлова, 3 у Мінску.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

«Еўрабачанне-2007»

З КАЛДУНА ЗРОБЯЦЬ ЦУКЕРКУ

І нават не адну. У дадатак да традыцыйнага прома-пакета (фота, відэа, музычныя і тэкставыя матэрыялы) беларуская дэлегацыя прадставіць у Хельсінкі сувенірны харчовы набор: двухпавярховую каробку цукерак «Сундук Калдуна» і алкагольныя напоі — бальзам і настойку на травах — з сімволікай «Еўрабачання» і выявай беларускага канкурсанта. Чакаецца, што ласункі «ад Калдуна», вырабленыя пры дапамозе кандытарскай фабрыкі «Камунарка» і вытворцы настойкі «Белавежская», будуць гатовыя да сярэдзіны красавіка. Прэзентаваць жа іх плануецца на беларускай вечарынцы ў Еўраклубе, якая, цалкам магчыма, будзе суменшай — беларуска-расійскай. Ва ўсякім разе, гэтае пытанне зараз абмяркоўваецца з прадстаўніком расійскага Першага канала Юрыем Аксютам.

Што ж датычыцца творчых пытанняў, то, паводле слоў намесніка старшыні БТРК Юрыя Азаронка, у Еўрапейскага вяшчальнага саюза няма прэтэнзій да беларускай песні і кліпа, «так што ўсе сенсацыі, якія гуляюць па беларускіх СМІ, можна лічыць вычарпанымі». Наш канкурсант зараз шчыльна рэпеціруе нумар — яго пастаноўка ў Хельсінкі будзе карэнным чынам адрозніваца ад таго, што было прадстаўлена ў прома-туры. Філіп Кіркораў прывёз з Масквы нейкую «магічную канструкцыю» ў стылі Дэвіда Капердфільда — магчыма, яна таксама будзе суправаджаць выступленне Калдуна на фінскай сцэне. Дарэчы, нават зала ў Хельсінкі, разлічаная на 9200 гледачоў, як быццам спецыяльна стылізавана пад «чараўніцтва» — яна імітуе падзямелле. Аднак радавацца рана, сцвярджае кіраўнік праекта «ЕўраФэст» Аляксандр Ціхановіч: «З кожным годам Беларусь выступае ўсё лепш. Аднак гэта ўсё ж конкурс, і конкурс адказны, і не трэба папярэдняга шапказакідальніцкага настрою, я вас вельмі прашу».

У фінскую сталіцу прадстаўнікі Беларусі — не больш як 25 чалавек у дэлегацыі, уключаючы артыстаў — прыбудуць 2 мая. А ўжо на наступны дзень адбудзецца першая рэпетыцыя. 9 і 12 мая пройдуць генеральныя рэпетыцыі паўфіналу і фіналу адпаведна. Ці акажацца чацвёрты парадкавы нумар шчаслівым для Беларусі — пакажа глядацкае галасаванне, у якім бяруць удзел усе 42 краіны — удзельніцы конкурсу. Дарэчы, сёлета, акрамя глядацкага, упершыню адбудзецца прафесійнае галасаванне кампазітараў — па яго выніках нават будзе ўручаны асобны прыз. Але пераможцу «Еўрабачання-2007» усё адно вызначаць гледачы. Для трыумфатара за кошт ЕВС, таксама ўпершыню ў практыцы конкурсу, прадугледжаны прома-тур па Еўропе — яго гатовы прыняць каля 10 краін, у тым ліку ўся «вялікая чацвёрка». А далей пачнецца падрыхтоўка да наступнага, 53-га па ліку «Еўрабачання». Ужо вядомыя арыенціровачныя тэрміны яго правядзення — 22—24 мая 2008 года.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

Самыя нізкія цэны на асноўныя прадукты харчавання ў лютым былі ў Клімавічах, Чавусах, Ашмянах і Горках

Сярэдняя цана па Беларусі на ялавічыну першай катэгорыі на канец лютага гэтага года складала Br7524 і вагалася ад Br5730—6500 у Пінску, Баранавічах, Лідзе да Br7700—9000 у Віцебску, Мазыры, Магілёве, Бабруйску, паведамілі ў Міністэрстве статыстыкі і аналізу. Верхнія і ніжнія межы цэн захаваліся на ўзроўні студзеня гэтага года, але сярэдняя цана на ялавічыну вырасла на Br256.

Сярэдняя цана на свініну па рэспубліцы ў лютым гэтага года складала Br7655. Самыя нізкія цэны на яе былі ў Верхнядзвінску, Рагачове, Шчучыне, Клімавічах і складалі Br6680—6880. У параўнанні са студзенем верхняя мяжа цэн павялічылася на Br190. Самая дарагая свініна ў лютым гэтага года прадавалася ў Бярозе, Наваполацку, Бабруйску. Жыхарам гэтых гарадоў давадзілася яе купляць па цане Br8050—9000 за 1 кг. Верхняя мяжа цэн знізілася на Br150.

Самыя нізкія цэны на свежую капусту ў студзені былі ў Століне, Магілёве, Горках, Клімавічах, Чавусах і складалі Br340—450 пры сярэдняй цане на яе ў рэспубліцы Br704. У студзені гэтага года сярэдняя цана на капусту была на Br104 таннейшай.

Самыя высокія цэны на капусту былі ў Брэсце, Пінску, Бярозе, Мінску, Салігорску, дзе яе прадавалі па Br740—900 за 1 кг. Верхняя мяжа цэн у параўнанні са студзенем выраслa на Br140.

Сярэдняя цана па рэспубліцы на рэпчатую цыбулю ў лютым складала Br1207. Самая танная цыбуля была ў Століне, Гомелі, Жыткавічах, Ашмянах, дзе яе можна было купіць па Br950—1020 за 1 кг. Цэны ў параўнанні са студзенем выраслі на Br30—90. Найбольш высокія цэны на цыбулю ў лютым былі ў Оршы, Наваполацку, Гродне, Шчучыне, Мінску, Салігорску; тут цыбулю прадавалі па Br1240—1330. Гэта на Br50 даражэй, чым у студзені.

Кошт бульбы ў сярэднім па рэспубліцы ў лютым складаў Br729, або на Br19 даражэй, чым у студзені. Самыя нізкія цэны на яе былі ў Ашмянах, Стоўбцах, Горках, Клімавічах, Чавусах, дзе яе прадавалі па Br480—560. У параўнанні са студзенем цэны павялічыліся толькі на Br10. Найбольш высокія цэны на яе захоўваліся па-ранейшаму ў Віцебску, Оршы, Мінску, Барысаве, Салігорску. У гэтых гарадах бульба прадавалася па цане Br760—810 за 1 кг. Верхняя мяжа цэн не змянілася.

Сярэдняя цана на буракі па рэспубліцы складала Br704 і вагалася ад Br310—510 у Стоўбцах, Беразіно, Горках, Клімавічах, Чавусах да Br760—810 у Брэсце, Бярозе, Оршы, Мазыры, Мінску. Верхняя мяжа цэн узрасла на Br30—40.

Нагадаем, параўнальны аналіз цэн штомесячна праводзіцца на прадпрыемствах гандлю ўсіх формаў уласнасці, афіцыйных і нефармальных рынках у 31 горадзе рэспублікі. Паводле яго вынікаў самыя нізкія цэны на асноўныя прадукты харчавання ў лютым гэтага года былі ў Клімавічах, Чавусах, Ашмянах і Горках, а самыя высокія — у Віцебску, Беразіно, Наваполацку, Салігорску, Мазыры, Бабруйску і Мінску.

Таццяна ЛОБАС, БЕЛТА.

Мабільнік — толькі карысны дадатак да стацыянарнага тэлефона

Шчыльнасць тэлефанізацыі складае сёння ў Беларусі 36 тэлефонных апаратаў на кожныя 100 жыхароў. А агульная колькасць тэлефонаў, падключаных да сетак агульнага карыстання, перавышае 3,5 мільёна.

За 2006 год Рэспубліканскае аб'яднанне «Белтэлекам» забяспечыла сувязю 124 983 новыя абаненты. У сельскай мясцовасці былі падключаны 88 000 нумароў, з іх 37 309 нумароў прыйшліся на аграрагарадкі. Аднак работы па забеспячэнню жыхароў Беларусі фіксаванай тэлефоннай сувяззю не спыняюцца. Па даных на 1 студзеня 2007 года ў «Белтэлекам» было пададзена 149 673 заяўкі на ўстаноўку тэлефона. У найбольшай ступені патрэбу ў тэлефанізацыі адчувае кватэрны сектар. У гэтым годзе «Белтэлекам» плануе павялічыць колькасць тэлефонных абанентаў яшчэ на 70 тысяч.

Філіял РУП «Белтэлекам» «Мінская гарадская тэлефонная сетка» адкрые ў сталіцы трохмільённую зону, і многія новыя нумары абанентаў будуць пачынацца з лічбы «3». Гэта звязана з ростам насельніцтва Мінска і актыўнай мадэрнізацыяй тэлефонных станцый. Таксама адбудзецца перападключэнне ўжо існуючых нумароў. Работы па пераключэнню пачаліся з 1 сакавіка.

У 2006 годзе «Белтэлекам» завяршыў работы па замене таксафонаў на ўніверсальныя апараты і закрыў усе дэкаднагашавыя тэлефонныя станцыі. У гэтым годзе прадпрыемства падоўжыць работы па пераключэнню аналагавых станцый, ужо каардынатнай сістэмы, на лічбавае абсталяванне. У сталіцы да 2010 года ўсе тэлефонныя станцыі, як плануецца, павінны стаць лічбавымі. Акрамя таго прадпрыемства падрыхтавала сеткі да пераходу на перспектыўную нумарацыю, які будзе здзейснены ў ноч з 30 на 31 сакавіка. У сувязі з гэтым у краіне зменяцца ўсе тэлефоны экстранных і даведачных службаў, якія пачынаюцца з нуля: замест «0» будзе набірацца «1».

Надзея НІКАЛАЕВА.

Экспертыза

Нектар не мае права называцца сокам

Як паведаміў намеснік дырэктара па тэхнічнаму нарміраванню і стандартызацыі Беларускага дзяржаўнага інстытута стандартызацыі і сертыфікацыі Валерый ГУРЭВІЧ, зараз у стадыі перагляду знаходзіцца дзяржаўны стандарт СТБ-1100 «Харчовыя прадукты. Інфармацыя для спажыўцоў. Агульныя патрабаванні».

— Практыка прымянення гэтага стандарта паказала, што несумленныя вытворцы знаходзяць у ім «пралазы», — патлумачыў Валерый Гурэвіч. — Таму мы збіраемся зрабіць больш жорсткімі патрабаванні да інфармацыі, якая абавязана прадастаўляцца спажыўцам, а таксама да яе афармлення. — У прыватнасці, велічыня шрыфту на маркіроўцы павінна быць не меншай за 2 мм, а тэкст не павінен размяшчацца на некантрастным фоне, каб спажывец мог яго без праблем прачытаць. Наша задача заключаецца ў тым, каб змяніць сённяшнюю сітуацыю і зрабіць так, каб пакупніка больш не ўводзілі ў зман. І калі ён купляе раслінна-сметанковае ці сметанкова-раслінае масла, то слова «раслінае» не павінна знікаць з упакоўкі. Абодва словы (і «сметанковае», і «раслінае») павінны наносіцца на маркіроўку шрыфтам аднолькавага памеру і аднолькава добра чытацца.

Увогуле план дзяржаўнай стандартызацыі на 2007 год уключае распрацоўку 21 тэхнічнага рэгламенту і каля 500 дзяржаўных стандартаў. Тэхнічныя рэгламенты — гэта зусім новы для спажыўцоў клас дакументаў. Тэхнічныя рэгламенты будуць устанаўліваць абавязковыя патрабаванні да розных груп прадукцыі. Сёння на разглядзе ва ўрадзе знаходзяцца тэхнічныя рэгламенты, якія датычацца нізкавольтнага абсталявання і аспектаў электрамагнітнай сумяшчальнасці.

— Уся электрабытавая тэхніка, якой мы карыстаемся штодня, павінна будзе, акрамя дзяржаўных стандартаў, адпавядаць патрабаванням тэхнічных рэгламентаў, — патлумачыў Валерый Гурэвіч. — У прыватнасці, увядзенне тэхнічных рэгламентаў дазволіць наладзіць кантроль за так званым «шэрым імпартам», што будзе на карысць спажыўцоў. З'явіцца новы маркіровачны знак, а патрабаванні да пацвярджэння адпаведнасці стануць больш жорсткімі.

На падыходзе яшчэ 4 тэхнічныя рэгламенты, накіраваныя на бяспечнасць харчовай прадукцыі, бяспечнасць дзіцячага харчавання, бутыляванай пітной вады і матэрыялаў, якія кантактуюць з харчовым асяроддзем.

Упершыню ў Беларусі распрацавана «Канцэпцыя развіцця нарматыўнай базы ў галіне стандартызацыі сокаў і соказмяшчальных прадуктаў», скіраваная на павышэнне тэхналагічнага ўзроўню вытворцаў, канкурэнтаздольнасці выпускаемых прадуктаў і абарону айчыннага рынку ад паступлення нявыкаснай прадукцыі. У працяг канцэпцыі вядзецца распрацоўка стандартаў на сокі, нектары і соказмяшчальныя напіткі, якія могуць быць уведзены ў дзеянне з 1 чэрвеня 2008 года. Стандарты ўстаноўяць патрабаванні да класіфікацыі гэтай прадукцыі і крытэрыяў іх сапраўднасці.

На думку Валерыя Гурэвіча, веданне многіх стандартаў магло б пакупнікам дапамагчы. Напрыклад, веданне маркіроўкі сімвалаў догляду адзення дазволіла б не толькі набыць жаданую рэч, але і правільна яе даглядаць і тым самым падоўжыць тэрмін яе эксплуатацыі. А ці многія ведаюць патрабаванні стандарту, які датычыцца праграмных прадуктаў? Што павінна змяшчацца на ўпакоўцы, якой павінна быць упакоўка, якая суправаджальная дакументацыя павінна прыкладацца да праграмнага прадукту? На сайце Дзяржстандарту Рэспублікі Беларусь ці Беларускага дзяржаўнага інстытута стандартызацыі і сертыфікацыі пры жаданні можна знайсці ўсю патрэбную інфармацыю... Акрамя таго, аналагічную інфармацыю ў хуткім часе можна будзе знайсці і ва ўсіх паштовых аддзяленнях, а таксама ў бібліятэках: 3800 паштовых аддзяленняў плюс 2 тысячы бібліятэк. У Дзяржстандарце спадзяюцца, што такім чынам удасца стварыць у Беларусі разгалінаваную сетку інфармавання спажыўцоў аб дзеючых стандартах, якіх налічваецца, дарэчы, каля 22 тысяч.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Гандлёвы цэнтр «Карона» рыхтуе да адкрыцця буйнейшы ў Беларусі магазін адзення «Модны Мол»

Гандлёвы цэнтр «Карона» рыхтуе да адкрыцця буйнейшы ў Беларусі магазін адзення «Модны Мол». Ён будзе размешчаны на другім паверсе ГЦ, паведамілі БЕЛТА ў аддзеле маркетынгу «Кароны».

Агульная плошча «Мола» складзе 3,5 тыс.кв.м, гандлёвая плошча асобнага магазіна вар'іруецца ад 110 да 320 кв.м. У цэлым «Мол» уключыць у сябе 21 магазін. Сярод іх будуць прадстаўлены манабрэнды CK jeans, Mark O'Polo, Stefanel, Sisley, Benetton, Morgan, Motivi, Axara, Olsen і многія іншыя, маладзёжныя маркі Lulu Castagnette і House. Таксама ў новым ГЦ будуць прадстаўлены магазіны французскай бялізны DIM і моднай біжутэрыі Riviera. Акрамя таго, плануецца адкрыць два мультыбрэндавыя бутыкі Dress Code і Concept.

Спецыялісты «Кароны» падкрэслілі, што «Модны Мол» з'яўляецца ўнікальным праектам для нашай краіны. Кожны магазін будзе адкрыты з выкананнем патрабаванняў франчайзінгу, што азначае выкананне ўсіх фірменных стандартаў работы маркі: афармленне інтэр'ера, паўнацэннасць актуальнай калекцыі, рэкамендаваная сетка рознічных цэн, навучанне кансультантаў.

Магазіны будуць адкрывацца паступова, і, як заяўляюць у гандлёвым цэнтры «Карона», да пачатку мая будуць адкрыты ўсе з заяўленых.

Разам з «Модным Молам» на другім паверсе гандлёвага цэнтра адкрыецца забаўляльны цэнтр «Дыскаверы» і супермаркет бытавой тэхнікі «Карона-Тэхна».

Атракцыёны і дэкарацыі забаўляльнага цэнтра агульнай плошчай больш як 400 кв.м будуць аб'яднаны адзінай ідэяй кругасветнага падарожжа. У «Дыскаверы» прадугледжана і спецыяльнае дзіцячае меню.

У аддзеле маркетынгу дадалі, што «Карона-Тэхна» на момант адкрыцця таксама зойме пазіцыю буйнейшага супермаркета (1,7 тыс.кв.м) і прадставіць да 50 брэндаў бытавой тэхнікі і электронікі: Sony, Philips, Panasonic, Bosh, L

Пытальнік

Жаночая стрыжка — па максімальнай цане

Патлумачце, калі ласка, чаму ў мінскіх цырульнях вельмі істотна вагаюцца цэны. Скажам, у адной цырульні можна зрабіць жаночую стрыжку за 6 тысяч рублёў, у іншай — за 20 тысяч рублёў і гэтак далей. Я, канешне, разумею, што цэны ў салоне і цырульні павінны адрознівацца. Але чаму адрозніваюцца цэны ў цырульнях? За што мы плацім?

Ганна ШАЎКОВІЧ,
г. Мінск

Як патлумачылі нам ва ўпраўленні бытавога абслугоўвання Мінгарвыканкама, у адпаведнасці з дзеючым парадкам фарміравання цэн на бытавыя паслугі, кожны суб'ект гаспадарання ўстанаўлівае кошт на свае паслугі, зыходзячы з рэальных выдаткаў. Улічваецца ўсё: і памер арэнднай платы (у цэнтры горада, яна, зразумела, больш высокая), і створаны для кліентаў камфорт, і набор паслуг, і кошт парфумернай прадукцыі, якая выкарыстоўваецца пры абслугоўванні кліентаў, і клас майстроў, якія працуюць у цырульні. Да таго ж усе арганізацыі, якія займаюцца прадастаўленнем цырульніцкіх паслуг, падзяляюцца на цырульні, салоны і салоны тыпу «люкс». Самыя дарагія паслугі, зразумела, — у салонах тыпу «люкс».

Пільнуй!

Некандыцыйнае гаручае

У Валожынскім раёне пасля праведзенай сумеснай праверкі супрацоўнікамі УБЭЗ УУС Мінаблвыканкама і АБЭЗ РУУС узбуджана крымінальная справа па факту продажу некандыцыйнага гаручага.

Як паведамілі ў аддзеле інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Мінаблвыканкама, у якасці падазроных праходзяць непрацуючы жыхар Слуцка і дырэктар аднаго са сталічных ТАА, жыхар Мінска.

Як устанавілі праваахоўныя органы, прадпрымальнікі са жніўня па верасень 2006 года паставілі ў адрас аднаго з прадпрыемстваў Валожына пад выглядам дызельнага паліва больш як 74 тыс. літраў паліва пячнога бытавога. Гэты від гаручага не прызначаны для работы аўтатранспартных сродкаў. Такім чынам было ўчынена выкраданне грашовых сродкаў прадпрыемства на суму каля Br31 млн.

Кар. БЕЛТА.

Кінапаслугі

«ПАРАГРАФ-78» — ЭХ, РАЗ, ЯШЧЭ РАЗ, І ЯШЧЭ МНОГА, МНОГА...

Нягледзячы на няўдачу ў пракаце, другая частка скандальнага фільма будзе паказана ў кінатэатрах сталіцы

Гледачы мінскіх кіназалаў былі ў шоку — на самым цікавым месцы шырока разрэкламаваная новая стужка «Параграф-78», у якой іграюць ці не ўсе зоркі расійскага кіно, абрываецца. Праходзіць паўтары гадзіны карціны і раптоўна ў кіназале ўспыхвае святло. «Працяг стужкі глядзіце 29 сакавіка», — зазываюць цітры. Абурэнне, з якім выходзілі людзі з сеанса, зразумелае. Яны набылі квіткі на кінасеанс, і нават не ведалі, што на самай справе ім пакажуць толькі першую частку фільма...

«Падманулі... Ці ёсць сумленнасць... Ніколі ў кіно не пайду... Кінатэатры робяць усё, каб больш грошай з нас спагнаць», — прыблізна такія фразы даносіліся з вуснаў тых, хто выходзіў з кінапрагляду. Няўжо і сапраўды кіназалы вырашылі «сарваць банк» — парэзаць фільм на дзве часткі, каб гледачы гарантавана прыйшлі ў кіно яшчэ раз.

Карэспандэнт газеты звярнуўся па каментарыі да генеральнага дырэктара УП «Кінавідэапракат» Мінскага гарвыканкама Васіля Коктыша.

— Васіль Пятровіч, што здарылася? Сталічныя кінатэатры падманулі гледачоў?

— Канешне не. Мы самі былі абураныя, і адразу ж пашкадавалі, што пусцілі «Параграф-78» на экран. Мінскі кінавідэапракат набыў фільм, па пагадненню, у расійскіх вытворцаў стужкі. Гэта яны вырашылі, што «Параграф 78» будзе выходзіць у дзвюх частках. Кінапракатчыкі знаходзяць амаль у тых жа ўмовах, што і гледачы. Прэм'ера стужкі адбылася ў адзін дзень з расійскай, і мы адчулі тое ж самае, што і людзі, якія прыйшлі ў кіназалу. Беларускія кінатэатры інтэграваны ў сусветны пракат, і таму мы не змаглі ігнараваць «Параграф-78». Ён быў шырока разрэкламаваны вытворцамі, як адзін з галоўных фільмаў года, і мы, як і гледачы, «клюнулі» на піар-кампанію. Адразу ж пасля першай дэманстрацыі на вялікіх экранах мы абмежавалі колькасць сеансаў.

— Ці можна было папярэдзіць людзей аб тым, што фільм выходзіць у дзвюх серыях?

— У кожным кінатэатры, дзе адбываўся пракат, было заяўлена, што дэманструецца толькі першая частка стужкі. Але, канешне ж, не кожны заўважыў гэтую інфармацыю.

— А на афішы чаму б не напісаць вялікімі літарамі «фільм першы». Напрыклад, на афішы кінатэатра «Цэнтральны» нічога пра тое, што «Параграф» выходзіць у дзвюх частках, не было пазначана.

— Мы маем права абвяшчаць на афішы толькі тую інфармацыю, якую заявіў вытворца стужкі. І больш нічога. Сітуацыя нагадвае ўсім знаёмы малюнак «магазін—пакупнік—недабраякасны тавар». Калі вы набылі, напрыклад, каўбасу, якая вам не спадабалася альбо выраблена з парушэннямі тэхналогіі, прэтэнзіі дасылаюцца магазіну. Але ж прадавец, калі разабрацца, каўбасу не вырабляе, у тым, што тавар зроблены з парушэннямі тэхналогіі, вінаваты вытворца — гэта яму павінна быць сорамна перад людзьмі.

— А чаму «Параграф-78» быў падзелены на дзве часткі?

— Як тлумачыць расійскі бок, гэта такая творчая задума. Увогуле, мы ўжо сустракаліся з аналагічнымі выпадкамі — стужка «Забіць Біла» выходзіла ў дзвюх серыях, а першапачаткова яна ствараласяся як адзін фільм. Узгадайце знакамітага «Уладара Кольцаў».

— Ну і якія поспехі ў расійскай «геніяльнай творчай задумы»?

— «Параграф» не апраўдаў чаканні. Ён нас засмуціў. Зборы ад яго пракату меншыя, гледачам ён не вельмі спадабаўся. Кіно — гэта заўсёды чаканне...

— ...не зразумела — якое чаканне...

— Мы не можам дасканала ведаць фільм да таго, як набыць. Канешне, мы збіраем пра яго інфармацыю, але кінапракат — гэта рызыка, як і ва ўсім жыцці. Высветліць на сто працэнтаў, «пойдзе» фільм ці не, спадабаецца ён гледачу або не вельмі, немагчыма. І тут трэба мець нейкі «нюх», «адчуванне» паспяховай стужкі. Напрыклад, мой добры знаёмы паглядзеў новую карціну «300 спартанцаў» за мяжой, патэлефанаваў мне і літаральна ўмольваў: «Васіль Пятровіч, набывай фільм, не пашкадуеш». Фільм мы заказалі, а потым прайшоў Берлінскі кінафестываль, дзе «300 спартанцаў» атрымалі вялікі поспех, і кошт набыцця стужкі для кінапракатчыкаў павялічыўся ў некалькі разоў. Мы ж паспелі для мінскіх кінатэатраў набыць стужку танней. Вось толькі невялікі бок кіравання кінапракатнай справай. Магу сказаць, што паспяховых фільмаў праходзіць у сталіцы значна больш — памыляемся мы рэдка. Але ўвогуле кожны мае ўласны густ, таму катэгарычныя высновы рабіць складана...

— Значыць, працяг «Параграфа» з 29 сакавіка пакажуць...

— Так, мы не можам адмаўляць гледачу, якому фільм спадабаўся, і які хоча паглядзець заканчэнне стужкі. Але колькасць паказаў будзе абмежавана, і пройдзе стужка толькі ў трох, больш «сціплых» мінскіх кінатэатрах.

Дзмітрый АЛЬФЕР.

P.S. На афіцыйным Інтэрнэт-сайце фільма p78.ru прадзюсар Юсуп Бахшыеў (які, дарэчы, заявіў пра сябе паспяховымі «Антыкілер» і «Жэсць») патлумачыў, што падзел стужкі на «фільм першы» і «фільм другі» з'яўляецца творчым, крэатыўным рашэннем, а не спробай зарабіць больш грошай. Можа, яно і так, але ж наведвальнікі Інтэрнэт-форумаў у даволі нецэнзурных формах параілі спадару Бакшыеву больш не прымаць такіх рашэнняў без папярэдняй згоды з гледачамі. «Параграф-78», нягледзячы на зорны састаў, цікавы сцэнарый Івана Ахлабысціна і даволі вялікі бюджэт ужо набыў адмоўную славу. А шкада — мне фільм, напрыклад, спадабаўся...

Аптэчны кіёск

Лекавая бяспека беларусаў — у руках айчынных фармацэўтычных вытворцаў

На сёння 90 працэнтаў айчынных лекавых сродкаў маюць кошт, які не перавышае 2 долараў ЗША. Аб гэтым паведаміў на прэс-канферэнцыі, прысвечанай пытанням насычэння айчыннага рынку таннымі беларускімі лекамі, намеснік старшыні канцэрна «Белбіяфарм» Пётр Мандрукевіч.

Прычым «ільвіная» доля беларускіх фармпрэпаратаў (найбольш масавых) рэалізуюцца ўвогуле па сімвалічных цэнах (150—300 рублёў за ўпакоўку) і не толькі не прыносяць прадпрыемствам даход, а з'яўляюцца для іх стратнымі. Нават талончык на праезд у грамадскім транспарце каштуе даражэй. Пры гэтым перад беларускімі фармацэўтычнымі прадпрыемствамі пастаўлена сёння задача прывесці сваю вытворчасць у адпаведнасць з міжнароднымі стандартамі GMP, а для гэтага спатрэбяцца дзесяткі мільёнаў долараў. І без дзяржаўнай падтрымкі і прыцягнення знешніх інвестыцый ажыццявіць гэту задачу будзе проста немагчыма.

Самая высокая рэнтабельнасць на сёння на Барысаўскім заводзе медыцынскіх прэпаратаў, які спецыялізуецца на выпуску джэнэрыкаў (аналагаў імпартных лекавых прэпаратаў). Летась на заводзе запусцілі новую сучасную лінію шпрыцавага напаўнення, якая абышлася заводу ў 16 мільёнаў долараў ЗША. «Гэта вельмі адчувальная для нас сума, — прызнаўся дырэктар прадпрыемства Аляксандр Фандо, — але гульня каштуе свечак. Як толькі мы наладзілі вытворчасць, у нас адразу з'явіліся новыя пакупнікі па-за межамі нашай краіны».

На сёння на прадпрыемствах канцэрна «Белбіяфарм» наладжаны выпуск больш за паўтысячы прэпаратаў. Да 2010 года асартымент лекаў павінен папоўніцца яшчэ прыкладна на 200 найменняў. Паступова павялічваецца доля беларускіх прэпаратаў і ў Пераліку асноўных лекавых сродкаў — зараз яна складае ўжо каля 37 працэнтаў, а да 2010 года павялічыцца да 50 працэнтаў. На 2007 год запланавана засваенне 28 новых найменняў прэпаратаў, 13 з якіх уваходзяць у Пералік асноўных лекавых сродкаў, 24 — з'яўляюцца джэнэрыкамі і 4 прэпараты — арыгінальныя.

Не сакрэт, што засваенне і вытворчасць аналагаў імпартных лекавых прэпаратаў дазваляюць эканоміць дзяржаве велізарнейшыя валютныя сродкі плюс забяспечваюць лекавую бяспеку нашай краіны. Летась, напрыклад, эканомія ад асваення джэнэрыкаў склала 858 тысяч долараў ЗША. Да таго ж і для хворых яны больш даступныя па кошту. Праўда, асобныя пацыенты па-ранейшаму ставяць пад сумненне эфектыўнасць айчынных аналагаў імпартных лекавых прэпаратаў. Дырэктар Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра «Кардыялогія» Ігар Адзярыха запэўнівае, што ўсе джэнэрыкінавінкі, якія ўкараняюцца ў лячэбную практыку ў іх цэнтры (між іншым, доля айчынных лекаў павялічылася тут ужо да 40 працэнтаў), вельмі ўважліва вывучаюцца і кантралююцца спецыялістамі-практыкамі на біяэквівалентнасць і наяўнасць пабочных рэакцый арганізма: «Хачу афіцыйна заявіць, што ні эфектыўнасць, ні бяспечнасць беларускіх лекаў не выклікаюць у нас абсалютна ніякіх прэтэнзій».

Прычыны, чаму зрэдку той ці іншы лекавы прэпарат трапляе ў разрад дэфіцытных, Пётр Мандрукевіч патлумачыў так: «Гэта могуць быць як чалавечы фактар, так і тэхналагічны збой у працэсе яго вытворчасці». Справа ў тым, што для вытворчасці беларускіх лекаў выкарыстоўваюцца субстанцыі, якія закупляюцца ў Індыі, Кітаі, Расіі, і, на жаль, бываюць выпадкі, калі сыравіна не праходзіць кантроль на якасць на тэрыторыі Беларусі. Па гэтай прычыне вытворчасць часова спыняецца. Таксама негатыўна адбіваюцца на насычэнні фармацэўтычнага рынку айчыннымі лекамі і несвоечасовыя заказы. Вытворчы цыкл любога прэпарата займае ад чатырох да пяці месяцаў, таму калі заяўка паступае вытворцам несвоечасова ці па нейкай прычыне змяняецца, церпіць у выніку пацыент, які прыходзіць у аптэку і не знаходзіць там патрэбнага яму лякарства.

Дарэчы, летась Міністэрствам аховы здароўя быў зацверджаны новы пашыраны асартыментны мінімум лекавых сродкаў айчыннай вытворчасці, абавязковы для наяўнасці ў аптэках усіх формаў уласнасці, у які ўвайшлі 117 монапрэпаратаў і 44 найменні камбінаваных прэпаратаў. У пералік уваходзяць тыя айчынныя лекі, якія выпускаюцца беларускімі фармацэўтычнымі заводамі ў дастатковых аб'ёмах і бесперабойна: амбраксол, ампіцылін, ацыклавір, бромгексін, ібупрафен, ксіламетазалін, нафазалін і іншыя.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Шэдэўр, які можна вынесці з музея

Білет — гэта тое, за што вы плаціце грошы, каб некуды патрапіць. А калі вы збіраецеся па гэтаму білету прайсці ў Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь, то абсалютна дакладна — вашы грошы дарэмна не прападуць яшчэ і таму, што гэты білет будзе сам мастацкім творам, які нават можна захаваць на памяць. Таму што білеты ў галоўны музей краіны штогод выглядаюць па-новаму. Сёлета мы атрымаем трэці па ліку білет.

Але толькі пасля таго, як пройдзе чарговы конкурс, у якім маладыя мастакі і дызайнеры могуць прапанаваць свой варыянт уваходнага білета ў Нацыянальны мастацкі музей Беларусі. Сёлета да іх могуць далучыцца ўсе, хто захоча выпрабаваць свае ідэі на крэатыўнасць. Усе прапановы будзе ацэньваць журы, у склад якога ўваходзяць супрацоўнікі музея і прадстаўнікі яго генеральнага партнёра «Брыціш-Амэрыкан Табака Трэйдзінг Компані». Ацэньвацца будзе арыгінальнасць ідэі і ўзровень яе мастацкай рэалізацыі. Можна выкарыстоўваць фатаграфічныя і графічныя выявы будынка НММ, яго залаў ці твораў з экспазіцыі. На адваротным баку павінна быць змешчана карысная для наведвальнікаў інфармацыя.

Конкурс праходзіць з 19 сакавіка па 9 красавіка, калі журы вызначыць пераможцу. А пераможца, як водзіцца, атрымлівае ўсё. У дадзеным выпадку 500 000 беларускіх рублёў. Калі не лічыць самога факта, што твой твор стане самым першым, з якім пазнаёмяцца наведвальнікі музея. Яны нават змогуць вынесці яго з музея абсалютна легальна.

Але ўяўленні наведвальнікаў пра ўваходны білет могуць быць зусім іншымі. Менавіта таму арганізатары конкурсу пасля яго заканчэння дадуць магчымасць публіцы ацаніць усе праекты. Аўтар самага папулярнага з іх атрымае «Прыз глядацкіх сімпатый» і 100 000 беларускіх рублёў.

Пакуль яшчэ ёсць час схадзіць у музей па білету, які прапанавала мастачка Настасся Скабцова. Ужо ў ліпені ў нас будзе магчымасць набыць новы білет. Трэці па ліку. Тры дызайнерскія творы — пачатак калекцыі, ці не так?

Ларыса ЦІМОШЫК.

Шык-шок

Штаны — шырэй, абцас — ніжэй. Віват, зручнасць!

Усё, што абцягвала, сціскала «ў вобласці грудзей і бёдраў», як і набыты насуперак здаровому сэнсу нязручны — на шпільцы і з вострым носам абутак можна смела адстаўляць у бок да тых часоў, пакуль усё гэта зноў не вернецца. На парадку дня — зручнасць, утульнасць. камфорт! Можна сказаць, вясной-летам 2007 года мода патрабуе ад модніц крыху меншых ахвяраў: вяртаемся да большай натуральнасці, свабоды формаў, пастаты канструкцый. Хоць гэта не азначае, што ў бліжэйшым сезоне будзе сумна.

Наадварот, некаторыя знаўцы называюць сезон вясна-лета-2007 незвычайным і экстравагантным. А ўсё таму, што яму ўласцівая дваістасць. З аднаго боку, мы нібыта вяртаемся да стрыманага стылю 80-х з іх шортамі строгага крою, сукенкамі-кашулямі і ўжываннем някідкіх пастэльных адценняў. Дарэчы, зараз усю гэтую невыразнасць цудоўным чынам ажыўляюць шыкоўныя дэкаратыўныя элементы і аксесуары. З другога боку, азіранне на 60-я дазваляе той жа сукенцы-кашулі быць яркай, з тканіны авангарднай афарбоўкі. У цэлым сучасныя свабодныя сукенкі — ад сукенак-футболак да трапецый з буйным каляровым узорам ці гэткім жа арнаментам, графічным малюнкам у стылі рэтра або ў авангардным стылі імкнуцца цалкам схаваць асаблівасці фігуры, прычым як недахопы, так і вартасці. Намёк на апошнія застаецца зрабіць з дапамогай хіба што шырокага пояса.

Усё большую актуальнасць набываюць тунікі, якім удаецца гарманізаваць са штанамі ці джынсамі і далікатна абараняць ад чужых вачэй ніжнюю частку тулава. Зразумела, схаваныя бёдры вымушаць жанчын падтрымліваць сэксапільнасць іншымі шляхамі: шорты і спадніцы скарачаюцца, а кашулі зашпільваюцца толькі на самыя ніжнія гузікі. Так-так, бялізна пакуль не хоча хавацца, ёй яшчэ не прыелася жыццё наросхрыст.

З аднаго боку, да нас вярнуліся легінсы, а з другога, — вузкія джынсы і штаны апынуліся ў андэграўндзе. З высокіх і вулічных подыумаў іх выцяснулі штаны з шырокімі штанінамі — з дэніму, бавоўны ці шэрсці. Застаюцца на піку папулярнасці і штаны-карго — свабодныя паўсюль, акрамя таліі, узбагачаныя вялікімі кішэнямі ў любых даступных месцах. Блэйзеры, кофты, майкі, тыя ж кашулі і ўвогуле ўсё, што можна апрануць з такімі штанамі, — не надта доўгае, але і не такое кароткае, як раней. Пупкі і голыя спіны адступаюць.

А вось курткі хавацца не збіраюцца. Запатрабаваныя — усялякія, але на вяршыні — варыяцыі на тэму курткі-паркі, з жорсткай брызентавай тканіны. На яе аснове дызайнеры ствараюць больш лёгкія варыянты з джынсу, бавоўны, аб'ёмныя, якія шапацяць, блішчаць, розных колераў, на зборках, з шырокім капелюшом, кішэнямі-кенгуру, на шматлікіх шнурках і «маланках». Новыя куртке шыюцца і з такіх лёгкіх матэрыялаў, што хутчэй іх саміх трэба абараняць ад дажджу і ветру, чым хавацца пад імі. Такія куртке спалучаюцца і з міні-спадніцамі, з паркалёвымі і вячэрнімі сукенкамі, са штанамі спартыўнага кшталту. Парка цудоўным чынам убудавалася ў новую канцэпцыю «пышнасці» вобразу, які ствараюць спадніцы-цюльпаны і жакеты-распашонкі з шырокімі рукавамі.

Асвяжыць гардэробчык можна цяпер яркім аксесуарам, напрыклад, калі вы — брунетка, то падыдуць чырвоныя басаножкі, пояс светлага адцення ці ружовая сумачка. Любы ансамбль дапоўняць аксесуары з золата, срэбра ці бронзы. Колькі такіх вырабаў з каштоўных матэрыялаў трэба выкарыстоўваць, павінен падказаць густ.

Нават стары знаёмы касцюм шэрага колеру можна ўпрыгожыць бліскучымі буйнымі пацеркамі, шырокім поясам з пазалочанай або пакрытай бронзавым налётам скуры. Эфектна выглядаюць і празрыстыя гузікі з серабрыстым водбліскам.

Выбар аксесуараў, між іншым, становіцца ўсё больш прадуманым. Сумкі павінны гарманізаваць з абуткам. Дарэчы, і сумкам, і абутку будзе спадарожнічаць празрыстая фактура, асобныя дызайнеры нават лічаць празрыстыя абцасы і платформы, пластыкавыя пацеркі і сумкі з сілікону фаварытамі сезона.

Увогуле каляровая гама вясны-лета-2007 не мае намеру адмаўляцца ад колераў-аксакалаў: чорнага і белага. У страі застаюцца колер індыга, ярка-жоўты, аранжавы, чырвоны, пастэльныя і металічныя адценні.

Падрыхтавала Святлана БАРЫСЕНКА.

Што ў таксіста ў багажніку?

З пачатку гэтага года супрацоўнікі сталічнага Першамайскага аддзела Дэпартамента аховы МУС выявілі трынаццаць фактаў незаконнага гандлю алкаголем. Спіртное прадаюць як жыхары раёна, так і таксісты. Апошнія звычайна «дзяжураць» каля буйных магазінаў і начных клубаў і дыскатэк. Як расказаў намеснік камандзіра батальёна па рабоце з асабовым саставам Першамайскага аддзела Дэпартамента аховы, у такіх «купцоў» з пачатку года канфіскавана 18,5 літра гарэлкі, 60 літраў брагі, 2,5 літра самагону і самагонны апарат.

Іна ПАЛЮХОВІЧ, *«Мінск—Навіны».*

Такі незвычайны чай

П'юць усе!

Не, гэта не капуста! Перад вамі — чай.

(Працяг. Пачатак у нумарах за 15, 16 сакавіка.)

— Заварваюць чай гатаванай вадой, зразумела, не крутым кіпенем, які толькі-толькі зкіпеў, а крыху пачакаўшы — 75—80-градусным, — тлумачыць Віта, пакуль я пацягваю маленькімі глыткамі чароўны напой. — Пасля кожнай заваркі абавязкова трэба зліваць усю ваду да апошняй кроплі: чайныя лісты не павінны плаваць у вадзе, інакш яны аддадуць увесь свой смак і пах, тады далейшыя заваркі не будуць мець сэнсу.

У заварачным чайнічку праробленая невялічкая адтулінка: вада ў чайнік наліваецца да таго моманту, пакуль не пальецца цераз край праз дзірачку. Робіцца гэта для таго, каб у чайнічку не заставалася паветра. Чай, вядома ж, выліваецца не на абрус, а на спецыяльны столік (які складаецца з рашоткі і ніжняй часткі, праз адтуліны ў рашоткі вада зліваецца ўніз і застаецца ў ёмістасці), выраблены з бамбуку. Гэтая парода пры правільнай апрацоўцы не баіцца вільгаці, вельмі цвёрдая (у паўтара раза больш цвёрдая, чым драўніна). На прылаўках у «Чайным лісце» можна ўбачыць чайныя наборы славутага майстра Лары Ліў, усе яго вырабы нумарныя, з кляймом стваральніка. Ён вядомы яшчэ і тым, што кожны год аб'яўляе цікавы конкурс: той, хто здолее адчыніць зробленыя ім шкатулкі з сакрэтам, атрымае грашовы прыз. На кану — 2 тысячы еўра, аднак дагэтуль нікому акрамя самога майстра не ўдалося іх адкрыць.

— Пах зялёнага чаю не варта каштаваць у посудзе, — зазначае кансультант, — водар у слоіку не супадае з пахам пры заварцы чаю. Сапраўднага высакагорнага чаю для заваркі патрэбна няшмат — літаральна дробка, паколькі лісты пры заварцы поўнасцю раскрываюцца незалежна ад таго, як быў сабраны чай: клапатлівымі рукамі або механічным спосабам (лісты зразаюцца такімі своеасаблівымі машынкамі, якія нагадваюць прылады для збору чарніц). Сабраныя ўручную, чайныя лісты, зразумела, цэлыя, а вось пры механічным зборы нейкі кавалачак можа быць зрэзаны. Аднак і пры ручным, і пры механічным зборы абавязкова будзе галіначка і некалькі лісточкаў. Чай, сабраны рукамі, — больш якасны, у яго больш тонкі смак і водар, ён не адразу аддае ўсе свае выбітныя ўласцівасці, лісточкі цэлыя, без плямак і рэпінак — гэта элітны чай. Кажуць, што ёсць верхнія і ніжнія лісточкі — гэта ўсё выдумкі! Сапраўдны чай — гэта заўсёды тры—чатыры верхнія лісточкі. Піць яго трэба без цукру і слодычаў, каб адчуваць чысты смак.

Настала чарга самай духмянай заваркі, я заплюшчыла вочы і атрымлівала асалоду ад насычанага і ў той жа час надзвычай лёгкага дрэўнага паху. Як у духах ёсць свае стадыі — прыма, тэрцыя, квінта, — так і чай з кожнай заваркай новы: змяняецца пах, смак і нават колер. З кожным разам чай цямнее ўсё больш.

— Так, — пагаджаецца Віта, — у нас ёсць чай, які называецца «Чорны бурштын», — увогуле гэта зялёны чай, першапачатковы колер якога светла-бурштынавы, а пры апошніх заварваннях ён становіцца амаль чорным. Перамены з колерам наогул уласцівыя кожнаму чаю: ад светла-лімоннага да карычневага.

Чайная арыфметыка

— Кошт чаю залежыць ад яго віду і гатунку, — кажа Віта, — а таксама таго, якім чынам ён быў сабраны: чайныя лісткі, сабраныя рукамі, каштуюць даражэй (возьмем, напрыклад, гатунак «Чатыры пары года», 100 грамаў механічнага збору каштуюць каля 20 тысяч рублёў, а ручнога — на 11 тысяч больш). 100 грамаў самага дарагога ў краме чаю — высакагорнага ўлуну ручнога збору — каштуе 35 770 рублёў, самага таннага — крыху менш за 20 тысяч рублёў (механічнага збору «Чорны бурштын» і «Чатыры пары года» каштуюць аднолькава). Чалавеку, які п'е чай штодзённа, 100 грамаў чаю хапае на месяц-паўтара: адна порцыя чаю заварваецца некалькі разоў на працягу дня.

На Усходзе традыцыйныя порцыі для продажу чаю — 100, 300 і 600 грамаў. Дарэчы, апошняя мера ў сістэме «чайнага» вымярэння завецца кілаграмам!

Чайны ўплыў на чалавека

Найбольшай колькасцю карысных уласцівасцяў валодае менавіта зялёны чай. У чаі вялікая колькасць разнастайных мікраэлементаў, вітаміны. Чай нармалізуе работу сэрца, крывяноснай сістэмы, ачышчае сценкі сасудаў. Нямецкія вучоныя правялі цікавыя даследаванні, калі была хвала птушынага грыпу, і пераканаліся, што зялёны чай з правінцыі Нантоў можа прадухіліць птушыны грып! Што яшчэ неабходна ведаць пры ўжыванні зялёнага чаю?

— У першай і другой заварках змяшчаецца больш кафеіну і таніну, — тлумачыць Віта Лебедзева. — Таму, калі ноччу збіраецеся выспацца, вечарам лепш не піць сапраўдны зялёны чай — узбадзёрыцеся так, што будзе не да сну. Зялёны чай таксама не рэкамендуецца піць на галодны страўнік. Летам зялёны чай (асабліва халодны) — лепшы барацьбіт са смагай. Чай ва ўсходняй культуры — неад'емная частка жыцця: п'юць гэты напой круглымі суткамі, не такімі вялікімі порцыямі, як звычайна гэта робіцца ў нас, а пакрысе. Якасны чай ачышчае, танізуе, служыць мачагонным сродкам (ныркі чысцяцца будзь здароў). Больш за літр зялёнага чаю лепш за адны суткі не піць, бо пачынаецца вымыванне з арганізма тых ці іншых рэчываў, у тым ліку і карысных.

Такі гаючы сродак, як чай, прыдатны не толькі для ўнутранага, але і для вонкавага прымянення.

— Чаму вось ёсць цэлыя парфумерныя і касметычныя серыі на аснове зялёнага чаю? Таму што зялёны чай робіць выдатны эфект і на скуру (жанчыны часта выкарыстоўваюць чайныя лісты пасля заваркі ў якасці матэрыялу для масак — на твар, на рукі), — расказвае Віта. — Скарыстаныя чайныя лісты — гэта яшчэ і выдатнае ўгнаенне для кветак, ды і на агародзе яны не будуць лішнімі.

Кажуць, што чай — гэта яшчэ і выдатная альтэрнатыва славянскаму расолу ў пераадоленні пахмельнага сіндрому. Да таго ж гэты напой паляпшае апетыт і пераварванне ежы (бо спрыяе выдзяленню страўнікавага соку), садзейнічае зніжэнню вагі за кошт паскоранага метабалізму і выведу шлакаў з арганізма, павышае імунітэт і валодае нават бактэрыцыднымі ўласцівасцямі, таму асвяжае ротавую поласць.

Ала МАЧАЛАВА.

(Заканчэнне будзе.)

САМЫ СМАЧНЫ ТОРТ — У ГАМЯЛЬЧАНКІ

У Гомелі завяршыўся рэспубліканскі конкурс прафесійнага майстэрства сярод навучэнцаў устаноў, якія забяспечваюць атрыманне прафесійна-тэхнічнай адукацыі па прафесіі «кандытар». Першае месца ў камандным і асабовым першынстве занялі гамяльчане. Па выніках конкурсу пераможцам у асабовым першынстве стала навучэнка Гомельскага дзяржаўнага прафесійна-тэхнічнага каледжа кулінарыі Наталля Крупа **(на здымку злева).**

Фота Сяргея ХАЛАДЗІЛІНА, БЕЛТА.

РУП «Белспецконтракт» реализует:

Автомобильную технику: ГАЗ, ЗИЛ, КРАЗ, «УРАЛ», КАМАЗ, МАЗ, УАЗ, ремкомплекты и запчасти к ним, прицепы и полуприцепы, дорожно-строительную технику, краны башенные, электрокары, спецтехнику: топливозаправщики, автоцистерны, маслозаправщики, авиационно-подвижные электроагрегаты, унифицированные компрессорные станции, кузовы-фургоны, кунги, прицепы-цистерны, погрузчики и самопогрузчики, ремонтные мастерские и станки, электростанции и электроагрегаты, медицинскую технику и имущество, технику и имущество ветеринарного управления, технику и имущество продовольственного управления, технику и имущество СА вещевого управления, технику и имущество химического управления, приборы, лодки резиновые, палатки, парашюты и купола, связные и радиочастотные кабели, бочки, канистры, перекачивающие станции, ЖД-цистерны и многое другое — всего более 1000 наименований.

Полный перечень реализуемой техники/имущества будет опубликован в газете «Звязда» 28 марта.

Прайс-лист (полный перечень) можно посмотреть в Интернете по адресу: www.belspeckontrakt.com

Справки по телефонам в отделе реализации: (017) 224-20-01, 278-06-97.

Рубрыку вядзе Мікола ДЗЯБЁЛА.

аўта аматар

Аўтабяспека

ІДЗІ І ГЛЯДЗІ

У Мінску пачаліся комплексныя прафілактычныя мерапрыемствы пад назвай «Пешаход».

Паводле слоў старшага інспектара аддзела ДАІ Савецкага РУУС сталіцы Дзмітрыя Марозава, мэта аперацыі — папярэджванне здарэнняў, якія адбываюцца па віне пешых удзельнікаў дарожнага руху. У дні правядзення мерапрыемстваў (акцыя будзе доўжыцца да 28 сакавіка) на вуліцах сталіцы будуць дзейнічаць мабільныя групы ДАІ, якія асаблівую ўвагу будуць удзяляць менавіта спыненню парушэнняў з боку пешаходаў. За 2 месяцы гэтага года ў сталіцы па віне пешаходаў зарэгістравана 65 аварый, у якіх 15 чалавек загінулі і больш за 50 — паранены.

Дзяржаўтаінспекцыя нагадвае, што, паводле новага Адміністрацыйнага кодэкса, за простае парушэнне Правілаў дарожнага руху пешаход можа быць аштрафаваны на 0,5 базавай велічыні. А вось за стварэнне аварыйнай сітуацыі памер штрафу для пешахода ўзрасце да 3 «базавых». Калі ж у выніку ДТЗ па віне пешахода атрымалі цялесныя пашкоджанні людзі альбо прычынены ўрон транспартнаму сродку, то штраф можа скласці і 20 базавых велічынь.

Аўтапрагноз

СТРЫМЛІВАЙЦЕ ЭМОЦЫІ

На гэтым тыдні сітуацыя на дарогах застанецца няпростай, паколькі вядучым матывам пры прыняцці рашэнняў вадзіцелямі і пешаходамі будуць эмоцыі, а не логіка. Увага ўдзельнікаў дарожнага руху будзе прытуплена. Узмоцніцца цяга людзей да алкаголю, наркотыкаў і іншых рэчываў, якія ўплываюць на чалавечую псіхіку. Дажджы, а месцамі паводка, таксама ўнясуць свой негатыўны ўклад у бяспеку дарожнага руху. Верагоднасць узнікнення экстрэмальных сітуацый масавага характару найбольш высокая на галоўных дарогах і магістралях. Віноўнікамі аварый часцей будуць вадзіцелі транспартных сродкаў. Перавышэнне хуткасці на слізкай дарозе можа прывесці да выездаў на сустрэчную паласу і лабавых сутыкненняў з катастрафічнымі наступствамі.

21 сакавіка небяспечныя сітуацыі можа справакаваць паніка на ажыўленых участках дарог. Сумныя наступствы чакаюць у першую чаргу залішне самаўпэўненых вадзіцеляў. Рызыку трапіць у непрыемнае становішча зменшыць дакладнае выкананне Правілаў дарожнага руху і выкарыстанне дадатковых мераў бяспекі.

22 сакавіка найбольш вострай будзе праблема перавышэння хуткасці, асабліва ў перыяд з 10 да 14 гадзін. Рэзка ўзрасце верагоднасць аварый на складаных павароты і ўчастках дарог з абмежаванай бачнасцю. Асабліва пільнымі трэба быць вадзіцелям маршрутных транспартных сродкаў і пешаходам.

23 сакавіка прычынай сур'ёзных аварый могуць стаць дрэнныя ўмовы надвор'я і нездавальняючы стан дарог. Вялікая верагоднасць лабавых сутыкненняў і ўвогуле здарэнняў з цяжкімі наступствамі.

24 сакавіка сітуацыя на дарогах будзе вельмі неспрыяльнай. Не рэкамендуецца выязджаць на няспраўных транспартных сродках. Вялікая верагоднасць падзення з эстакадаў і мастоў альбо сутыкнення з нерухомымі перашкодамі. Яшчэ адной прычынай ДТЗ можа стаць парушэнне рытму руху транспарту з-за непрадказальных паводзінаў пешаходаў.

25 сакавіка асцерагайцеся вадзіцеляў-ліхачоў і п'яных пешаходаў. Яны ж самі могуць стаць ахвярамі аварый.

Аўтакірмаш

ПЛАНЫ І РЭАЛІІ «АТЛАНТА-М»

У мінулым годзе аддзяленнямі холдынга «Атлант-М» было прададзена ў Беларусі 3712 новых аўтамабіляў, што складае прыкладна 28 працэнтаў рынку новых іншамарак.

Сёлета міжнародны холдынг мае намер прадаць у нашай краіне не менш за 5900 аўто. У планах «Атланта-М» таксама значыцца і пачатак будаўніцтва новага аўтацэнтра «Volkswagen» у сталічным мікрараёне «Уручча». Таксама будзе пачата ўзвядзенне канцэптуальнага аўтацэнтра KIA.

Аўтаўгон

ПІЛЬНЫЯ МЫТНІКІ

На беларуска-ўкраінскай мяжы супрацоўнікі Пінскай мытні выявілі ўгнаны аўтамабіль.

Паводле звестак прэс-службы Дзяржаўнага мытнага камітэта, падчас правядзення мытнага кантролю было ўстаноўлена, што аўтамабіль «BMW 520D» 2006 года выпуску быў украдзены ў Германіі. Пераганяў крадзенае аўто ва Украіну грамадзянін Беларусі.

Аўтажарт

Жанчына-вадзіцель прыпаркавалася пад знакам, які забараняе прыпынак і стаянку. Падыходзіць «даішнік»:

— Вы што, нічога не бачыце?

— Не... Ой, прабачце. Я адразу не заўважыла. Вы апранулі сёння новую форму.

ВЯСНА ІДЗЕ, ВЯСНЕ — ДАРОГУ!

Выйграе ці прайграе эканоміка транзітнай Беларусі ад увядзення сезонных абмежаванняў вагавых нагрузак для аўтаперавозчыкаў?

Аўтадарогі ў перыяд інтэнсіўнага адтайвання дарожнай «вопраткі» становяцца найбольш уразлівымі. І іх трэба паберагчы. Але ў той жа час эканамісты імкнуцца старанна ўзважыць усе «за» і «супраць». Бо рэспубліка наша транзітная, і галоўнае ў веснавы перыяд, з аднаго боку, і разбурэнне дарог прадухіліць, а з другога, — захаваць для аўтаперавозчыкаў прывабнасць нашых маршрутаў. Таму вясной на асноўных транзітных магістралях Беларусі Мінтранс рэспублікі не ўводзіць абмежаванняў для перамяшчэння аўтатранспарту па вагавых параметрах. Не плануецца рабіць гэта і сёлетняй вясной. Але разам з тым скрупулёзныя разлікі эканамістаў сведчаць аб тым, што Беларусі, як і шэрагу іншых еўрапейскіх краін, цалкам ад такой практыкі адмаўляцца не варта. Бо адваротнае можа кваліфікавацца як нанясенне ўрону эканамічнай бяспецы краіны.

Інстытут эканомікі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі правёў даследаванні і даў комплексную ацэнку эканамічных наступстваў ад рэалізацыі палітыкі абмежаванняў вагавых нагрузак на восі транспартных сродкаў пры іх руху па аўтамабільных дарогах агульнага карыстання Беларусі ў 2006 годзе. Спецыялісты канстатуюць, што працягласць рэспубліканскіх аўтамабільных дарог, якія забяспечваюць пропуск транспартных сродкаў з нагрузкай на адзіночную вось 10 і 11,5 тоны, складае 19,4 працэнта. А дарог, якія злучаюць Мінск з абласнымі цэнтрамі і маюць нагрузку на адзіночную вось менш як 10 тон — 65,7 працэнта. Гэта вымушае нашу рэспубліку дзейнічаць абачліва.

Даследаванне палітыкі абмежаванняў вагавых нагрузак на восі транспартных сродкаў паказала, што як увядзенне, так і неўвядзенне абмежаванняў мае і адмоўныя, і станоўчыя вынікі. Але ўсё ж неўвядзенне часовых абмежавальных мераў абыходзіцца значна даражэй.

Колькасная ацэнка страт аўтаперавозчыкаў, таваравытворцаў, грузаадпраўшчыкаў, грузаатрымальнікаў у час дзеяння сезонных абмежаванняў у 2006 годзе паказала, што іх страты істотна ніжэйшыя, чым урон эканомікі Рэспублікі Беларусь пры іх неўвядзенні. Так, па разліках, сукупныя страты аўтаперавозчыкаў, таваравытворцаў, грузаадпраўшчыкаў, грузаатрымальнікаў і дзяржаўнага бюджэту склалі 35,7 млн дол. ЗША, а ўрон аўтамабільным дарогам пры неўвядзенні сезонных абмежаванняў —158 млн дол. ЗША (73,6 млн дол. ЗША — пры часткоым увядзенні абмежаванняў).

У тым ліку страты карыстальнікаў аўтамабільных дарог Рэспублікі Беларусь, якія выкліканы павелічэннем транспартна-эксплуатацыйных затрат і часу паездак у сувязі з пагаршэннем стану дарог ад праезду транспарту з высокім восевымі нагрузкамі пры адсутнасці абмежаванняў, у перыяд да поўнага аднаўлення стану дарог паказалі, што яны складуць 31,7 млн дол. ЗША (1,5 млн дол. ЗША — пры часткоым увядзенні абмежаванняў).

Усе гэтыя даныя сведчаць аб тым, што на агульную колькасць транзітных паездак і ў гэты веснавы перыяд увядзенне часовых абмежаванняў руху для транспартных сродкаў па некаторых нашых дарогах не акажа істотнага ўплыву. Але выгада для дзяржавы ад увядзення часовых абмежавальных мераў відавочная.

Васіль КУРЛОВІЧ, прэс-служба Дэпартамента «Белаўтадар».

Экслібрыс «Звязды»

ЗЯЛЁНЫ ЛІСТОК НА ПЛАНЕЦЕ ЗЯМЛЯ

Янка Сіпакоў. Зялёны лісток на планеце Зямля. Эсэ. Мінск, «Харвест», 2006.

Новая кніга Янкі Сіпакова — аўтара вядомага цыкла «Вечаславянскіх балад», перакладзенага на многія мовы свету, — успрымаецца як своечасовы водгук пісьменніка на запатрабаванне жыцця: вызначыць месца сваёй Айчыны на карце сучаснага свету, дзе, ігнаруючы законы і ўрокі мінулага, усё больш набірае сілу «права дужага».

Маштаб задумы («стварыць своеасаблівы партрэт Беларусі», «самабытную энцыклапедыю нашага краю і нашага жыцця») вызначыў і шматграннасць зместу, і асаблівасць пабудовы твора. Дваццаць восем навел-эсэ ўзнаўляюць у гістарычным, ад старажытнасці, прасцягу розныя сферы жыцця беларусаў, іх нялёгкі і пачэсны шлях да сваёй суверэннай дзяржаўнасці («Дзе мы знаходзімся ў свеце», «Наша зямля», «Наша флора», «Наша фаўна», «Нашы людзі», «Наша мова», «Нашы песні»...). У непарыўнай сувязі лёсу краіны і народа асэнсоўваецца фарміраванне беларускага менталітэту, нацыянальнага характару — мудрай, добразычлівай талерантнасці і непахіснай мужнасці ў адстойванні сваёй годнасці, славянскай супольнасці, гістарычнай праўды на міжнароднай арэне («Нашы войны», «Нашы межы і нашы дзяржавы»). Шэраг навел прысвечаны значнаму ўкладу Беларусі ў сусветную скарбонку дасягненняў навукі, тэхнікі і культуры («Наша неба, наш космас», «Нашы замкі», «Нашы кнігі», «Наша культура і літаратура» і інш.).

Паэтычны сімвал Радзімы — зялёны лісток у назве і змесце кнігі — вызначыў агульны лірычны лад аповеду, прасякнутага высокім патрыятычным пачуццём. Сталае майстэрства аўтара, вядомага паэта, празаіка, публіцыста адлюстравана ў яго дасканалай, сапраўды народнай мове: то ўрачыста ўзнёслай, то гутарковай, тлумачальнай, з элементамі фальклору, гумарыстычнай аздобы — заўсёды шчырай, даверлівай, зразумелай масаваму адрасату: «Не вер, дружа, калі нехта пачне ганіць і ганьбаваць твой народ... Кожны з нас мае радасць ганарыцца, што належыць менавіта да такога народа і да такой зямлі. Наш славуты старажытны род і наша вычлівая зямля вечныя!».

Змястоўная і арыгінальная, насычаная багатым даведачным матэрыялам, кніга лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Беларусі, заслужанага дзеяча культуры Рэспублікі Беларусь Янкі Сіпакова, несумненна, знойдзе свайго чытача сярод усіх тых, хто цікавіцца беларускай гісторыяй, культурай, літаратурай.

Антаніна ЛЫСЕНКА.

Рэпарцёр атрымаў заданне...

ВЫЯВІЦЬ САМАГОНШЧЫКА

Пэўна, крыху падвыпіўшы мужык, крэкчучы раз-пораз, скардзіўся па тэлефону ў карэспандэнцкі пункт «Звязды» па Гомельскай вобласці, што ў яго... трашчыць галава, а міліцыя не прымае мераў (!). Пачынаем высвятляць, прычым тут адно да другога, і абанент прызнаецца, што ўчора ён добра-такі ўрэзаў купленага самагону, а міліцыя, бачыце, не паставіла заслону той кабеце, у якой ён яго прыдбаў.

— Смешны той мужык, — каментуе гэты факт намеснік начальніка ўпраўлення аховы правапарадку ўпраўлення ўнутраных спраў Гомельскага аблвыканкама Сяргей Шапецька. — Ён што, не разумее сваёй адказнасці, калі купляе алкагольны сурагат і тым самым падахвочае яго ўладальніка на падобныя дзеянні ў далейшым? Па-другое, не прыставіш жа міліцыянера да кожнага аматара «зялёнага змея» і не выявіш адразу самагоншчыка або пастаўшчыка атрутнай вадкасці. Але барацьба з імі вядзецца самая сур'ёзная ўсімі структурнымі падраздзяленнямі міліцыі — патрульна-паставой службай, дзяржаўтаінспекцыяй, участковымі інспектарамі, УБЭЗ, нашым упраўленнем.

— Хацелася б на справе паглядзець, як гэта робіцца, прыняўшы ўдзел у выяўленні самагоншчыка.

— Калі ласка.

І вось разам з вадзіцелем Іванам Кацубам, памочнікам камандзіра ўзвода Мікалаем Фярбеем, камандзірам аддзялення Уладзімірам Ермалаевым (усе — супрацоўнікі палка патрульна-паставой службы УУС) бяром кірунак у вёску Бярозкі Гомельскага раёна, дзе да нас далучаюцца ўчастковыя інспектары міліцыі Аляксандр Казлоў і Сяргей Кужалеў. Едзем у суседнія Галавінцы. Адрасы — канкрэтныя, бо ў міліцыю паступіла інфармацыя, што пэўныя людзі вырабляюць самагон і прадаюць яго.

— Ды вы што? — абураецца Марыя К., калі мы зайшлі ў яе дом. — Такога ніколі не было. Я сама купляла самагон, але ў каго — не скажу. Нагаворваюць на мяне.

На пытанне ж, чаму з шасці двухлітровых пластмасавых бутэлек патыхае самагонам, толькі загадкава ўсміхнулася. І хоць міліцыянеры былі ўпэўненыя, што ў гэтай тары захоўвалася алкагольная вадкасць менавіта для продажу, аднак нічога тут на гэты раз не дакажаш.

Едзем у другі канец вуліцы, і сустрэчны мужык гаворыць: пакуль наша рэйдавая брыгада займалася з Марыяй К., ужо спрацавала вясковая «пошта». Так потым і аказалася: чарговая жанчына, Валянціна Ф., здзівіўшыся з'яўленню міліцыі, заявіла, што гнала самагон дзесяць гадоў таму, а зараз — крый Божа. Участковыя ж патлумачылі мне, што з тыдзень таму па просьбах жанчын, чые мужы пакідаюць сем'і без грошай і нясуць самагоншчыцам сала, бульбу і іншыя прадукты харчавання, яны ўжо рабілі праверку і выявілі каго-нікаго з іх. Астатнія ж насцярожыліся і, магчыма, хаваюць і апараты, і самагон у сваякоў або суседзяў.

Безвыніковай аказалася наша паездка і ў вёску Іпуць, дзе, заўважыўшы міліцыю, гаспадары адной кватэры, западозранай у продажы алкагольнага сурагату, затаіліся ў ёй і, зірнуўшы ў дзвярное вочка, спакойна пайшлі глядзець тэлеперадачу.

Наступны наш маршрут ляжаў у вёску Раманавічы таго ж Гомельскага раёна. Тут мінулым разам пенсіянерка Марыя Х., як гаворыцца, паднесла сюрпрыз участковаму Сяргею Кужалеву, які выявіў у яе доме два бітоны самагоннай брагі. Як толькі ён пайшоў клікаць панятых для складання пратакола, бабулька — шчоўк ключом і «забарыкадзіравалася» ў хаце. На ўсе просьбы і патрабаванні адчыніць яна ніяк не рэагавала.

Зараз жа ёй не было куды падзецца: Калінаўна тупала па двары каля курэй і вымушана была паказаць тыя бітоны, якія былі перастаўлены ў іншае месца. Яна патлумачыла, што мела намер выгнаць самагон для ўласных патрэб: неўзабаве вясна, трэба садзіць і сеяць і тут без мясцовай «валюты» — самагону — не абысціся. На пытанне, дзе самагонны апарат, адказала, што выкінула. А на чым жа тады гнаць гэта «чортава зелле», спыталі міліцыянеры. У адказ — маўчанне.

Яшчэ большыя «трафеі» рэйдавая брыгада выявіла ў падворку пенсіянеркі Марыі В. з вёскі Заляддзе. А менавіта: 80 літраў брагі, 12 — самагону, прыгатаванага для продажу, 10 — тэхнічнага спірту і 90 пачкаў цыгарэт з расійскімі акцызамі. Жанчына адкрыта скардзілася на жыццё: невялікая пенсія, у сына — запазычанасць па аліментах, вось і думала падзарабіць. А мясцовыя мужыкі заявілі міліцыянерам, што Марыя Пілепаўна для таго, каб самагон меў больш градусаў, падбаўляе ў яго таго тэхнічнага спірту, і ў іх на наступны дзень ад гэтага «разломваецца» галава. Цікава, што многія з іх (і не толькі з гэтай вёскі) не ведаюць, што, згодна з заканадаўствам, той, хто набывае самагон або спіртазмяшчальную вадкасць (сурагат), можа быць аштрафаваны. І яшчэ: ведаючы, хто прадае іх, яны рэдка называюць міліцыі прозвішчы. Скаргі паступаюць тады, калі прадаўцы алкаголю пакрыўдзяць — не адпусцяць яго ў доўг або вырабяць дрэннай якасці.

На што мы яшчэ звярнулі ўвагу? Бадай, на тое, што ва ўказаных самагоншчыкаў дабротныя дамы, у іх дарагая мэбля і іншыя рэчы. Гэтага, аднак, не скажаш пра тых, хто карыстаецца іхнімі паслугамі.

А зараз прывядзём факты і лічбы, прадастаўленыя нам упраўленнем аховы правапарадку УУС Гомельскага аблвыканкама (начальнік Юрый Селіванаў).

Летась усімі структурнымі падраздзяленнямі ўпраўлення ўнутраных спраў аблвыканкама па артыкулу 161 Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях было складзена 4328 адміністрацыйных пратаколаў і выяўлена ў насельніцтва амаль 87 тысяч літраў самагону і самагоннай брагі, больш за 130 тон фальсіфікаваных спіртных напояў, знішчана 376 самагонных апаратаў і 28 мініі-заводаў па вырабу самагону. У 2005 годзе ад спажывання сурагатаў у вобласці памерла 550 чалавек, а летась — 452. У тэрытарыяльныя медыцынскія аб'яднанні на ўлік да ўрачоў-нарколагаў пастаўлены быў 2361 чалавек, што злоўжываюць алкаголем, і накіраваны ў лячэбна-працоўныя прафілакторыі 572.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

САМАГОНАВАРЭННЕ ВЫДЗІРАЕЦЦА З КАРЭННЕМ

Супрацоўнікі міліцыі Мінскай вобласці працягваюць актыўную барацьбу з самагонаварэннем і вытворчасцю розных алкагольных сурагатаў.

Як паведамілі «Звяздзе» ва ўпраўленні ўнутраных спраў Мінаблвыканкама, толькі за 2 месяцы гэтага года было канфіскавана і знішчана 6 тысяч 554 літры самагону, 65 тысяч 851 літр брагі, 170 тысяч 615 літраў фальсіфікаваных спіртных напояў. Міліцыянеры выявілі і знішчылі 36 «мініі-заводаў» па вытворчасці «сівухі» і 315 самагонных апаратаў.

Вось некалькі яскравых прыкладаў.

У Маладзечанскім раёне ў гаспадарчай прыбудове вясковага пенсіянера быў выяўлены «мініі-завод» па вытворчасці самагону. Канфіскавана 300 літраў «гатовай прадукцыі» і 2 тоны брагі.

Жыхар Стоўбцаў перавозіў у сваім аўтамабілі 300 літраў спіртазмяшчальнай вадкасці. «Бутлегер» аштрафаваны, сыравіна для вытворчасці сурагату канфіскавана.

Вялікую дапамогу ў барацьбе з самагоншчыкамі вартавым правапарадку аказваюць пільныя і неабыякавыя грамадзяне. За памянёны перыяд на тэлефоны міліцэйскай «гарачай лініі» паступіла 270 паведамленняў аб асобах, якія займаюцца падпольнай вытворчасцю і гандлем спіртнымі напоямі.

Мікола ДЗЯБЁЛА.

Ix шанавалі продкі

ЛЯЛЯ



КОЖНАМУ з нас даводзілася бачыць лес ранняй вясной, на самым-самым яе пачатку. Але дужэла вясна — і на вачах змяняўся лес. Нейкая незвычайна прыязная і прыветная атмасфера панавала ў ім. Дзівоснымі колерамі расквечаны лясныя шаты. Нават само паветра, здаецца, афарбавана незямнымі адценнямі. Як бы нейкая таямнічая палярына ахінае дрэвы. У танюсенькія зялёныя ўборы прыбраліся бярозкі. Чароўны водар плыве ад жоўтых коцікаў вярбы. Ледзь чутным перазвонам агучваюцца кусты арэшніку, увешаныя карычневатымі прадаўгаватымі званочкамі-катышамі.

Хто ж гэта так пастараўся? Хто надаў небывалую святочнасць лесу выстуджанаму нядаўняй зімой? Дык гэта ж прыгажуня Ляля, альбо Лёля, бо і так яе называлі, парупілася — юная багіня вясны і дзяводства. Уся зіхоткая, бліскучая, светлая. Таму і кажуць людзі, што нядаўні счарнелы стаў прыгожым, дзякуючы Лялі. А сама яна нябачна ходзіць між дрэў, па пазелянелых імхах, па востраньких піках маладзенькай травы, абмінае цнатлівыя вясновыя кветачкі і радуецца таму, што зрабіла прыемнасць людзям.

Такі ўжо характар у Лялі — добры, памяркоўны, шчыры і адкрыты. За гэта любяць і паважаюць яе людзі. Кажуць, што яна дачка багіні прыгажосці і кахання, апякункі шлюбаў і сямейнага жыцця Лады. Маці і дачку называлі багінямі прыроды, якая ажывае і якая нараджае. Шматлікія фальклорныя матэрыялы, што захаваліся ў асяроддзі рускіх, беларусаў, палякаў і іншых народаў, даюць падставы лічыць Ладу і Лялю славянскімі парадзіхамі.

Калі вясна добра ўбярэцца ў сілу, калі мінецца першае з вясновых святаў — дзень прылёту жаваранкаў (22 сакавіка), тады Ляля вырашае адкрыцца людзям. Яна з'яўляецца перад імі маладзенькай дзяўчынай. Прыгожая, прыветная, высокая і стройная, апранутая ў доўгі белы ўбор. Вочы — колеру яснага нябеснага блакіту. Радасна сустракалі самую добрую багіню зямляне. У яе гонар 5 мая спраўлялі вясёлае дзявочае свята Ляльнік. Святкаванне адбывалася напярэдадні святога Юр'я — вельмі важнага для славян дня, калі ўрачыста адзначаўся прыход вясны і ўпершыню выганялі хатнюю жывёлу ў поле, і за пяць дзён да свята Ярылы. Усе вясковыя дзяўчаты збіраліся на зялёным і расквечаным першымі краскамі лузе. Хлопцам паказвацца на Ляльніку, гэтым свяце першай зеляніны, забаранялася.

Удзельніцы свята выбіралі са свайго асяроддзя самую прывабную і найпрыгажэйшую дзяўчыну. Мо гэта і было папярэднікам сённяшніх шоу, звязаных з выбарам прыгажунь: розных міс — горада, краіны, рэгіёна, свету? Апраналі яшчэ прыгажэйшымі. Ну, проста, як Лялечкі — вачэй не адарваць. Так і казалі пра іх мамы, калі бачылі сваіх дачушак. А яшчэ гэтак жа — Лялямі, Лялечкамі — называлі мамы сваіх маленькіх дзетак, калі забаўлялі іх і цешыліся імі.

Напрыканцы свята дзяўчаты бралі Лялю пад рукі, падымалі з яе пасада і адводзілі дамоў. Убор яе разам з вянкамі захоўваўся да будучай вясны. Пазней гэтае свята было спалучана з Тройцай — Сёмухай. Да гэтай пары захаваўся звычай упрыгожваць цэрквы, хаты, сялібы, нават вуліцы маем — так называлі даўней бярозу, пасыпаць падлогу пахкім аерам. Ноччу перад Тройцай упершыню вялі коней на папас. Начлежнікі палілі кастры, пяклі яечню, ладзілі скокі.

Ляля — самы светлы міфічны вобраз у пантэоне дахрысціянскіх багоў. Яна не мае ніякіх цёмных іпастасяў, нікому не робіць зла, не аддаецца разгулу, характар у яе спакойны і зычлівы. Ляля не шкадуе для людзей ні багацця, ні дастатку, яна падтрымлівае ўрадлівасць, ухваляе прыгажосць.

Згодна з паданнямі і міфамі, культ Лялі звязаны з вясненнім адраджэннем прыроды, абнаўленнем свету, пачаткам работ у полі. Нездарма, відаць, Ляля з'яўлялася на зямлі амаль адначасова з Ярылам, калі падужэлая вясна ўбіралася ў сілу. Сыходзіла Ляля таксама разам з Ярылам — у канцы вясны. На змену багіні вясны прыходзіла Цёця — багіня лета. У адрозненне ад маладзенькай прыгажуні-Лялі была яна мажнай, паўнацелай кабетай, убранай у спелыя каласы. У руках трымала розныя спелыя плады.

А само імя Ляля, Лёля мела самы шырокі сэнс, ад гэтага слова паходзіла шмат іншых. Давайце згадаем толькі некаторыя. Часта дзяўчатак называлі ласкава-памяншальна: Лёля, Лёлька. Ляля — немаўля, дзіця, лялька, цацка. Рускае слова «лелеять» — беражліва адносіцца, мілаваць, песціць, лашчыць. Люляць — калыхаць. Люлька — калыска. Шмат дзе бусла, пра якога кажуць, што ён прыносіць малых дзетак, называюць лялекай. Мо таму і лічыўся белы бусел птушкай Лялі. Дрэва ж Лялі — гэта бяроза альбо рабіна, яе метал — серабро.

Анатоль БУТЭВІЧ.

ГОДОВОЙ ОТЧЕТ ЭМИТЕНТА

Полное наименование: **Открытое акционерное общество «Управление механизации № 79»**

Адрес: **г. Минск, ул. Селицкого, д. 27, корп. 2;** тел/ф 244 61 23

Полное ф.и.о. директора: Бутырчик Михаил Фомич

Полное ф.и.о. заместителя директора по финансам: Супрун Елена Михайловна

Основные виды деятельности: Деятельность в области промышленной безопасности

Единица измерения: млн.руб

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2007 года

АКТИВ	Код стр.	На начало отчетного года	На конец отчетного периода
I. ВНЕОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ			
Основные средства (01, 02)	110	6340	7648
Нематериальные активы (04, 05)	120	9	7
Доходные вложения в материальные ценности (02, 03)	130	—	—
Вложения во внеоборотные активы (07, 08, 16, 60)	140	226	625
Прочие внеоборотные активы	150	—	—
Итого по разделу I	**190**	**6575**	**8280**
II. ОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ			
Запасы и затраты	210	1279	1606
Налоги по приобретенным ценностям (18, 76)	220	178	119
Готовая продукция и товары (40, 41, 43)	230	4	4
Товары отгруженные, выполненные работы, оказанные услуги (45, 46)	240	906	1169
Дебиторская задолженность	250	317	2323
Финансовые вложения (58, 59)	260	—	—
Денежные средства (50, 51, 52, 55, 57)	270	75	453
Прочие оборотные активы	280	—	—
Итого по разделу II	**290**	**2759**	**5674**
ПАССИВ			
III. ИСТОЧНИКИ СОБСТВЕННЫХ СРЕДСТВ			
Уставный фонд (80)	510	67	67
Собственные акции (доли), выкупленные у акционеров (учредителей) (81)	515	—	—
Резервный фонд (82)	520	—	—
Добавочный фонд (83)	530	6050	7346
Нераспределенная прибыль (84)	540	1472	1703
Непокрытый убыток (84)	550	—	—
Целевое финансирование (86)	560	19	2162
Итого по разделу III	**590**	**7608**	**11278**
IV. ДОХОДЫ И РАСХОДЫ			
Резервы предстоящих расходов (96)	610	—	—
Расходы будущих периодов (97)	620	-60	-46
Доходы будущих периодов (98)	630	—	—
Прибыль отчетного года (99)	640	—	—
Убыток отчетного года (99)	650	—	—
Прочие доходы и расходы	660	—	—
Итого по разделу IV	**690**	**-60**	**-46**
V. РАСЧЕТЫ			
Краткосрочные кредиты и займы (66)	710	—	—
Долгосрочные кредиты и займы (67)	720	—	—
Кредиторская задолженность	730	1786	2726
Прочие виды обязательств	740	—	—
Итого по разделу V	**790**	**1786**	**2726**
ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ			
I. ДОХОДЫ И РАСХОДЫ ПО ВИДАМ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ			
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг	010	17727	12973
Налоги, включаемые в выручку от реализации товаров, продукции, работ, услуг	020	1570	1215
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг (за минусом НДС, акцизов и иных аналогичных обязательных платежей) (010-020)	030	16157	11758
В том числе бюджетные субсидии на покрытие разницы в ценах и тарифах	031	—	—
Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг	040	13508	10104
Управленческие расходы	050	—	—
Расходы на реализацию	060	—	—
Прибыль (убыток) от реализации (030-040-050-060)	**070**	**2649**	**1654**
II. ОПЕРАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ			
Операционные доходы	080	229	387
Налоги, включаемые в операционные доходы	090	8	12
Операционные доходы (за минусом НДС, иных аналогичных обязательных платежей) (080-090)	100	221	375
В том числе:			
Доходы, полученные от продажи активов (кроме ценных бумаг и иностранной валюты)	101	55	71
Доходы от операций с ценными бумагами	102	—	—
Доходы от участия в уставных фондах других организаций	103	—	—
Прочие операционные доходы	104	166	304
Операционные расходы	110	187	326
В том числе:			
Расходы, полученные от продажи активов (кроме ценных бумаг и иностранной валюты)	111	20	29
Расходы от операций с ценными бумагами	112	—	—
Прочие операционные расходы	113	167	297
Прибыль (убыток) от совместной деятельности	120	—	—
Прибыль (убыток) от операционных доходов и расходов (100-110+-120)	**130**	**34**	**49**
III. ВНЕРЕАЛИЗАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ			
Внереализационные доходы	140	36	188
Налоги, включаемые во внереализационные доходы	150	—	—
Внереализационные доходы (за минусом НДС, иных аналогичных обязательных платежей,140-150)	160	36	188
Внереализационные расходы	170	697	546
Сумма источников собственных средств, направленная на покрытие убытков	180	—	—
Прибыль (убыток) от внереализационных доходов и расходов (160-170-180)	**190**	**-661**	**-358**
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) ЗА ОТЧЕТНЫЙ ПЕРИОД (+-170+-130+-190)	200	2022	1345
Налоги и сборы, производимые из прибыли	210	752	476
Расходы и платежи из прибыли	220	3	7
Сумма льгот по налогу на прибыль	230	—	—
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) К РАСПРЕДЕЛЕНИЮ (+-200-210-220-230)	**240**	**1267**	**862**
НЕРАСПРЕДЕЛЕННАЯ ПРИБЫЛЬ (НЕПОКРЫТЫЙ УБЫТОК) (161-171)			
Данные отчетности подтверждены		РУП «Служба ведомственного контроля» Министерства архитектуры и строительства Республики Беларусь	
Количество акционеров: Всего **643**	Юридических лиц **1**	Физических лиц **642**	

Информация о дивидендах и акциях

Наименование показателя	Единица измерения	За отчетный период	За аналогичный период прошлого года
Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде	Миллионов рублей	38,0	26,0
Дивиденды, приходящиеся на одну акцию (включая налоги)	Рублей	85,60	58,19
Обеспеченность акции имуществом общества	Тысяч руб.	20,5	21,0
Количество простых акций, находящихся на балансе общества	Штук	—	—
Информация о задолженности			
Просроченная дебиторская задолженность	Миллионов рублей	251	238
Просроченная кредиторская задолженность	Миллионов рублей	170	173
Информация о размере собственного капитала и привлеченных средствах			
Собственный капитал	Миллионов рублей	66,624	66,624
Привлеченные средства	Миллионов рублей	—	—
Среднесписочная численность работающих (человек)			**606**
Основные виды продукции или виды деятельности, по которым получено двадцать и более процентов выручки от реализации товаров, продукции, работ, услуг	Деятельность в области промышленной безопасности		

ШАШКІ

Пад рэдакцыяй майстра спорту Мікалая ГРУШЭЎСКАГА

«Пагода ў доме»-3

Трэці класіфікацыйны конкурс на прызы Свіслацкага прадпрыемства жыллёва-камунальнай гаспадаркі (кіраўнік Канстанцін Міхайлавіч БАРЭЛЬ) і з нормай першага спартыўнага разраду па шашках працягваем заданнем № 6:



БЕЛЫЯ: b6, c7, d6, f6, g5, h6 (6). **ЧОРНЫЯ:** a5, c3, d4, e3, f8, g3, h4, h8 (8). Выйгрыш.

Удзельнікі нашых папярэдніх конкурсаў могуць пачаць з пятага задання. Таму паўтараем яго. БЕЛЫЯ: d2, e3, f2, g3 (4). ЧОРНЫЯ: g5, дамка e5 (2). Нічыя.

Тэрмін для адказаў традыцыйны — два тыдні. Накіроўвайце іх на адрас рэдакцыі газеты «Звязда»: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а. Рубрыка «Шашкі».

Калектыў — арганізатар конкурсу — прысвячае яго 90-годдзю газеты «Звязда».

Рашаем, перамагаем

Праверце, калі ласка, рашэнні змешчаных раней пазіцый.

БЛІЦ-25: № 1 (М. Грушэўскі). 1. cd8 2. da5 3. a:d8 ed2A 4. de7 5. h:c1x. A3. ... ef2 4. de7 5. h:g1x; № 2 (В. Грабенка, М. Грушэўскі). 1. de3 c:g1 2. a:a7x. «Слупнякі» на вялікай дарозе і на двайніках! A1. ... c:f2 l 2. a:g1! ba5 3. gd4 a:e5 4. h:d4 ab4 5. de5 h:c7 6. b:a3x. I 2. a:a7? fg1x —рэха фінал!; № 3 (М. Грушэўскі, П. Шклудаў). 1. fg3 2. g:g7! ab6A 3. cd4 4

Тэлесеткі

Шлях да эфірных вяршыняў

Сёння ў Палацы Рэспублікі адбудзецца цырымонія ўзнагароджання пераможцаў Трэцяга Нацыянальнага тэлевізійнага конкурсу «Тэлевяршыня». Ён праводзіцца ў Беларусі, пачынаючы з 2005 года, з мэтай павышэння ўзроўню айчыннага тэлебачання. Падрыхтоўку і трансляцыю конкурсу па чарзе праводзяць вядучыя тэлеканалы. На гэты раз роля гаспадара «Тэлевяршыні» даталася СТБ, і 23 сакавіка на канале будзе прадстаўлена тэлеверсія цырымоніі ўзнагароджання пераможцаў конкурсу.

Прафесійнае спаборніцтва тэлевізійнікаў ідзе ў 21 намінацыі, 13 з якіх прысвечаны тэлепраектам, а 8 — персаналіям. Сёлета імёны пераможцаў, якія раней неафіцыйна гучалі ў кулуарах да самой цырымоніі ўзнагароджання, трымаюцца ў строгім сакрэце — галасаванне журы было закрытым, а яго вынікі будуць абвешчаны толькі непасрэдна 21 сакавіка.

Наконт тэлеверсіі, якую рыхтуе з падзеі канал СТБ, намеснік генеральнага дырэктара ЗАТ «Сталічнае тэлебачанне» Павел Каранеўскі расказвае наступнае: «Мы хочам падняць планку нашага беларускага тэлебачання, таму да арганізацыі цырымоніі падышлі вельмі адказна. Гэта галоўны нацыянальны тэлевізійны конкурс, таму ўсё павінна быць урачыста і пафасна». Між іншым, тэлеверсій СТБ прадставіць нават дзве: інфармацыйную — прамыя ўключэнні з Палаца Рэспублікі падчас выпускаў навін «24 гадзіны», і поўную — у суботнім прайм-тайме. Прычым пасля «Тэлевяршыні» пафасная атмасфера зменіцца на нязмушаную: у 22.55 пачнецца капуснік, які рыхтаваўся сумесна сіламі эстрадных зорак, ігракоў КВЗ і тэлевядучых СТБ, якія прымералі незвычайныя амплуа.

Адборныя таленты

Пачаўся прыём заявак на ўдзел у рэспубліканскім дзіцячым конкурсе «Песня для Еўрабачання»

Аб гэтым паведаміла Белтэлерадыёкампанія, якая нароўні з Міністэрствам культуры РБ выступае арганізатарам конкурсу. «Песня для Еўрабачання» па традыцыі з'яўляецца адборам на міжнародны дзіцячы конкурс «Еўрабачанне-2007». На першым этапе — да 31 мая гэтага года — адбываецца збор заявак ад юных выканаўцаў, якія хочуць паўдзельнічаць у песенным спаборніцтве. Вынікі адбору прафесійнае журы падвядзе з 1 па 7 чэрвеня, выбраўшы для фіналу не больш як 10 песень. Фінальны канцэрт запланаваны ў верасні 2007 года на Першым канале.

Сёлета, дарэчы, правілы конкурсу крыху змяніліся. Так, узрост удзельнікаў дзіцячага конкурсу на момант падвядзення вынікаў павінен быць не менш як 10 і не больш як 15 гадоў. Аўтарам слоў і музыкі неабходна ўдзельнічаць у выкананні песні на сцэне — у якасці музыканта ці спевака. Усяго ж на сцэне можа быць максімум 8 юных артыстаў. Больш падрабязна з правіламі конкурсу і спісам дакументаў, якія неабходна прыкласці да заяўкі, можна пазнаёміцца на сайце Белтэлерадыёкампаніі www.tvr.by. Заяўкі таксама адпраўляюцца на адрас БТРК: 220087, Мінск, Макаёнка, 9, з паметкай «На конкурс «Песня для Еўрабачання».

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

Увага — пары бензіну!

Прычынай надзвычайнага здарэння ў шматкватэрным доме ў Гомелі сталі пары бензіну, паведамілі ў прэс-службе Гомельскага абласнога ўпраўлення па надзвычайных сітуацыях.

У панядзелак у адной з кватэр шматпавярховага дома ў Гомелі адбыўся ўзрыўны ўдар, у выніку якога пацярпеў 39-гадовы гаспадар жылля. Выкарыстоўваючы шліфмашынку, ён разразаў камунікацыйную трубу санвузла. Іскра ад інструмента трапіла на прамочанае бензінам рыззё, што знаходзілася ў пакоі. Узрыўную сілу гэтаму надалі пары гаручай вадкасці, якія сканцэнтраваліся ў невялікім памяшканні.

У выніку здарэння мужчына атрымаў апёкі. Узрыўной хваляй выбіла шкло ў кватэры пацярпелага.

Алена САФРОНАВА, БЕЛТА.

Хто каго?

БАРС КІРУЕ НА ПАМЕЖЖА — «ПЕРАКРЫЦЬ» НАРКОТЫКІ...

Што было, было. У адным гарадскім двары дварторэ'еры сабраліся — худыя, бяздомныя, бедныя. Бачаць — з пад'езда коллі выводзяць. Ці не на выставу? Бо ўжо ж бела-рыжую, чысцюткую, гладкую, грудзі ўсе у медалях...

— Прыгажуня, канешне, — цяжанька ўздыхнуўшы, прызналі дварнякі. — Але ж дурніца дурніцай.

Чаму? Ды, відаць, заканамерна — жывучы, як у бога за пазухай, тупець пачынаеш.

І гэта — проста не маглі не заўважыць нашы чытачы. У вогуле. І ў прыватнасці — мінчане Астроўскія:

На сабак сягодня мода,
Апранаюць іх, стрыгуць, —
Гэта «выхадцы з народа»
Так свой імідж падаюць.

Што цікава — не замежныя «выхадцы»:

З лепшым сябрам у абдымку
***Наша** баба тут на здымку,*
Беларуска... Мусіць, з «новых»?
Бо ў сабакі — усе абновы, —

прыкмячае гэта сп. Гарбачоў з в. Сінягорская Сенненскага раёна. Тое ж, прыкладна, і сп. Чыгрынава з Вілейшчыны:

Во як мы разбагацелі —
Сучкі ўжо пайшлі ў мадэлі.
А прычоскі, а ўборы...
Хоць сабе здзяры ў каторай.

Але ж не спяшайцеся «здзіраць», а тым больш зайздросціць (як самім гэтым «мадэлям», так і іх гаспадыням). Сп. Гаўрыш з в. Навасёлкі Пастаўскага раёна лічыць, што ўсё гэта — не ад добрага жыцця, як кажуць:

Ёсць свой доктар, куцюр'е,
Фітнэс, аэробіка,
А для шчасця — не стае
Ў доме... Хоць бы Бобіка.

«Прачытаў я гэтыя радкі жонцы, — ужо прозаю дадае Валерый Мікалаевіч, — і нарваўся на сур'ёзную крытыку. Прызнала яна, што зараз стаўку на звычайнага дварняка ўжо ніхто не робіць. Іншыя мэты:

Так гатовы й год стаяць,
Каб... хоць як захамутаць
Таго чалавека,
Што прыводзіць пагуляць
Ратвейлера Джэка»

Дзе ратвейлер, там, трэба разумець, і Ракфелер? Дзе багацце, там... Як мяркуе сп. Гудачкова з Жыткавічаў, шчасця можа і не быць, бо:

Хоць пастрыглі, надушылі,
Майку модную пашылі.
Але ўсё ж зняволена,
Бедная жывёліна.
...Што ж, жыццё — не чарадзей —
Шмат такога і ў людзей.

Яны і насамрэч — таксама выбіраюць... Сп. Дубовік з в. Арэшкавічы Бярэзінскага раёна нават ведае, што часцей:

Ну, нашто тая свабода?
На яе цяпер не мода.
Лепш — (з бяздомных валацуг)
«Педзігры»... І хай ланцуг.

Але ж пры гэтым далёка не ўсе кіруюцца, так бы мовіць, страўнікам ды цвярозым разлікам — маюць месца пачуцці. Ды такія...

Пішу словы... І прызнацца,
Аж дрыжыць мая рука:
Мне б, хаця мінут на 20,
Ды на месца шчанюка, —

прызнаецца сп. Федарака са Скідаля.

Што ж, месца і насамрэч, камфортнае — утульнае, цёплае, мяккае. А сабачка (вы заўважылі?) морду верне. Чаму?

Як сабакі, так і людзі
(Ну, мужчыны — смаркачы):
Ім пакажа баба грудзі,
Дык наровяць уцячы.

Што казаць? Здараецца... Але ж, па меркаванню Алены Пажога з в. Абруб Глыбоцкага раёна, гэта не пра нашых мужчын. І не пра нашага сабаку. Наш, са здымка —

Верны сябар пад рукою
Бабе сэрца супакоіў:
Ад самоты беражэ
І кішэню сцеражэ.

Гэта — трэба. Гэта, можна сказаць, нават святое. Па сённяшнім часе. Як і не менш адказнае:

Сцюжа, шэрань, ветрык свежы...
Ім не да экзотыкі:
Барс кіруе на памежжа
«Перакрыць» наркотыкі, —

мяркуе пра «салодкую парачку» сп. Гарбачоў. А калі «перакрые» ці пойдзе на заслужаны адпачынак, можна новы занятак знайсці. І таксама патрэбны:

Была служба ў Тумана —
Палавіў ён наркаманаў...
А цяпер цікуе тут,
Хто ды з кім пайшоў у блуд.

Гэта (згадзіцеся са сп. Чыгрынавай) часам таксама трэба. А вось чаго вельмі добра было б пазбегнуць (прычым кожнай сямейцы), дык гэта скандалаў і ўзаемных абраз:

Як сабака брэша жонка:
«Кабяліна... Яшчэ й той!..»
Ну, хіба даб'ешся толку
У сямейцы вось такой?

З таго ж канверта і сумнае ці то пытанне-меркаванне, ці то папярэджанне:

Дэмаграфічных выбухаў
не будзе:
Сабак жа болей
любяць людзі?

А наогул...

Глядзіць брат
меншы, разважае,
Што людства,
мусіць, з глузду
едзе:
Сабакам грыўкі
пастрыгае
І тое п'е, што ў
рот не лезе...

Зрэшты, гэта ўжо (з падачы гамяльчаніна Мікалая Старых) зусім іншая тэма. У завяршэнне зададзенай пагодзімся: у тым, што браты нашы меншыя зараз у пашане, дрэннага нічога няма... Помнілі б людзі і пра блізніх сваіх.

Засталося апошняе — назваць прозвішчы тых, хто склаў найлепшыя радкі пра мужыкоў, што ляжалі пад машынай (помніце здымак?). Паводле меркавання вялікага чытацкага журы, гэта сп. Дубовік з Бярэзіншчыны, сп. Дзмітрава з Гомеля, сп. Ульянава з Нясвіжа і сп. Вінаградаў з Бабруйска. Яго чатырохрадкоўе

«Як машына стане колам: ні ўперад, ні назад — вы не поўзайце наўкола, а каленам ёй... пад зад!»

набрала столькі ачкоў, што маленькаму рэдакцыйнаму журы нічога не заставалася, як пагадзіцца і чарговы прыз у выглядзе бясплатнай падпіскі на дарагую сэрцам газету «Звязда» накіраваць у Бабруйск.

Усім астатнім у якасці суцяшальнага... новы здымак. А значыць і новы шанц — паказаць сябе, пасмяшыць другіх. І, магчыма, выйграць — у конкурсе на лепшы подпіс да здымка.

Валянціна ДОЎНАР.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Інфарм-укол

ГЭТЫ КАШТОЎНЫ ІМУНІТЭТ



Імунітэт — адна з формаў абароны арганізма ад рэчываў і арганізмаў, якія валодаюць генетычнай чужароднасцю, гэта комплексная рэакцыя арганізма, скіраваная на яго абарону ад бактэрый, таксінаў, вірусаў, паразітаў, донарскіх тканак, зменených уласных клетак, напрыклад, ракавых.

Як толькі антыгены трапляюць у арганізм, у адказ вылучаюцца антыцелы, якія нейтралізуюць актыўнасць тых жа вірусаў, бактэрый і разбураюць іх. Арганізм абараняюць таксама інтэрферoны — асаблівыя бялкі, якія аберагаюць яго ад вірусаў. У цэлым імунітэт забяспечваецца комплексам абарончых рэакцый, дзякуючы якім падтрымліваецца пастаянства ўнутранага асяроддзя арганізма. Адрозніваюць два віды імунітэту — прыроджаны і набыты. Апошні бывае актыўным і пасіўным. Пасіўны ўзнікае, напрыклад, у плода, які атрымлівае антыцелы ад маці праз плацэнту. Але гэты імунітэт доўга не захоўваецца. Актыўны набываецца ў выніку перанесенага захворвання ці шляхам вакцынацыі.

Як правіла, пасля 35—40 гадоў адбываецца згасанне функцыі вілачкавай залозы, і да 60—70 гадоў узроставая недастатковасць імунітэту праяўляецца практычна ва ўсіх. Павышаецца ўспрымальнасць да інфекцый, з'яўляецца схільнасць да хранічнага працякання захворванняў, якія часцей за ўсё прыводзяць да ўскладненняў, у многіх сустракаецца павышаная адчувальнасць да лекаў, а вось эфектыўнасць прышчэпак зніжаецца. Але таксама існуюць і прыроджаныя перадумовы зніжэння імунітэту, звязаныя з генетычнымі расстройствамі. Да таго ж, імунітэт можа быць зніжаны пры траўмах, апёках, пераахалоджаннях, кровастратах, галаданні, розных інтаксікацыях, прастудных і хранічных захворваннях, у тым ліку пры цукровым дыябеце і іншых. Акрамя таго, крытычныя станы зніжэння імунітэту ўзнікаюць у перыяд росту дзіцяці. Такіх перыядаў пяць: першыя 29 дзён жыцця, 3—6 месяцаў, 2-гі год жыцця, 4—6-ы гады, падлеткавы перыяд.

Займацца карэкцыяй імунітэту неабходна ў любым узросце. Таму акрамя прыродных сродкаў для павышэня імунітэту (імунакарэктараў і імунамадулятараў), неабходна выкарыстоўваць і сінтэзаваныя. Многае, канешне, залежыць ад нашага ладу жыцця — наколькі правільна і паўнацэнна мы харчуемся, ці займаемся спортам, ці дастаткова часу праводзім на свежым паветры. Але, тым не менш, і гэтага мала. Неабходна выкарыстоўваць у поўным аб'ёме тое, што стварыла прырода і вучоныя, урачы-імунолагі.

Тэст «Праверце свой імунітэт»

1. Вы рэгулярна займаецеся спортам?
2. У халоднае надвор'е хутка замярзаеце? У вас пастаянна халодныя ногі і рукі?
3. Вы ўмееце хутка перажываць стрэс і любую вольную хвіліну выкарыстоўваеце для паўнацэннага адпачынку?
4. Прастуджаецеся часцей за 4 разы ў год?
5. Любое недамаганне спрабуеце пераадолець толькі з дапамогай лекаў?
6. У вашым рацыёне шмат агародніны і садавіны, зімой і вясной вы абавязкова прымаеце вітаміны?
7. Вы — кантактны чалавек. У вас шмат сяброў?
8. Шчаслівыя ў каханні і задаволеныя сямейным жыццём?
9. Любіце свежае паветра і шмат гуляеце?
10. Курыце?
11. Час ад часу ўжываеце добрае віно?
12. Жывяце ў горадзе?
13. Сочыце за сваёй фігурай?
14. Часта карыстаецеся грамадскім транспартам?
15. Працуеце ў вялікім калектыве?
16. Ужываеце досыць многа вады і чаю (каля 1,5 л у дзень)?
17. Шмат часу праводзіце ў цёплым памяшканні?
18. У вас цяжкая адказная работа, на вас ускладзены яшчэ і хатнія справы?
19. Рэгулярна ходзіце ў лазню ці саўну?

Калі на пытанні 1, 3, 6, 7, 8, 9, 11, 13, 16 **вы адказалі «так»**, запішыце сабе па балу за кожны. Калі на пытанні 2, 4, 5, 10, 12, 14, 15, 17, 18, 19 **вы адказалі «не»**, таксама запішыце сабе па балу.

Ад 1 да 6 балаў — ваш імунітэт практычна на нулі. Адсюль частыя недамаганні і апатыя. Неабходна кансультацыя ў спецыяліста-імунолага. Без яго дапамогі імунітэт не аднавіць.

Ад 7 да 12 балаў — у абарончай сістэме вашага арганізма ёсць брэшы. Змяніце лад жыцця і харчавання, пачынайце раніцу з кантрастнага душа, павялічце колькасць вітамінаў.

Ад 13 да 18 — у вас моцная імунная сістэма, падтрымлівайце яе ў тым жа стане.

Танцы

На паркеце кружыла «чайка»

Упершыню чэмпіянат Беларусі па спартыўных танцах прайшоў на самай прэстыжнай пляцоўцы краіны — у сталічным Палацы спорту, ды яшчэ пры абслугоўванні суддзяў міжнароднага ўзроўню. Арганізаваць спаборніцтвы на такім высокім узроўні ўдалося дзякуючы старшыні беларускай федэрацыі танцавальнага спорту Таццяне Бандарчук. Статус турніру павысіў удзел у паказальных выступленнях шасціразовых пераможцаў першынства Еўропы і пяціразовых чэмпіёнаў свету па фармэйшн (турнір сярод групавых калектываў) у лацінаамерыканскай праграме — літоўскага калектыву «Жуведра» (перакладаецца як «чайка»). Пары дэманстравалі не толькі сваё танцавальнае майстэрства, але і сваралі на паркеце розныя геаметрычныя малюнкі.

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

— Нам удалося запрасіць «Жуведру» пры дапамозе ААБ «Беларусбанк», які аплаціў усе выдаткі, — растлумачыла Таццяна Бандарчук. — А наогул мы плануем і надалей арганізоўваць паказальныя выступленні вядомых танцораў у рамках акцыі «Усе зоркі свету па спартыўных танцах у гасцях у Беларусі!

На жаль, на гэты раз не ўдалося наладзіць трансляцыю чэмпіянату, але Таццяна Бандарчук упэўненая, што хутка беларускія каналы будуць змагацца за права паказваць лаціну і стандарт:

— Гэта ж самы прыгожы від спорту, — заявіла старшыня БФТС. — У некаторых краінах вялікія грошы плацяць, каб трансліраваць гэтае шоу. Спадзяюся, спартыўныя танцы будуць вельмі папулярнымі і ў нас.

Нягледзячы на высокі кошт вячэрняга аддзялення (100 тысяч беларускіх рублёў), трыбуны былі запоўненыя амаль цалкам. Паглядзець было на што: чароўны вальс, страснае танга, запальная самба, рамантычная румба, завадны джайв...

Вынікі першага этапа: у групе «Юніёры-1» выйгралі Іван Казакевіч і Настасся Грыгарэнка з мінскага клуба «Піруэт» (змагаліся ў стандарце). Сярод «Юніёраў-2» перамаглі Дзмітрый Пілецкі і Віта Паршына, якія прадстаўлялі ў стандарце віцебскі клуб «Мерэнга». Сярод моладзі мацнейшай парай у дзесяці танцах стаў дуэт Андрэй Кіцун і Юлія Крэпчук з мінскага клуба «Танга». У спаборніцтве дарослых не было роўных Дзмітрыю Нікалаеву і Юліі Жылко, якія танцавалі лаціну.

Ірына ПРЫМАК.

Птушка года

26 сакавіка 2007 года Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь уводзіць у паштовае абарачэнне марку «Усходні салавей» з серыі «Птушка года», падрыхтаваную выдавецкім цэнтрам «Марка» РУП «Белпошта». Марка падрыхтавана пры садзейнічанні арганізацыі «Ахова птушак Бацькаўшчыны». Мастак спецштэмпеля і канверта «Першы дзень» А. Міцянін.

У дзень выхаду маркі ў абарачэнне на Мінскім паштамце будзе праводзіцца спецыяльнае гашэнне на канверце «Першы дзень».

Крымінал

Падазронага знайшоў сабака

Каля паловы другой дня ў міліцыю паступіла паведамленне, што непадалёк ад в. Неманіца Барысаўскага раёна невядомы спрабаваў згвалтаваць дзяўчыну — сацработніка тэрытарыяльнага цэнтра абслугоўвання. Нарад Барысаўскага аддзела аховы, які прыбыў са службова-пошукавым сабакам Джэсі, а таксама супрацоўнікі мясцовага РАУС апыталі збітую пацярпелую, сведак і ўдакладнілі прыкметы падазронага. Непадалёк была знойдзена спяцоўка з надпісам «ДЭУ-69». Прыкладна 200 м Джэсі вяла міліцыянераў па следзе ў лясным гушчары. У хуткім часе быў заўважаны мужчына, які ўцякаў. Дагнаўшы і затрымаўшы, як пасля высветлілася, работніка мясцовага ДЭУ, міліцыянеры даставілі п'янага падазронага да пацярпелай, якая апазнала злачынцу.

Аляксандр ЧАРНЯЎСКІ.

Бухгалтерский баланс ЗАСО «ГАРАНТИЯ» г. Мозырь за 2006 год

247760 г. Мозырь, ул. Советская, 120 (млн. руб.)

АКТИВ		ПАССИВ	
1	2	3	4
Основные средства	**426,8**	**Источники собственных средств, всего**	**1118,5**
Нематериальные активы	**54,0**	в том числе: уставный фонд	475,3
Финансовые вложения, всего	**411,9**	резервный фонд	6,0
в том числе: инвестиции в дочерние общества	-	добавочный фонд	363,0
инвестиции в другие организации	114,9	фонд накопления	236,9
облигации и другие долговые обязательства	265,8	фонд потребления	0,5
прочие финансовые вложения	31,2	целевое финансирование	-
Доля перестраховщиков в страховых резервах	**123,9**	нераспределенная прибыль прошлых лет	36,6
Дебиторы, всего	**27,3**	нераспределенная прибыль отчетного года	0,2
в том числе: дебиторская задолженность по операциям страхования, сострахования и перестрахования	-	**Страховые резервы и фонды, всего**	**825,0**
		в том числе: страховые резервы	806,5
депо премий по рискам, принятым в перестрахование	-	фонд предупредительных (превентивных) мероприятий	18,5
дебиторская задолженность (кроме операций страхования, сострахования и перестрахования)	27,3	гарантийные фонды	-
Прочие активы, всего	**1158,0**	**Кредиторы, всего**	**29,2**
в том числе: незавершенное строительство	5,2	в том числе: кредиторская задолженность по операциям страхования, сострахования	-
материальные ценности и затраты	18,1	кредиторская задолженность по операциям перестрахования	-
денежные средства	1134,7	депо премий по рискам, переданным в перестрахование	-
собственные акции (доли)	-	заемные средства	-
прочие активы	-	кредиторская задолженность (кроме операций страхования, сострахования, перестрахования)	29,2
Непокрытые убытки прошлых лет	-	**Прочие пассивы**	**229,2**
Непокрытые убытки отчетн. года	-		
БАЛАНС	**2201,9**	**БАЛАНС**	**2201,9**

Достоверность баланса подтверждена независимой аудиторской фирмой ОДО «Эконом Аудит» г. Минск, лицензия на осуществление аудиторской деятельности АД № 02200/0061175 выдана Министерством финансов РБ 12 марта 2004 г.

Отчет о финансовых результатах ЗАСО «ГАРАНТИЯ» г. Мозырь за 2006 год

(млн. руб.)

Наименование показателя	Код строки	За отчетный период
I. Страхование жизни		
Страховые взносы (премии)	010	-
Страховые выплаты	020	-
Изменение резерва по страхованию жизни (+ или -)	030	-
Отчисления в гарантийный фонд	040	-
Расходы на ведение дела	041	-
Результат от операций по страхованию жизни (+ или -)	050	-
II. Страхование иное, чем страхование жизни		
Страховые взносы (премии) — нетто перестрахование	064	560,9
Изменение резерва незаработанной премии — нетто перестрахование (+ или -)	067	101,5
Оплаченные убытки (страховые выплаты) — нетто перестрахование	082	238,2
Изменение резервов убытков — нетто перестрахование (+ или -)	092	46,0
Изменение других технических резервов (+ или -)	100	-
Изменение иных страховых резервов (+ или -)	105	-
Отчисления в фонд предупредительных (превентивных) мероприятий и гарантийные фонды	110	9,4
Расходы на ведение дела	120	131,5
Комиссионное вознаграждение и тантьемы по рискам, переданным в перестрахование	121	4,6
Комиссионное вознаграждение и тантьемы по рискам, принятым в перестрахование	122	49,5
Результат от операций по видам страхования иным, чем страхование жизни (+ или -)	130	284,4
III. Прочие доходы и расходы, не отнесенные в разделы I и II		
Операционные доходы	140	186,2
Операционные расходы	145	60,1
Внереализационные доходы	150	94,6
Внереализационные расходы	155	11,6
Финансовый результат	157	493,5
Использовано прибыли	158	493,3
Нераспределенная прибыль (убытки) отчетного периода (+ или -)	170	0,2

По нашему мнению бухгалтерская (финансовая) отчетность ЗАСО «Гарантия» отражает достоверно во всех существенных отношениях его финансовое положение на 1 января 2007 г. и результаты финансово-хозяйственной деятельности за 2006 год.

Сёння

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	6.11	18.24	12.13
Віцебск —	6.00	18.14	12.14
Магілёў —	6.01	18.14	12.13
Гомель —	5.58	18.10	12.12
Гродна —	6.26	18.39	12.13
Брэст —	6.27	18.39	12.12

Месяц

Апошняя квадра 19 сакавіка.
Месяц у сузор'і Цяльца.

Імяніны

Пр. *Апанаса, Арсенія, Лазара;*
К. *Бенядзікта, Любаміра, Мікалая.*

Надвор'е на заўтра

…у суседзяў

ВАРШАВА	+3 — +5 °C	МАСКВА	+13 — +15 °C, без ападкаў
ВІЛЬНЮС	+9 — +11 °C	РЫГА	+13 — +15 °C, без ападкаў
КІЕЎ	+12 — +14 °C	С-ПЕЦЯРБУРГ	+11 — +13 °C, без ападкаў

21 сакавіка

Дзве даты

1277 год — паход аб'яднаных сіл мангола-татар і падуладных ім паўднёварускіх князёў на Гродзенскае княства і Навагрудак. Войска вялікага князя ВКЛ Тройдзеня разбіла гэтыя сілы ў бітве пад Гроднам.

1547 год — нарадзіўся Мацей Стрыйкоўскі, гісторык і паэт. Працяглы час жыў у Беларусі і ў Літве. У 1574 годзе напісаў паэму «Ганец цнатліваści...», у якой у вершаванай форме выклаў кароткую гісторыю Польшчы і ВКЛ. Аўтар шырока вядомага твора «Хроніка польская, літоўская, жамойцкая і ўсяе Русі» (1582) — першай друкаванай гісторыі ВКЛ. І па сённяшні гэты твор з'яўляецца, бадай, самым каштоўным дакументам па гісторыі славянскіх народаў, у якім скарыстаны беларуска-літоўскія летапісы і хронікі.

Цытата дня:

«Дружба часта заканчваецца каханнем, але каханне рэдка заканчваецца дружбай».

Чарльз Колтан (1780—1832), англійскі літаратар.

Усміхнёмся!

У Расіі пачалі выпускаць грузавы варыянт «Аксі». Зараз у супермаркеце можна будзе не браць вазок.

☺

Сядзіць муж у Інтэрнэце. Раптам чуе прыглушаны голас жонкі:

— Не, мілы, сёння не магу, давай сустрэнемся заўтра.

Муж адразу ж улятае ў калідор і раз'юшана:

— Ты зараз па тэлефоне размаўляла?!

— Не. Я чытала ўслых жаночы часопіс. Артыкул цікавы, у ім 50 фраз, якія трэба гучна гаварыць услых, кшталту: «Дарагі, выкінь, калі ласка, смецце», «калі ты, нарэшце, прыб'еш карніз»? І тут жа пішуць, што заняты сваёй справай муж пачуе толькі сказаную паўшэптам пяцьдзесят першую. І бач ты, не хлусяць.

☺

Калі лечышся па даведніку, дык рызыкуеш памерці ад памылкі друку.

☺

— Мама, а чаму мы машыну ў рэчку піхаем?

— Цішэй, тату разбудзіш!

Знікла насенне

Больш як на 14 мільёнаў нанёс урон гаспадарцы невядомы злодзей, які пабываў у засеках яе склада.

Здарэнне адбылося ў вёсцы Пастовічы, што ў Старадарожскім раёне. Паводле даных аддзела інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Мінаблвыканкама, нехта пранік у неахоўваемы склад сельгасвытворчага кааператыва «Пастовічы»: сарваўшы навясны замок злачынца выкраў 1 тону 870 кілаграмаў насення травасумесі «Цімафееўка» і знік. Узбуджана крымінальная справа.

Ігар ГРЫШЫН.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, А. МЯСНІКОЎ, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай — 287-19-19; аддзелаў: пісьмаў — 287-18-64, падпіскі і распаўсюджвання — 287-18-51, юрыдычнага — 287-19-68, сакратарыята — 292-05-82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292-44-12; «Мясцовае самакіраванне» — 292-21-03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20-37-98, Віцебску: 24-31-92, Гродне: 43-25-29, Гомелі: 74-13-92, Баранавічах: 7-26-02, Магілёве: 32-74-31; бухгалтэрыі: 292-22-03; даведкі па рэкламе і аб'явах тэл./факс: 287-17-79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292-04-52.

html: www.zvyazda.minsk.by E-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з аўтарамі. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 37.095. Індэкс 63850. Зак. № 1563. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12